Тут маем рэдкі выпадак, у якім сваяцтва ўказана. У канюшага троцкага Івана Валовіча дакладна вядома адна жонка, у крыніцах яна згадваецца як Філея. Пелагія, пэўна, яе царкоўнае імя. Вядома, што Філея памерла ў 1570–1571. Гэтая акалічнасць дазволіла прыблізна датаваць запіс, зразумець, хто мог быць хадайнікам для спаміну, і амаль расшыфраваць змест. Такім чынам, мяркуем. Цімафей – старэйшы брат Фёдара (Ходкі), Фёдар – бацька Грынькі (Грыгорыя) Ходкавіча. Фёкла – жонка Фёдара. Марына-Руфа – 1-я жонка Грынькі Ходкавіча (пакуль была невядома). Адпаведна другая Марына – гэта Мялешкаўна (павінна была быць запісана перад Паўлам), 1-я жонка Івана Іванавіча Валовіча, маршалка гаспадарскага (сын Івана і Філеі), і далей дзеці апошніх. Тут трэба дадаць, што Іван Іванавіч (яго ў запісе чамусьці няма, верагодна, забыліся ці прапусцілі) меў дзвюх жонак, першай была Мялешкаўна, другой – Ганна Капцёўна. Адпаведна лічыцца, што з першай жонкі быў сын Яраш ці Геранім, а астатнія - з Капцёўны. Чарговасці ў запісе дзяцей не назіраецца. Называем іх з дадатковымі звесткамі. Павел, староста гродзенскі (†1630), Ермалай – гэта Яраш ці Геранім, пісар ВКЛ, староста жамойцкі (†1643), біскуп Андрэй – гэта Еўстахі, біскуп віленскі (†1630), Андрэй, харужы земскі ВКЛ (†1614). Паколькі з усіх сыноў Івана Іванавіча пазней усіх памёр Яраш (адзіны сын Івана Іванавіча і Мялешкаўны), то, мяркуем, што запіс быў зроблены Ярашам перад смерцю ці яго ўпаўнаважанымі ўжо пасля.

Другі запіс падобны. Гэта Жыровіцкі памяннік (копія пачатку XVIII ст.), у якім ёсць наступны тэкст: "*Род пана Воловича, старосты Куиявского. Помяни господи Григория, Марину, Луку, Порфирия, Игнатия, Романа*" [3, с. 135]. Вядомы два Грыгорыя Валовічы: Грыгоры Грынькавіч, кашталян навагрудскі, і Грыгоры Багданавіч, ваявода смаленскі. Відавочна, што тут запісаны род Грыгорыя Багданавіча Валовіча, ваяводы смаленскага. Бо, 1) "староста куяўскі" – гэта перакручанае "староста каняўскі", ім быў Грыгоры Багданавіч, 2) запісаны апошнім Раман адназначна ідэнтыфікуецца як Раман, сын Грыгорыя Багданавіча, Валовіч, староста рагачоўскі, ён памёр пасля 1620. Лічыцца, што ў Грыгорыя былі дзве жонкі: 1-я – пакуль невядома, 2-я – Кацярына Юрлаўна. Мяркуем, што за Грыгорыем запісана яго першая жонка і дзеці ад яе, г.зн. Раман дакладна быў сынам ад першай жонкі. Лукаш, Парфіры і Ігнат, верагодна, браты Рамана, якія памерлі раней. Па нашых доследах, раней Рамана

памерлі Грыгоры (зг. 1564), Ян (†1571), Юзаф (†1583) і Мікалай (†1592). З іх першыя тры, мяркуем, і згаданы ў памянніку з царкоўнымі праваслаўнымі імёнамі. Мікалай, хутчэй за ўсё, быў сынам Грыгорыя ад Юрлаўны. Ёсць, канешне, варыянт, што гэтых дзяцей мы навогул не ведаем, але ўсё адно яны павінны быць братамі Рамана. Запіс маглі зрабіць: сам Раман перад смерцю, яго 2-я жонка Галена Сапяжанка, брат Пётр (†1624) і г.д.

Якія ж высновы можна падвесці пра памяннікі (сінодзікі). Звесткі ў іх дастаткова дакладныя, лепш сказаць, верагодныя, але паколькі сваяцтва звычайна не пазначана, таму яго трэба разгадаць і пацвердзіць іншымі незалежнымі крыніцамі. Выкарыстанне звестак з памянніка карысна больш пасля рэканструкцыі радавода на падставе іншых крыніц. Пачынаць лепш з ідэнтыфікацыі асобы, якая магла зрабіць запіс, і ўстанаўлення прыблізнай даты запіса. Гэтай асобай мог быць сам чалавек, які зрабіў уклад перад смерцю, яго жонка, дзеці, родзічы ці іншыя упаўнаважаныя асобы (духоўнік і г.д.). Адпаведна дата запіса не можа быць раней, чым год смерці апошняга (пазнейшага) з зафіксаваных у запісе.

Трэба памятаць, што ў памянніку можа быць прадстаўлена непоўная генеалагічная лінія (часта толькі па прамой лініі). Некаторыя асобы маглі быць не родзічамі ці сваякамі, а, прыкладам, духоўнікамі, слугамі і г.д. Асобныя імёны па радаводу маглі быць перастаўлены (знаходзіцца не на сваім месцы) ці прапушчаны, як бачылі на прыкладзе памянніка Івана Іванавіча Валовіча. Магчыма, сам укладальнік назваў лінію ў такім парадку, гэта ж тычыцца і яе паўнаты. Магчыма, нешта згубілі ці перайначылі пры перапісванні тэкста (складанні копіі). Назіраецца розніца паміж свецкімі і царкоўнымі імёнамі (Філея=Пелагея). Варыяцыі імён сустракаюцца і пры змене веравызнання, напрыклад, з праваслаўнага на каталіцкае, што ў ВКЛ было даволі распаўсюджана.


1. Субботник или поминник С. монастыря // Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной России. Вильна, 1870, т. IX. – С. 454–459.
2. Голубев, С.Т. Древний помянник Киево-Печерской лавры (конца XV и начала XVI ст.) / С.Т.Голубев // Чтения в Историческом обществе Нестора-летописца. 1892. Кн. 6. – Отд. III.
3. Гильтебрандт, П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки / П. Гильтебрандт. Вильна, 1871. Вып. 1. – С. 51–54.
4. Варонін, В. Друцкія князі XIV стагоддзя / В. Варонін // Беларускі гістарычны агляд. Т. 9. Сш. 1-2 (16–17). – Менск, 2002. – С. 3–30.
5. Кузьмин, А.В. Опыт комментария к актам Полоцкой земли второй половины XIII – начала XV в. / А.В. Кузьмин // Древняя Русь. Вопросы медиевистики. – Москва, 2007. – № 2 (28). – С. 50–68.
6. Скепьян, А. Родовая и историческая память в роду князей Олельковичей-Слуцких / А. Скепьян // Генеалогія. Зб. наукових праць. Вип.1. – К.: Простір, 2013. – С. 239–254.
7. Рыбчонак, С. Граф Канстанцін Ажароўскі (1823–1893), знаўца генеалогіі ВКЛ, у святле архіўных фактаў / С.Рыбчонак // Беларусь, Расія, Украіна: дыялог народаў і культур / скл.: Д.У. Караў, В.В. Масненка. (Серыя “Гістарыяграфічныя даследаванні”). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. – С. 78–87.
8. Сліж, Н. Гісторыя роду Валовічаў на Гарадзеншчыне ў XV–XVII стст. / Н. Сліж // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні. XV–XX стст. / пад. рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 133–186.



**Жарын Д.В.**


## ГАНЗЕЙСКАЯ КАНТОРА Ў КОЎНЕ XV СТАГОДДЗЯ: АПУБЛІКАВАНЫЯ КРЫНІЦЫ “ГАНЗЕЙСКАЙ АКТАВАЙ КНІГІ”

Гісторыя Ганзы, росквіт і дабрабыт яе гарадоў карэнным чынам звязаны з дзейнасцю на ўсходзе Еўропы. У сярэднія вякі ганзейскія купцы накіроўваліся ў землі Вялікага Княства Літоўскага, дзе мелі гандлёвыя стасункі з такімі гарадамі, як Полацк, Віцебск, Смаленск, Гродна, Брэст, Трокі, Коўна і Вільня. Відавочна, нямецкія купцы

наведваліся і ў іншыя гарады Вялікага Княства Літоўскага. Ганзейскія канторы (замежныя пасяленні ганзейскіх купцоў) знаходзіліся не толькі ў вядомых нам Лондане, Бергене, Вялікім Ноўгарадзе, Бругэ, але і ў такіх гарадах Вялікага Княства Літоўскага, як Полацк і Коўна. Не ў апошнюю чаргу праз ганзейскі гандаль Вялікае Княства Літоўскае далучылася да гандлёва-эканамічных і дыпламатычных працэсаў тагачаснай Еўропы.

Ганзейскія купцы для ажыццяўлення гандлю з гарадамі Вялікага Княства Літоўскага карысталіся воднымі і сухапутнымі шляхамі зносін. Раней за ўсё яны пачалі выкарыстоўваць водны шлях па рацэ Заходняя Дзвіна (канец XII – пачатак XIII стст.). Гэты водны шлях быў звязаны ў першую чаргу з Полацкам, Віцебскам і Смаленскам. Іншы водны шлях, так званы "Нёманскі гандлёвы шлях", пачаў інтэнсіўна выкарыстоўвацца нямецкімі купцамі з канца XIV стагоддзя. Галоўным цэнтрам ганзейскіх купцоў на Нёманскім гандлёвым шляху з'яўляўся горад Коўна [1, с. 97]. Праз гэты горад тавары з зямель Вялікага Княства Літоўскага ішлі ў Кёнігсберг, Мэмель (Клайпеду) і Данцыг (Гданьск), а адтуль ужо траплялі на заходнія рынкі. У адваротным кірунку ганзейскія купцы пастаўлялі тавары з Паўночнай і Заходняй Еўропы. Ганзейская кантора ў Коўне была адчынена для ўсіх ганзейскіх купцоў, але лідарства ў ёй належала гораду Данцыгу. Калі разглядаць крыніцы, можна пераканацца, што інстытуцыянальна кантора Ганзы ў Коўне праіснавала з 1441 па 1532 гады. Аднак з гандлёвымі мэтамі ганзейскія купцы, а перадусім купцы з прускіх гарадоў, карысталіся водным шляхам па Нёмане яшчэ з часоў Вітаўта.

Безумоўна, карціна ганзейскай гісторыі на ўсходзе Еўропы з'яўлялася б няпоўнай без даследавання крыніц пра ўзнікненне і развіццё ганзейскай канторы ў Коўне. Асноўныя апублікаваныя крыніцы пра дзейнасць ковенскай канторы Ганзы знаходзяцца ў так званай "Ганзейскай актавай кнізе" [2]. У гэтым шматтомным выданні знаходзяцца дакументы, што тычацца дзейнасці канторы, але яны размешчаныя ў розных тамах выдання. Прадметнай сістэматызацыі крыніц у выданні не назіраецца, але, што вельмі важна, крыніцы там размешчаныя ў адпаведнасці з храналагічным прынцыпам. Непасрэдна перад друкаваным тэкстам крыніцы даецца спасылка на тое, дзе захоўваецца яе арыгінал. У асноўным арыгіналы крыніц па гісторыі ганзейскай канторы ў Коўне захоўваюцца ў архівах Данцыга і Кёнігсберга. Надрукаваныя ў выданні дакументы ілюструюць дзейнасць ковенскай канторы Ганзы з сярэдзіны XV стагоддзя.

Па першапачатковым этапе дзейнасці канторы дакументы можна адшукаць у кнізе нямецкага даследчыка Тэадора Хірша "Гісторыя гандлю і рамяства Данцыга пад уладай Нямецкага Ордэна" [3]. У дадатку VII да старонкі 169 сваёй кнігі Хірш апублікаваў "акты па гісторыі літоўскага гандлю" [3, S. 280–282]. Тут ён прапанаваў чытачам усяго тры крыніцы пад нумарацыяй лацінскімі літарамі a, b, c. Але малая колькасць надрукаваных крыніц кампенсуецца іх значнасцю для даследчыкаў гандлёвых зносін Ганзы і Вялікага Княства Літоўскага. Усе гэтыя крыніцы напісаныя на сярэдненіжненямецкай мове. Першая крыніца тычыцца пачаткаў афармленай дзейнасці немцаў у Коўне і ўяўляе сабой прывілей вялікага князя Казіміра на розныя свабоды, нададзенныя прускім купцам у гэтым горадзе. Прывілей быў выдадзены 22 студзеня 1441 года ў Вільні. Нагода выдання гэтага прывілея заключалася ў тым, што немцы, якія гандлявалі ў Коўне, скардзіліся вялікаму князю на парушэнне іх правоў. Казімір загадаў кіраўніцтву і жыхарам горада Коўна не перашкаджаць купцам з Прусіі ў гандлі, не парушаць старых правоў купцоў, але, наадварот, пільнаваць гэтыя правы па старым звычаі, як тое было ў часы Вітаўта. Дадзены прывілей гісторыкі лічаць афіцыйным пачаткам дзейнасці ганзейскай канторы ў Коўне.

Другая крыніца, прыведзеная Хіршам, тычыцца прызначэння для нямецкай канторы ў Коўне кіраўнікоў. Магістрат горада Данцыга 15 лістапада 1448 года на пасаду эльтэрманаў (старэйшын) канторы зацвердзіў двух нямецкіх купцоў Ганса Мэйнрыка і Нікласа Рунава. Гэты крок з'яўляўся вельмі важным з пункта гледжання інстытуалізацыі канторы, надання дзейнасці ганзейскіх купцоў у Коўне арганізаванай формы.

Трэцяя крыніца тычылася ўжо непасрэдна тавараў, якімі Вялікае Княства Літоўскае гандлявала з Ганзай. Гаворка ў прыватнасці ішла пра паведамленне магістрата Данцыга ў горад Кёнігсберг адносна попелу, які ў апошнім горадзе падвяргаўся бракоўцы, гэта значыць праверкі на якасць і расфасоўцы па дробных партыях. Гэта паведамленне было датавана 4 сакавіка 1450 года.

Крыніцы, прыведзеныя Хіршам у вышэйазначанай кнізе, змяшчаюць для даследчыкаў вельмі карысны матэрыял па гісторыі першапачатковага этапу дзейнасці ганзейскай канторы ў Коўне, да сярэдзіны XV стагоддзя. Але больш поўна і змястоўна крыніцы па дзейнасці ковенскай канторы з другой паловы XV стагоддзя прадстаўленыя ў Ганзейскай актавай кнізе.

Крыніцы па гісторыі ковенскай канторы Ганзы можна ўмоўна падзяліць на некалькі тыпаў: скаргі купцоў з абодвух бакоў, правы і прывілеі, дадзеныя ганзейскім купцам з боку вялікіх князёў літоўскіх, гандлёвая перапіска па актуальных справах паміж магістратамі гарадоў Коўна і Данцыга. Крыніцы па дзейнасці ганзейскай канторы ў Коўне другой паловы XV стагоддзя змяшчаюцца ў асноўным у тамах 8, 9, 10, 11 Ганзейскай актавай кнігі. Так, у 8 томе першы дакумент, які тычыцца зносін Вялікага Княства Літоўскага з нямецкімі купцамі, датуецца 1451 годам [4, S. 75, 76, № 104]. Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір адказваў вялікаму магістру на скаргі прускіх купцоў, якія мелі гандаль у Коўне і Вільні, а таксама дамаўляўся наконт узнаўлення перамоў па гандлёвых справах і дзяржаўных межах. Гэты дакумент быў напісаны на лацінскай мове. Астатнія дакументы Ганзейскай актавай кнігі, што непасрэдна тычыліся дзейнасці ганзейскай канторы ў Коўне, былі напісаныя на сярэдненіжненямецкай мове. Напрыклад, скаргі літоўскіх і польскіх купцоў да горада Данцыга на нямецкіх купцоў у Коўне і Вільні, таксама датаваныя 1451 годам, былі напісаныя на гэтай мове. Яны ўтрымлівалі 7 пунктаў абвінавачанняў і патрабаванняў. У гэтым жа годзе быў дадзены падрабязны адказ з боку прускіх купцоў па ўсіх пунктах абвінавачанняў [4, S. 79–81, № 110, 111]. Арыгіналы гэтых дакументаў былі знойдзены ў архіве горада Данцыга, сучаснага польскага горада Гданьска. Далейшыя дакументы 8 тома Ганзейскай актавай кнігі ўтрымліваюць скаргі прускіх купцоў супраць Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Датуюцца гэтыя скаргі 1452 годам. Напрыклад, дакументы паведамляюць, што купцы Вялікага Княства Літоўскага выстаўлялі на продаж няякасны воск, які для большай вагі меў дадатак пяску ці камянёў. Таксама скардзіліся нямецкія купцы на несправядлівыя дзеянні мытнікаў у Коўне [4, S. 124–126, № 166].

Цікавымі для гісторыкаў будуць і дакументы з 9 тома Ганзейскай актавай кнігі [5]. У гэтым томе ўтрымліваюцца не толькі скаргі купцоў з абодвух бакоў, але і гандлёвыя прывілеі. Асаблівую ўвагу даследчыкам трэба звярнуць на прывілей, ці так званы ардананс, які каля 1470 года ганзейскім купцам выдаў вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір. Ардананс Казіміра складаўся з 26 артыкулаў і тычыўся дзейнасці ганзейскай канторы ў Коўне [5, S. 625–628, № 688]. Відавочна, што сам дакумент быў складзены па ініцыятыве магістрата і купцоў горада Данцыга, а Казімір яго ўжо зацвердзіў. Пасля заключэння Другога Торунскага міру 1466 года Данцыг скарыстаўся спрыяльнай знешнепалітычнай сітуацыяй і зрабіў захады для таго, каб узмацніць дзейнасць ганзейскай канторы ў Коўне. Ганзейскія купцы атрымалі пацверджанне з боку Казіміра на права сваёй арганізацыі, права збірання агульнага сходу, права мець старэйшын, а таксама магчымасць збіраць штрафы за парушэнне

статута канторы. Безумоўна, арданнанс не мог абыйсці ўвагай і такія канкрэтныя гандлёвыя справы, як парадак набыцця тавараў (напрыклад, англійскіх тканін), фрахтоўку караблёў, ажыццяўленне пагрузкі-разгрузкі тавараў. Да таго ж усталёўваўся тэрмін знаходжання ганзейскіх купцоў у Коўне не больш за адзін год. Каб падтрымаць парадак і прыстойнасць у канторы, нямецкім купцам забаранялася гуляць на грошы ў азартныя гульні. Увогуле, арданнанс быў даволі падрабязным дакументам, які рэгуляваў дзейнасць ганзейскай канторы ў Коўне.

У 10 томе Ганзейскай актавай кнігі ўжо сустракаюцца скаргі кіраўніцтва канторы на парушэнне ўдзельнікамі яе статута. Так, з крыніц можна даведацца, што ў ліпені 1473 года эльтэрманы канторы скардзіліся на непаслухмянасць і дрэнныя паводзіны ганзейскіх купцоў Паўля Дорэнхайма і Грэгара Мэлемана [6, S. 134, 135, № 231]. Таксама кіраўніцтва канторы скардзілася на тое, што нягледзячы на забарону з боку Ганзы, купцы канторы гандлююць з мясцовымі купцамі ў крэдыт. У 70-я гады XV стагоддзя працягваліся скаргі на ўсялякія перашкоды, якія ганзейскім купцам рабілі жыхары і кіраўніцтва горада Коўна. Напрыклад, у 1476 годзе ганзейская кантора скардзілася ў Данцыг сярод іншага на забарону броварства і вырабу алкагольных напояў: *“І затым мы не можам набыць мёду, каб зварыць з яго бочку медавухі (eyn tonne mede) і паставіць яе ў свой пограб ці адаслаць нашым сябрам”* [6, S. 299, № 473]. У 1480 годзе такая скарга з боку ганзейскай канторы ў Данцыг ізноў паўтарылася: *“Затым, паважаныя нашы паны, яны забаранілі нам варыць піва і мёд для ўласнай патрэбы ў нашых дварах”*[6, S. 501, № 791]. У 1482 годзе скаргі па пытаннях броварства працягваліся [6, S. 591, № 956].

Далей, пад 1483 годам, у 10 томе гісторыкі могуць знайсці скаргу самой канторы да магістрата горада Данцыга на свайго непаслухмянага купца Фрыдрыха Кліпінга (*Fredrick Clippynck*) [6, S. 631, 632, № 1031]. Перапіска па “справе Кліпінга”, дарэчы, працягвалася ў 1484, 1485 і нават у 1488 і 1489 гадах.

Яшчэ адзін цікавы дакумент уяўляе сабой ліст ад кіраўніцтва Коўна, дасланы ў 1484 годзе ў магістрат Данцыга з тлумачэннямі па спрэчных гандлёвых момантах. Магістрат Коўна ў гэтым годзе паведамляў Данцыгу, што пры вымярэнні збожжа ганзейскія купцы павінны заплаціць з кожнай бочцы па 1 пфенінгу, спасылаючыся на даўніну гэтых выплат і дазвол караля і вялікага князя Казіміра.

У 11 томе Ганзейскай актавай кнігі ўтрымліваюцца акты, якія адносяцца да поздняга перыяду дзейнасці ковенскай канторы Ганзы. Унутраныя супярэчнасці ў самой канторы значна зніжалі яе моц. Да гэтага далучыліся яшчэ і знешнія фактары яе аслаблення. Колькасць скаргаў з боку купцоў канторы на жыхароў Коўна ў 80-я гады XV стагоддзя павялічылася. З крыніц 11 тома вядома, што ў 1487 годзе нямцы скардзіліся на ўзмацненне ціску на іх з боку гарадскога кіраўніцтва і купцоў Коўна [7, S. 121, № 136]. У тэксце гэтай скаргі ўзгадваюцца таксама прадукты, якімі вялі гандаль, такія як воск, соль, піва, збожжа. У гэтым жа годзе Коўна дало Данцыгу адказ на скаргу, абвергла ўсе абвінавачанні і нагадала, што Данцыг сам робіць перашкоды купцам з Вялікага Княства Літоўскага, асабліва ў гандлі соллю [7, S. 140, № 174]. У 1488 годзе абмен скаргамі і ўзаемнымі патрабаваннямі працягваўся. Дайшло нават да таго, што ганзейскія купцы павінны былі весці перамовы з прадстаўнікамі Коўна перад каралём і вялікім князем літоўскім у Гародні. На сустрэчы было вырашана правесці новыя перамовы, і, калі Данцыг не паставіцца да справы сур’ёзна і не будзе спрыяць урэгуляванню спрэчак, нямецкія купцы павінны будуць пакінуць Коўна [7, S. 158–159, № 201].

У 1489 годзе Данцыг у рэшце рэшт прымусіў купца Фрыдрыха Кліпінга падпарадкавацца правілам ганзейскай канторы ў Коўне і заплаціць штрафныя грошы. Але ўжо яго сябар, ці нават сваяк, Ганс Кліпінг адмовіўся падпарадкоўвацца статуту канторы [7, S. 232, 233, № 320]. Уцягнутая ва ўнутраныя супярэчнасці стагоддзя

ганзейская кантора ў канцы XV стагоддзя павінна была наводзіць парадак не толькі ў шэрагах сваіх удзельнікаў, але і супрацьстаяць знешняму ціску жыхароў Коўна. Крыніцы Ганзейскай актавай кнігі сведчаць пра аслабленне пазіцый канторы на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. У прыватнасці, у 1492 годзе немцам дазваляўся продаж солі толькі ў Коўне і Вільні [7, S. 369, 370, № 554]. Таксама ў 1492 годзе Коўна забараніла ганзейскім купцам набываць драўніну і попел на месцах іх непасрэднага вырабу. Гэтыя тавары можна было купіць у Коўне толькі праз купцоў Вялікага Княства Літоўскага [7, S. 399, 400 № 618]. Абмежаванне правоў ганзейскай канторы ў Коўне праходзіла паступова і планамерна. Але, нягледзячы на абмежаванні, ганзейскія купцы да 30-х гадоў XVI стагоддзя працягвалі праз кантору гандляваць з купцамі Вялікага Княства Літоўскага.

Крыніцы па гісторыі ганзейскай канторы ў Коўне XV стагоддзя, надрукаваныя ў Ганзейскай актавай кнізе, прапануюць гісторыкам каштоўны матэрыял для вывучэння гісторыі міжнародных гандлёвых працэсаў позняга Сярэдневякоўя. Можна з ўпэўненасцю сцвярджаць, што Ганза і Вялікае Княства Літоўскае выступалі ў гэтых працэсах як раўнапраўныя ўдзельнікі. Ажыццяўленне гандлёвых зносін абапіралася на адпаведную сістэму лагістыкі і інфармацыйнага забеспячэння. Само развіццё гандлю патрабавала вядзення перапіскі паміж гандлюючымі бакамі. Дакументы Ганзейскай актавай кнігі, такія як арданансы, скаргі, запрашэнні на перамовы, лісты ў Данцыг самой ганзейскай канторы ў Коўне, з'яўляюцца карыснымі для гісторыкаў, патрабуюць перакладу на беларускую мову і больш дэталёвага вывучэння.


1. Жарын Д.В. "Нёманскі гандлёвы шлях" і яго значэнне для гандлю Ордэна і Ганзы на ўсходзе Еўропы ў канцы XIV – першай палове XVI стст. // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. Вып. 4. – Минск: РИВШ, 2011. – 344 с.
2. Hansisches Urkundenbuch, bearb. von K. Höhlbaum, K. Kunze, W. Stein, H.G. von Rundstedt u. a., 11 Bde. – Halle, Leipzig, Weimar 1876–1939.
3. Hirsch, T. Danzigs Handels- und Gewerbsgeschichte unter der Herrschaft des Deutschen Ordens. – Leipzig: S. Hirzel, 1858. – 344 S.
4. Hansisches Urkundenbuch. Bd.8, 1451 – 1463 / Hrsg. vom Verein für hansische Geschichte. Bearb. von W. Stein. – Leipzig: Duncker u. Humblot, 1899. – 857 S.
5. Hansisches Urkundenbuch. Bd.9, 1463–1470 / Hrsg. vom Verein für hansische Geschichte. Bearb. von W. Stein. – Leipzig: Duncker u. Humblot, 1903. – 751 S.
6. Hansisches Urkundenbuch. Bd.10, 1471–1485 / Hrsg. vom Verein für hansische Geschichte. Bearb. von W. Stein. – Leipzig: Duncker u. Humblot, 1907. – 796 S.
7. Hansisches Urkundenbuch. Bd.11, 1486–1500 / Hrsg. vom Verein für hansische Geschichte. Bearb. von W. Stein. – Leipzig: Duncker u. Humblot, 1916. – 899 S.



**Дзярновіч А.І.**


## РЫЖСКІЯ АРХІЎНЫЯ КАЛЕКЦЫІ ЁГАНА ХРЫСТАФА БРОЦЭ: ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ І ІКАНАГРАФІЧНАЯ СПАДЧЫНА ПА ГІСТОРЫІ ЛІВОНІІ І БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

Ёган Хрыстаф Броцэ (Johann Christoph Brotze, 1742–1823) нарадзіўся ў Гёрліцы ў Саксоніі. Ён вывучаў тэалогію і філасофію ва ўніверсітэтах Лейпцыга і Вітэнберга. У 1768 г. Броцэ пераехаў у Рыгу, у якой і пад расійскім уладаннем віталася міграцыя нямецкіх спецыялістаў. Наступныя 46 гадоў жыцця Ёган Хрыстаф правёў на пасадзе выкладчыка, а потым і рэктара (дырэктара) Рыжскага Імператарскага ліцэя.

Броце належаў да плыні позняга гуманізму, так званыя школы эрудытаў. Прадстаўнікі Эрудыцкай школы бачылі галоўную задачу сваёй працы найперш у зборы і публікацыі гістарычных крыніцаў [14, с. 27]. Броцэ таксама меркаваў, што збор і апрацоўка гістарычных крыніц па гісторыі старажытнай Лівоніі, а найперш Ліфляндыі, і ёсць яго галоўнай місіяй поруч з педагагічнай дзейнасцю. Броце мэтанакіравана збіраў

гістарычныя матэрыялы і звяртаў увагу на ўсё тое, што здавалася важным для яго: людзей, будынкі, манеты, гербы, планы гарадоў, тэхнічныя інавацыі і г. д. Фіксуючы ўсё з вялікай дакладнасцю і заўсёды дадаючы пісьмовыя тлумачэнні, якія могуць часам утрымліваюць усяго пару радкоў, а часам і займаць некалькі старонак. Многія з артэфактаў і дакументаў, зафіксаваныя Броцэ, загінулі або зніклі без вестак у ходзе часу, інфармацыя пра іх захавалася толькі ў чарцяжах і апісаннях нямецкага даследчыка, якія былі зведзеныя ў яго найбольш значную працу, вядомаю пад назвай "*Sammlung verschiedener Liefländischer Monumente*" ("Збор разнастайных ліфляндскіх помнікаў"). Броцэ стварaў выявы старажытных дакументаў і артэфактаў, якія мелі дачыненне да мінулага Ліфлянцкага краю – пераважна той часткі даўняй Лівоніі, якая складае паўночную частку сённяшняй Латвіі і паўднёвую Эстоніі.

Гэтая калекцыя змяшчае 10 тамоў у скураных вокладках кожны з якіх складаецца з 2–3 частак (3246 аркушаў фармату 33 х 21 см). Сёння калекцыя захоўваецца ў Латвійскай Акадэмічнай Бібліятэцы [1, Nr. BM01000A – BM10214B.]. Большасць малюнкаў калекцыі ўяўляюць сабой арыгіналы, але ёсць таксама планы і малюнкі, выкананыя іншымі мастакамі і скапіяваныя Броцэ. Шмат арыгінальных малюнкаў Броце выкананыя ў адным колеры пяром. Каляровыя малюнкі выкананыя акварэллю ці пяром і таніраваныя акварэллю. На жаль, некаторыя з колераў у гэтых малюнкаў XVIII–XIX стст. на сённяшні дзень пабляклі, напрыклад, блакітныя і жоўтыя, а ў некаторых выпадках ад фарбаў засталіся асобныя кропкі.

Зразумела, што напрацоўкі Броцэ прыцягваюць найперш даследчыкаў балтыйскіх краін. Ужо ў канцы XX ст. быў распачаты праект па выданні гэтых збораў – з 1992 г. у Латвіі выйшлі 4 тамы матэрыялаў калекцыі [16; 17; 18; 19]. Замалёўкі, якія адлюстроўваюць матэрыялы па Эстоніі, былі выдадзеныя ў Таліне ў 2006 г. [20].

Але Броцэ ажыццяўляў і іншыя даследчыя праекты, звязаныя з фіксацыяй уласна дакументальнай спадчынай старажытнай Лівоніі. Да гэтай дзейнасці маюць адносіны некалькі калекцый копій актавых матэрыялаў, падрыхтаваных нямецка-балтыйскім даследчыкам. З копій дакументаў і адбіткаў пячатак, зробленых Броцэ, быў ўтвораны кодэкс "*Sylloge diplomatum Livoniam illustrantium*" ("*Збор дакументаў для асвятлення гісторыі Лівоніі*"), які захоўваецца ў Акадэмічнай бібліятэцы Латвіі [1, Nr. 4979—4980]. Гэтыя вялікія тамы *in folio* былі складзеныя з копій дакументаў, якія захоўваліся, пераважна, ва "Унутраным архіве" горада Рыгі [9; 10], пазней таксама былі далучаны матэрыялы са "Знешняга архіву" горада Рыгі [12] і розных прыватных збораў. Як пісаў сам Броцэ, ён жадаў зрабіць даступным для гісторыкаў дакументы, якія "заставаліся ў цемры" [2, p. [2]]. Такім чынам, асноўнай задачай працы Броцэ была эўрыстычна-прыкладная.

Практычна адначасова, як мяркуе латвійская даследчыца Айя Тайміня [22, S. 120.], са складаннем кодэксу "*Sylloge diplomatum Livoniam illustrantium*" Броцэ падрыхтоўваў копіі дакументаў для іншага свайго сістэматызаванага збору крыніц – "*Diplomata Rigensia descripta*". Гэты кодэкс змяшчаў копіі актаў, датычных ужо гісторыі ўласна горада Рыгі, а не ўсёй Лівоніі. І дакументы гэтыя былі ўзятыя менавіта з архіву Рыгі. Кодэкс складаўся з чатырох тамоў, скампанаваных выразна паводле храналагічнага прынцыпу: Vol. I: 1220–1300; Vol. II: 1304–1399; Vol. III: 1403–1479; Vol. IV: 1481–1667. Зараз гэты кодэкс захоўваецца ў Латвійскім Дзяржаўным Гістарычным Архіве [5; 6; 7; 8]. Памеры аркушаў кодэксу досыць вялікія: 28,8 х 45 см. Тэксты дакументаў і малюнкі заключаны ў рамкі, якія маюць у сярэднім памеры: 22,8 х 38,2 см.

Архіўная і крыніцазнаўчая дзейнасць Броцэ прыпала на перыяд абуджэння цікавасці нямецкага дваранства Балтыі да мінулага краю і сацыяльна-прававога статусу нямецкіх каланістаў у ім. Рэчы у тым, што пад расійскім скіпетрам нямецкая

супольнасць Балтыі захоўвала прывілеяванае становішча і правінцыйную аўтаномію (Landesstaat), але знакі будучай сацыяльнай і нацыянальнай напружанасці ў краі пачыналі паступова нарастаць. Апазіцыя палітыкі саступкам немцам мелася і ў Пецярбурзе. Менавіта таму нямецкае дваранства, а таксама бюргерства, імкнуліся знайсці гістарычна-прававое абгрунтаванне свайго *status quo* ў Ліфляндскай, Курлядскай і Эстляндскай губернях Расійскай імперыі. XIX стагоддзе стала перыядам росквіту архівістыкі і археаграфіі ў Балтыі.

Паводле даручэнняў ліфляндскага дваранства Броцэ дзейнічаў і на пачатку XIX ст., калі даследаваў рыжскія архівалі [13, с. 20]. У 1808 г. у адпаведнасці з рашэннем ліфляндскага дваранскага канвента пачалося капіяванне лівонскіх дакументаў з архіва Нямецкага ордэна ў Кёнігсбергу, якое арганізаваў ландрадца Вільгельм Фрыдрых барон фон Унгерн-Штэрнберг (1752–1832). Працы па перапісцы дакументаў працягваліся да 1816 г. і за гэты час было скапіявана 3 713 дакументаў [4, с. 86, 137]. Гэты збор, што змясціўся ў 28 тамоў in folio, і ёсць знакаміты "*Corpus historico-diplomaticum veteris Livoniae*" ("*Збор гісторыка-дыпламатычных старажытнасцяў Лівоніі*"), які і сёння захоўваецца ў Дзяржаўным Гістарычным Архіве Латвіі [11, Nr. 454–482]. Збор мае яшчэ падназву – "Sammlung von Urkunden zur alten Geschichte Livlands, theils aus dem königl. Preussischen geheimen Archive zu Königsberg, theils auch aus einheimischen Archiven in getreuen Abschriften zusammengeschtellt" ("Збор актаў па даўняй гісторыі Лівоніі, складзены часткова з каралеўскага Прускага Таемнага Архіву ў Кёнігсбергу, часткова таксама з мясцовых архіваў у дакладных копіях"). Параўнанне складу копій старажытных кірылічных дакументаў "*Diplomata Rigensia descripta*" і "*Corpus historico-diplomaticum veteris Livoniae*" дазваляе сцвярджаць, што ў апошні збор копіі смаленскіх грамат патрапілі менавіта з альбому копій Броцэ. Але на падрыхтоўцы новых копій раней ужо адшуканых матэрыялаў трансляцыя здабытай Броцэ інфармацыі не скончылася. На парадку дня стаяла пытання публікацыі звестак з ужо сабраных зборах. Адлік гэтага ўжо публікатарскага засваення матэрыялу варта весці ад двухтамовага выдання "*Index Corporis historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae*" [21], падрыхтаванага Карлам Эдуардам Наперскім. Гэта быў рэестр лівонскіх архіваліяў, якія знаходзіліся не толькі ў архівах даўняй Лівоніі, але таксама і ў Кёнігсбергу. Сам Наперскі меў несумненныя археаграфічныя заслугі [15, с. 96; 22, S. 124]. У прыватнасці, ім былі выяўленыя і апублікаваныя акты па зносінах Полацка, Ноўгарада і Вялікага Княства Літоўскага з Рыгай і Гоцкім берагам [3]. У "*Index Corporis historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae"*, апроч уласных здабыткаў, Наперскі ўключыў таксама матэрыялы з "*Corpus historico-diplomaticum veteris Livoniae*". Гэта значна павялічыла магчымасці карыстання сабранай прыбалтыйска-нямецкімі гісторыкамі інфармацыяй і, у тым ліку, зрабіла вынікі працы Ёгана Хрыстафа Броцэ больш вядомымі па-за межамі Рыгі і Ліфляндыі.

Можна канстатаваць, што Ёган Хрыстаф Броцэ стаў першым даследчыкам, які пачаў сістэматычна вывучаць рыжскія архівалі, у тым ліку і кірылічная граматы XIII–XVI стст., якія паходзілі з Беларускага Падзвіння.


1. Акадэмічная бібліятэка Латвійскага Універсітэта, Аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі (LU Akadēmiskā bibliotēka, Rokrakstu un reto grāmatu nodaļa). – Johann Christoph Brotze, "Sammlung verschiedener Liefländischer Monumente". – Nr. BM01000A – BM10214B.
2. Акадэмічная бібліятэка Латвійскага Універсітэта, Аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі. – Johann Christoph Brotze, "Sylloge diplomatum Livoniam illustrantium". – Tomus secundus [Riga, 1806]. – Nr. 4980.
3. Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригою и ганзейскими городами в XII, XIII, и XIV веке. / Найдены в Рижском архиве К.Э. Напиерским и изданные Археографической комиссией. – СПб.: Типография Императорской Академии Наук, 1857. – 26 с.

4. Дзярновіч, А.І. “…in nostra Livonia”. Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносінаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Лівоніяй у канцы XV – першай палове XVI ст.: Сістэматызацыя і актавы аналіз / А.І. Дзярновіч. Інстытут гісторыі НАН Беларусі. – Мн.: Athenaeum, 2003. – Т. І. – 374 с.
5. Дзяржаўны Гістарычны Архіў Латвіі (ДГАЛ). – F. 8. – 1. apr. – Nr. 42 (Johann Christoph Brotze, “Diplomata Rigensia descripta”. – Vol. I: 1220–1300).
6. ДГАЛ. – F. 8. – 1. apr. – Nr. 42A (J. C. Brotze, “Diplomata Rigensia descripta”. – Vol. II: 1304–1399).
7. ДГАЛ. – F. 8. – 1. apr. – Nr. 42B (J. C. Brotze, “Diplomata Rigensia descripta”. – Vol. III: 1403–1479).
8. ДГАЛ. – F. 8. – 1. apr. – Nr. 42C (J. C. Brotze, “Diplomata Rigensia descripta”. – Vol. IV: 1481–1667).
9. ДГАЛ, Рыга (Latvijas Valsts Vēstures Arhīvs, Rīga). – F. 8. – 3. apr. (“Унутраны архіў”).
10. ДГАЛ. – F. 8. – 4. apr. (“Унутраны архіў”).
11. ДГАЛ. – F. 214. – 6. apr. – Nr. 454–482.
12. ДГАЛ. – F. 673. – 4. apr. (“Знешні архіў”).
13. Енш, Г.А. Из истории архивного дела в Латвии. / Г.А. Енш. ЦГИА Латв. ССР. – Рига: Авотс, 1981. – 212 с.
14. Зейд, Т.Я. Характеристика изданий письменных источников по истории феодализма в Латвии / Т.Я. Зейд // Тезисы докладов и сообщений конференции по источниковедческим проблемам истории народов Прибалтики. – Рига: Зинатне, 1968. – С. 27–33.
15. Иванов, А.С. “Moscowitica–Ruthenica” в Латвийском Государственном Историческом архиве: история формирования комплекса, состав и введение в научный оборот. Важнейшие публикации документов комплекса “Moscowitica—Ruthenica” / А.С. Иванов // Древняя Русь. Вопросы медиевистики. – 2004. – № 4. – С. 94–106.
16. Broce, J.K. Zīmējumi un apraksti. / J.K. Broce. – 1. sējums Rīgas skati, ļaudis un ēkas / Se□juma red. T. Zeids. – Rīga: Zinātne, 1992. – 452 p.
17. Broce, Johans Kristofs. Zīmējumi un apraksti. / J.K. Broce. – 2. sējums Rīgas priekšpilsētas un tuvākā apkārtne. – Rīga: Zinātne, 1996. – 585 p.
18. Broce, J.K.. Zīmējumi un apraksti. / J.K. Broce. – 3. sējums Latvijas mazās pilsētas un lauki. Se□juma red. T. Zeids. – Rīga: Zinātne, 2002. – 488 p.
19. Broce, J.K. Zīmējumi un apraksti. / J.K. Broce. – 4. sējums Latvijas mazās pilsētas un lauki. – Rīga: Latvijas vēstures institūta apgāds, 2007. – 483 p.
20. Brotze, J.C. Estonica. / J.C. Brotze; Resp. Ants Hein. – Tallinn: Estopol, 2006. – XXXVI, 619 p.
21. Index Corporis historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae; oder: Kurze-Auszug aus derjenigen Urkunden-Sammlung, welche für die Geschichte und das alte Staatsrecht Liv-Estn- und Kurlands [...] von den Ritterschaften Liv-, Ehst- und Kurland's zusammengebracht worden ist. – Riga; Dorpat: Eduard Frantzen, 1833–1835. – Theil 1–2.
22. Taimiņa, Aija. “... aus ächten und unverfälschten Quellen”: Ernst Hennig, Wilhelm Friedrich Freiherr von Ungern-Sternberg, Johann Christoph Brotze und ihre Arbeit an den Dokumenten aus dem Geheimen Archiv in Königsberg / A. Taimiņa // Forschungen zur baltischen Geschichte. – 2009. – Bd. 1. – S. 115–144.

**Филькин К.Н.**

## ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЕ БЕНГАЛЬСКОГО ВАЙШНАВИЗМА XVI–XVII вв.

В изучении истории Индии существуют значительные отличия от сложившейся практики в отношении европейской истории. Анализируя методологию и подходы к изучению индийского средневековья, Е.Ю. Ванина указывает на проблематичность применения подхода, сложившегося при исследовании европейского средневековья и состоящего в изучении истории и социума по источникам, зафиксировавшим экономико-политическую ситуацию [1; 2], поскольку индологии известно лишь незначительное число подобных источников. При этом большинство средневековых источников, с которыми работают сейчас индологи, не столько содержат описание реальных исторических фактов и социальных взаимоотношений, сколько посвящены дискурсу о принятых в обществе ценностях. Поэтому Е.Ю. Ванина делает акцент на том, что данные источники, даже не являясь исторически строгими в нашем современном понимании, могут фиксировать значительные изменения в ценностных ориентирах, социально-этических нормах, мировосприятии и духовных исканиях людей, что, несомненно, всегда указывает на какие-то важные сдвиги в базисных сферах социальной жизни.

Одним из основных направлений индуизма является вайшнавизм, выделяющийся среди индуистских течений самой большой численностью последователей и характеризующийся монотеистическим поклонением Вишну или его различным проявлениям. Форма вайшнавизма, распространенная в исторической Бенгалии, получила наименование «бенгальский вайшнавизм» или «*гауда-вайшнававада*» [2; 3, с. 289–291]. Основоположником данной школы является Чайтанья (1486–1533). Как отмечают исследователи, как раз XVI в. стал временем значительной религиозной реформы, сопровождающейся прогрессом в философии и культуре [4, с. 61]. Бенгальский вайшнавизм оказал большое влияние на литературу и традиции Индии (в первую очередь Бенгалии, Ориссы, Уттар-Прадеша, Манипура, Ассама). Сам основатель школы не оставил после себя собственноручно записанных трудов (за исключением поэтического текста на санскрите под названием «Шри Шикшаштака»), но своей деятельностью дал огромный импульс движению *бхакти* в культуре Индии и стал причиной появления огромного комплекса литературы по данной тематике. Это влияние столь значимо, что, например, А. Бэшем оценивает концепцию *бхакти* как наиболее выдающийся вклад в культуру средневековой Индии [6, с. 95].

Богатое литературное наследие как одна из наиболее ярких черт движения Чайтаньи имело свои особенности. Языком литературы помимо санскрита («академического языка» индуизма) стали бенгали (как родной язык области зарождения движения) и другие местные языки регионов, где распространялось движение (ория, брадж и т.д.). Использование местных языков, а не только санскрита, было достаточно революционным, сделав процесс самопознания доступными не только для высших социальных групп (*брахманов*), но и для широких слоев населения, в т.ч. низших сословий системы *варнашрамы* и даже находящихся вне нее. Это стало для бенгальского вайшнавизма одним из проявлений его универсализма, стремления показать открытость *бхакти* для всех людей.

Среди вайшнавских текстов можно выделить несколько групп [3, с. 50–54; 7, с. 123–147; 8, с. 556–649]: 1) агиографические работы (*чарита-кавйа*); 2) философские работы; 3) комментаторские работы (*тика-грантха*); 4) дидактические работы (практические наставления по различным аспектам повседневной жизни); 5) грамматики и работы по поэтике; 6) драматические произведения (*натака*); 7) поэмы (*кавйа, чампу*); 8) гимны (*стотра, гита и вируда*).

Агиографические произведения имеют в данной классификации текстов особое значение в качестве исторического источника. Они представляют собой жизнеописания Чайтаньи и его ближайших спутников, а также последующих поколений бенгальского вайшнавизма. Многие из агиографических работ являются грандиозными эпопеями и играют фундаментальную роль в развитии школы. Жизнеописание Чайтаньи и его окружения в основном связано с тремя географическими областями: это непосредственно сама Бенгалия (прежде всего Навадвипа), Орисса (Джаганнатха-пури) и современный штат Уттар-Прадеш (Вриндаван).

Наиболее известны среди многочисленных агиографий: «Чайтанья-чарита» (1513) Мурари Гупты, «Чайтанья-бхагавата» (1548) Вриндавана Даса, «Чайтанья-мангала» (1576) Лочана Даса, «Чайтанья-Чаритамрита» (около 1612) Кришнадаса Кавираджа Госвами. Агиографические трактаты, хотя на первый взгляд и являются вторичными по отношению к философско-теологическим трактатам современников Чайтаньи и последователей данной школы ввиду своего более позднего создания, тем не менее, имеют первостепенное значение. Прежде всего это относится к «Чайтанья-чаритамрите» Кришнадаса Кавираджа Госвами.

В российской исторической науке, в которой критическая агиография христианства (православия в первую очередь) весьма развита, исследования по

агиографии индуизма, и в частности бенгальского вайшнавизма, практически отсутствуют. Таким образом, актуальна задача исследования всего комплекса агиографических источников бенгальского вайшнавизма, в том числе как материала для изучения жизни индийского общества, его ценностных ориентиров, исторических событий, а также межэтнического и межконфессионального взаимодействия.

При этом комплексное источниковедческое исследование письменных источников сопряжено с рядом проблем. Сохранившиеся письменные и вещественные источники, относимые по времени своего создания в т.ч. к периоду XVI–XVIII вв., продолжают оставаться в среде сообщества гаудия-вайшнавов предметом культа – т.е., как правило, данные источники носят сакральный характер, они скрыты от постороннего доступа, иногда публично открываются только на период каких-либо праздников, зачастую запрещена их съемка. Вследствие этого затруднен их полноценный источниковедческий анализ. Более того, многие письменные источники находятся в многочисленных небольших разбросанных по значительной территории храмах, где в условиях специфического индийского климата зачастую просто невозможно обеспечить надлежащее хранение. В результате этого, как можно предположить, огромное количество манускриптов и других вещественных источников находится на грани существования.

Но даже с письменными источниками, находящимися в тех или иных институтах, занимающихся сохранением наследия Индии (прежде всего это многочисленные библиотеки и университеты), ситуация обстоит не намного лучше, поскольку рукописи в огромном количестве оказываются «погребены» в архивах без изучения.

Поэтому в современных индологических исследованиях различного профиля (исторического, филологического, философского) в качестве источника используются не оригинальные источники (в том числе оригинальные собственноручные записи тех или иных исторических фигур движения вайшнавизма), а имеющиеся публикации данных источников, выполненные в XIX–XXI вв.

Сохранением манускриптов– их сбором, консервацией, хранением и оцифровкой – в Индии занимаются различные проекты и институты. Самым глобальным является запущенный Министерством по туризму и культуре Правительства Индии в 2003 г. проект «National Mission for Manuscripts» (http://www.namami.org). По оценке Д. Харрисона (директора «Bhaktivedanta Research Centre», о котором будет сказано ниже), собранная проектом коллекция составляет более двух миллионов единиц. Проект взаимодействует с огромным числом партнерских институтов по всей стране. Среди них необходимо отдельно отметить «Vrindavan Research Institute» (http://www.vrindavanresearchinstitute.org), основанный во Вриндаване (штат Уттар-Прадеш) в 1968 г. и занимающийся сохранением и исследованием наследия индийской культуры и в особенности наследия Вриндавана, где вайшнавизм играет ключевую роль. Примечателен еще один проект – «Bhaktivedanta Research Centre» (http://brcindia.com), находящийся в Калькутте (штат Западная Бенгалия). Официально открытый всего лишь в 2009 г., центр поставил своей целью сохранение наследия именно школы бенгальского вайшнавизма, для достижения которой сотрудники объезжают храмы Западной Бенгалии, проводя оцифровку хранящихся там манускриптов.

В современной историографии вайшнавизма отдельно можно отметить исследовательскую работу Э. Димока, Т.К. Стюарта и Р. Менринг, посвященную исследованию бенгальских агиографических источников. Э. Димок (1929–2001) огромную часть жизни он посвятил изучению Бенгалии, ее языку и литературе, в том числе изучению бенгальского вайшнавизма [9; 10]. Около 50 лет он занимался

переводом на английский «Чайтанья-чаритамриты» Кришнадаса Кавираджа Госвами, опубликовав его буквально за пару лет до окончания жизни [11]. Редактором данной публикации стал Т.К. Стюарт, другой заметный индолог, тоже занимающийся историей религий Бенгалии. Диссертационное исследование на тему «The Biographical Images of Krsna-Caitanya: A Study in the Perception of Divinity» [12] и многие статьи и книги посвящены истории, философии и литературе бенгальского вайшнавизма, в особенности его агиографии [13]. Изучением биографий Адвайта Ачарьи в настоящее время занимается Ребекка Менринг, профессор отделения религиоведения Indiana University Bloomington, которая опубликовала по ним несколько книг [14; 15].

Исследования Э. Димока, Т. Стюарта и Р. Менринг в области агиографии бенгальского вайшнавизма являются наиболее значительными современными академическими исследователями вайшнавской агиографии. В своих исследованиях данные ученые также придерживаются точки зрения, что агиографические источники данной школы, несмотря на их религиозную природу, несут определенную долю и исторической информации – прежде всего о жизни самого вайшнавского сообщества. Это делает имеющиеся сакральные биографические тексты с их изначально неисторическими элементами эффективным инструментом для исторической реконструкции.


1. Ванина, Е.Ю. Индийское средневековье – проблемы формирования представлений о человеке и обществе, времени и пространстве: автореф. дисс. … доктора исторических наук / Е.Ю. Ванина. – М., 2006. – 52 с.
2. Ванина, Е.Ю. Средневековое мышление: индийский вариант / Е.Ю. Ванина; Ин-т востоковедения РАН. – М.: Восточная литература, 2007. – 375 с.
3. Ватман, С.В. Бенгальский вайшнавизм / С.В. Ватман; под ред. С.В. Пахомова. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2005. – 403 с.
4. Индийская философия: энциклопедия / отв. ред. М.Т. Степанянц; Ин-т философии РАН. – М.: Вост. лит.; Академический Проект; Гаудеамус, 2009. – 950 с.
5. Dutt, R.C. The literature of Bengal; a biographical and critical history from the earliest times, closing with a review of intellectual progress under British rule in India / R.C. Dutt. – Calcutta, 1895.
6. Basham, A.L. Medieval Hindu India / A.L. Basham // A Cultural History of India / Ed. by A.L. Basham. Oxford, 1975.
7. Kennedy, M.T. The Chaitanya Movement: A Study of the Vaishnavism of Bengal / M.T. Kennedy. – Calcutta, 1925.
8. De, S.K. Early History of the Vaishnava Faith and Movement in Bengal. – 2d ed. / S.K. De. – Calcutta: K.L. Mukhopadhyay, 1961.
9. Dimock, E.C. The Place of the Hidden Moon: Erotic Mysticism in the Vaisnava-sahajiya Cult of Bengal / E.C. Dimock // With a new foreword by Wendy Doniger. – 2nd ed. – Chicago: University of Chicago Press, 1989. – 299 p.
10. Dimock, E.C. Doctrine and Practice among the Vaisnavas of Bengal / E.C. Dimock // History of Religions, Vol. 3, No. 1 (Summer, 1963), pp. 106–127.
11. Caitanya caritamrta of Kṛṣṇadasa Kaviraja: a translation and commentary // Kṛṣṇadasa Kaviraja Gosvami; Edward C Dimock; Tony Kevin Stewart. Publisher: Cambridge, Mass.: Dept. of Sanskrit and Indian Studies, Harvard University: Distributed by Harvard University Press, 1999.
12. Stewart, T.K. The Biographical Images of Krsna-Caitanya: A Study in the Perception of Divinity. / T.K. Stewart. – Chicago: University of Chicago, 1985. – 536 p.
13. Stewart, T.K. The Final Word: The Caitanya Caritamrta and the Grammar of Religious Tradition / T.K. Stewart. – New York: Oxford University Press, 2010.
14. Manring, R. Reconstructing Tradition: Advaita Acarya and Gaudiya Vaisnavism at the Cusp of the Twentieth Century / R. Manring. – New York: Columbia University Press, 2005.
15. Manring, R. The Fading Light of Advaita Acarya: Three Hagiographies / R. Manring. – New York: Oxford University Press, 2011.

**Великая Н.Н.**

# ФОЛЬКЛОРНЫЕ ИСТОЧНИКИ О РАННЕЙ ИСТОРИИ ГРЕБЕНСКОГО КАЗАЧЕСТВА

Одной из ранних групп казачества на юге России является гребенское. Более 300 лет гребенцы проживают на левобережье р. Терек. Письменные источники умалчивают об их происхождении. Первые упоминания о гребенцах датируются началом XVII века (о казаках на Тереке – второй половиной XVI века) и повествуют о военно-политических событиях в регионе и активном участии в них казаков. По мнению Е.Н. Кушевой, сведения письменных источников о т.н. вольном периоде крайне скудны и противоречивы, а надежд на новые источники нет [4, с. 28]. Археологические раскопки гребенских городков до сих пор не производились.

В этих условиях важнейшее значение приобретают фольклорные произведения гребенцов, запечатлевшие ранние этапы их истории. Сбор легенд и преданий казаков начался еще в XIX веке, в том числе в связи с написанием полковых историй. Интерес к ним проявил и великий русский писатель Л.Н. Толстой, проходивший службу на Кавказе и 2,5 года проживший в гребенской станице Старогладковской. Нельзя не согласиться с мнением О.В. Матвеева о том, что скептическое отношение к устной традиции неоправданно, поскольку фольклорные материалы создавались гораздо раньше письменных и поэтому являются самыми ранними историческими источниками, в которых, зачастую, не больше вымысла, чем в письменных документах. И, кроме того, в них отразились особенности самосознания казаков, их восприятие окружающего мира [5, с. 114].

Проблемой, давно волнующей исследователей, является определение отправной точки, откуда русские люди появились в Притеречье. В преданиях эта предистория рисуется весьма туманно. В одной из легенд рассказывается о неком обозе, который шёл в Архангельск, но сбился с пути и вниз по Волге пришёл на Терек. В другой упоминается средняя полоса России – Калуга, Рязань. Казаки-де ушли сначала в Астрахань, а уже оттуда на Гребень (в горы). Ещё одна легенда рассказывает, что предки гребенских казаков были некогда казаками Ермака. Когда он пошёл в Сибирь, от него отделился некто Андрей (Шадра) с казаками и поселился за Тереком [8, с. 166, 169]. Упоминаемые в преданиях средне-северорусские ориентиры вполне согласуются с аналогичными элементами материальной и духовной культуры гребенцов. Путь по Волге – Каспию – Тереку – его притокам, уходящим в горы, также представляется весьма реальным.

О времени поселения казаков в горах предания сообщают как об очень давнем. Приведём в этой связи запись, сделанную в середине XIX века Л.Н. Толстым. В ней говорится о прибытии на Терек Ивана Грозного с войском, который «по самое море землю забрал и столбы поставил... Только пришло ему время домой идти, вот он и говорит: «Земля эта мне полюбилась. Кого мне тут на границе оставить». Ему и сказывают, что, мол, есть тут за рекой казаки, на Гребне живут, им землю отдай, они стеречь тебе её будут. «Поди, говорит, приведи мне этих стариков-казаков, я с ними говорить буду». Приехали старики, человек сто приехало верхами...». На призыв царя служить ему старики ответили так: «Мы вольные казаки, отцы наши вольные были, и мы никакому царю не служили, да и детям нашим закажем. А коли ты, мол, нам земли отдать хочешь, мы перейдём, только ты нашу казацкую волю не тронь. А мы из-за Терека татар не пустим» [12, с.31].

Упоминание Ивана Грозного в этом и многих других фольклорных произведениях гребенцов неслучайно, поскольку именно с ним связан выход границ российского государства на Терек, строительство здесь первых городков и острогов.

Иван Грозный на Тереке не был, но терские воеводы его именем осуществляли политику в регионе. Предание определённо указывает, что казаки проживали на гребнях задолго до появления российской администрации на Тереке. Одно поколение сошло с исторической арены, другое состарилось. Конец XV в. – такова глубина исторической памяти гребенцов. В этой связи можно предположить, что «исход» населения из средне-севернорусской зоны на юг был связан с присоединением к Москве Новгородских (1477 г.), Тверских (1485 г.) и Вятских (1489 г.) земель, что не исключает наличия в регионе восточнославянского населения ещё в домонгольский период, о чём свидетельствуют разрозненные находки древнерусских предметов (кресты, иконы-складни, подвески и др.) с территории Центрального и Северо-Восточного Кавказа.

У ведамасцях 1840 г. запаўняліся наступныя звесткі: колькасць парафій; назва парафіяльных касцёлаў і належачых да іх асобных алтарый, філій і капліц; колькасць святароў у касцёлах, альтарыях і філіях; час правядзення набажэнстваў у альтарыях і філіях пры адсутнасці ў іх пастаянных святароў; назвы населеных пунктаў і іх частак, якія ўваходзяць у парафію; колькасць парафіян у кожным населеным пункце [5, арк. 13]. Гэтыя ведамасці дазвалялі прааналізаваць як тэрытарыяльную разлегласць парафій і дэканатаў, колькасць духавенства ў іх, так і колькасць асоб рымска-каталіцкага веравызнання ў населеных пунктах, а таксама фіксіравалі тэрміны правядзення набажэнстваў у альтарыях і капліцах, што пазней выкарыстоўвалася для іх зачынення. Напрыклад, Фашчоўскі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Марыі Панны касцёл ў 1840 г. знаходзіўся ў Магілёўскай губерні. Да яго былі прыпісаны драўляныя капліцы ў мызе Вуглы памешчыка Менжынскага і мызе Кардзеева памешчыка Казменскага. Парафія ахоплівала тэрыторыі Магілёўскага, Капыскага, Чавусаўскага паветаў (м. Фашчоўка, мыза Заходцы, в. Меньшыя Сліжы, в. Аніковічы, в. Навасёлкі, в. Селішча і інш.), дзе пражывала 1823 парафіяніна, духоўныя патрэбы якіх забяспечваліся двума святарамі [5, арк. 18–19]. Звесткі за 1840 г. адлюстроўваюць стан прадстаўніцтваў каталіцтва ў Магілёўскай губерні (25 парафій).

Рэарганізацыя дэканатаў праводзілася ў 1844 годзе на падставе ўказу Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі ад 27 снежня 1843 г. № 5159 і адначасова ўводзілася дзяленне парафій на класы ў адпаведнасці з іх значнасцю. Зямельнымі валоданнямі рымска-каталіцкай царквы былі зацікаўлены як кансісторыі, так і органы дзяржаўнай улады. У залежнасці ад атрыманага класу вызначалася колькасць святароў у парафіі і памеры іх утрымання. У ведамасцях, складзеных для абгрунтавання адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры, падаваліся, акрамя назвы касцёла і месца яго знаходжання, даходы духавенства ад дамоў, пляцаў і іншых нерухомых маёмасцяў, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні, і памеры ўтрымання ад казны, што дазваляла перавесці парафіі, якія мелі ўласныя даходы, на частковае самаўтрыманне [2, арк. 12–13 адв.]. Так, Веліжскі касцёл знаходзіўся ў Віцебскай губерні, адносіўся да 3-га класу (1548 парафіян). Яму належала штатнае ўтрыманне ў адпаведнасці з класам у памеры 400 рублёў з казны, таму што іншых даходаў ён не меў [2, арк. 176 адв.]. Адначасова Ляшчылаўскі касцёл Дрызенскага павету Віцебскай губерні адносіўся да 4-га класу (678 парафіян) і ад сваіх маёмасцяў атрымліваў 210 руб. даходу. Утрыманне для касцёлаў 4-га класу складала 275 руб., таму ад казны яму належала 65 руб. [2, арк. 178]. У выніку рэарганізацыі да 1-га класу было аднесена – 3 парафіяльных касцёла (утрыманне – 600 руб.), да 2-га – 5 (500 руб.), да 3-га – 39 (400 руб.), да 4-га – 74 (275 руб.), да 5-га – 101 (230 руб.) [2]. Усяго адзначана 227 парафіяльных касцёлаў, з іх

40 па Магілёўскай і 86 – Віцебскай губернях, а астатнімі ахоплены тэрыторыі еўрапейскай і азіяцкай частак Расійскай імперыі і украінскія землі [2].

На 31 ліпеня 1854 г. фарміравалася ведамасць аб стане касцёлаў Магілёўскай архідыяцэзіі. Відавочна, захавалася вокладка, зробленая ў архіве кансісторыі: яна выраблена са скуры, аздоблена цісненнем, а назва справы напісана пазалочанымі літарамі [4]. Акрамя таго, да ведамасці складзены алфавітны паказальнік, хаця звесткі пададзены па алфавітным прынцыпе [4, арк. 1–4 адв.]. Ведамасць уключала агульныя звесткі аб касцёле, а таксама яго прыналежнасць да класу па штаце і колькасць парафіян. Асаблівую ўвагу звяртае наяўнасць інфармацыі аб працэсе разбору парафіян з праваслаўным духавенствам, ступені яго завершанасці і нумары справы ў архіве кансісторыі аб гэтым, што дазволіць выявіць гэтыя справы пры суаднясенні з вопісамі архіва XIX ст. Акрамя таго пазначана, ці маюцца справы аб пабудове і рамонце касцёла, надзяленні землямі і інш. і іх нумары. Напрыклад, Гомельскі касцёл знаходзіўся Гомельскім павеце Магілёўскай губерні, уваходзіў у склад Беліцкага дэканату і адносіўся да 3-га класу (1406 парафіян). Прыпісана да яго было дзевяць капліц. Разбор з праваслаўным духавенствам аб прыналежнасці парафіянаў да каталіцтва быў скончаны 1 жніўня 1846 г. Акрамя таго, у архіве кансісторыі мелася справа аб неправільным продажы дома гэтага касцёла за 1852 год № 180 [4, 16 адв.–17]. Усяго ў дадзенай справе ўтрымліваюцца звесткі аб 169 парафіяльных касцёлах, з якіх 42 з Магілёўскай і 93 – Віцебскай губерняў [4].

Ведамасці аб стане касцёлаў, філій і капліц архідыяцэзіі за 1873–1876 гг. складаліся па фарамуляры аналагічным 1840 г. [6, спр. 1475, арк. 6 адв.–7], аднак імі ахоплены большыя тэрыторыі. Паводле іх у Магілёўскай губерні налічвалася 25 парафіяльных касцёлаў, Віцебскай – 83, у Еўразійскай частцы Расійскай імперыі – 23, Маскве – 4, а Санкт-Пецярбурзе – 11 [5–10].

Апошнімі з захаваўшыхся, з’яўляюцца ведамасці, якія прадстаўляліся дэканамі да 1 мая 1893 г. і уключалі наступныя звесткі: нумар, назва касцёла, агульная плошча касцёльнай зямлі, спасылкі на дакументы, якімі пацвярджаюцца правы на яе, колькасць здадзенай у арэнду, імя арандатара, наяўнасць кантракту, дата яго заключэння і зацвярджэння кансісторыяй, памеры штогадовай арэнднай платы, характарыстыка пабудоў на гэтай зямлі і заўвагі [11, арк. 87–89]. Нажаль, яны носяць фрагментарны характар і не адлюстроўваюць распаўсюджанасць каталіцтва на тэрыторыі архідыяцэзіі.

Такім чынам, складанне ведамасцяў аб стане касцёлаў, філій і капліц Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі сведчаць як аб удасканаленні працы канцылярыі кансісторыі праз уніфікацыю форм асобных відаў дакументаў, што было выклікана ростам справаводства на працягу XIX ст., так і аб увазе, якая надавалася кіраўніцтвам канфесіі стану падначаленых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Улічваючы межы Магілёўскай архідыяцэзіі, якая ахоплівала прадстаўніцтвы царквы ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, а таксама парафіяльныя і філіяльныя касцёлы, капліцы на тэрыторыі Расійскай імперыі, якія не ўваходзілі ў склад іншых дыяцэзій (Іркуцкая, Ліфлянцкая, Чарнігаўская губерні і інш.), улікова-статыстычны характар разглядаемых крыніц і дэталізаванасць унесеных звестак, іх крыніцазнаўчы патэнцыял не выклікае сумніву. Гэтыя крыніцы могуць быць выкарыстаны для ўдакладнення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры рымска-каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі, колькасці духавенства, яго асабістага складу, эканамічнага стану касцёлаў, сацыяльнай структуры каталіцкага насельніцтва на тэрыторыі архідыяцэзіі, а таксама даследавання гісторыі асобнага касцёла.

1. Антановіч, З.В. Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.): дыс. … канд. гіст. навук: 05.25.02 / З.В. Антановіч. – Мінск, 2010. – 148 с.

2. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Спр. 3261.
3. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Спр. 6172.
4. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 25. – Спр. 33.
5. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1444.
6. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1475–1476.
7. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1477.
8. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1478.
9. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1479.
10. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1480.
11. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 28. – Спр. 7.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск: Губернская типография, 1914. – 406 с.; Памятная книжка Могилевской губернии на 1914 год. – Могилев: Губернская типография, 1914. – 588 с.
13. Управление духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. – Кн.1. О управлении духовных дел христиан римско-католического и армяно-католического исповеданий // Свод законов Российской империи / Сост. Н.П. Балканов, С.С. Войт, В.Э. Герценберг / Под ред. И.Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург: Русское книжное товарищество «Деятель», 1896. – Т. XI. – С. 1172–1202.
14. Directorium officii divini et missarum Generale pro utroque clero archdioecesis Mohilevensis in Annun Domini MDCCCXXI auctoritate et mandato illustrissimi, excellentissimi AC reverendissimi Domini Domini Stanislai Siestrzencewicz a Bohusz. – Mohilevie: Typis palatii metropolitani Rom. Catholic., 1820. – 73 k.; 1824 – 75 k.; 1825 – 75 k.; 1828 – 75 k.; 1830 – 75 k.; 1831 – 75 k.; 1832 – 80 k.; Directorium officii divini ac missarum ad ussum utriuque Cleri Archi-Dioecesis Mohileviensis pro anno Dni MDCCCXXXIII. – Mohilevie: typis consistorii Rom Catholic, 1832. – 75 k.; 1833 – 75 k.; 1834 – 75 k.; 1837 – 75 k.; 1838 – 76 k.; 1840 – 61 k.; 1841 – 70 k.; 1842 – 70 k.; 1843 – 63 k. і інш.
15. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). – F. 694. – Ap. 1. – B. 3634. – Статыстычныя ведамасці па Магілёўскай архідыяцэзіі, 1823 г.

**Мяньчэня С.В.**

## ДАКУМЕНТЫ ГУБЕРНСКІХ КАМІТЭТАЎ ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ НГАБ)

Пытанні дзяржаўнай палітыкі расійскіх уладаў па рэалізацыі дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць і продаж алкагольных напояў (1894–1917 гг.) і асаблівасці яе рэалізацыі на Беларусі з'яўляюцца мала даследванымі ў айчыннай гістарычнай навуцы. Між тым вывучэнне гістарычнага вопыта па абмежаванню спажывання алкаголя мае не толькі навуковае, але і важнае практычнае значэнне.

Практычная рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі Расійскай Імперыі ў дадзенай галіне была ўскладзена на мясцовыя камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці, што дзейнічалі пад кантролем Галоўнага ўпраўлення неакладных збораў і казённага продажу піцей Міністэрства фінансаў. Губернскія камітэты пад кіраўніцтвам губернатара, а павятовыя на чале з мясцовым прадвадзіцелем дваранства займаліся пытаннямі арганізацыі чайных, бібліятэк-чытальняў і "народных дамоў" (комплекс, дзе знаходзіліся чайная, сталовая, бібліятэка-чытальня, крама па продажу канцэлярскіх прадметаў, зала для народных чытанняў і канцэртаў, гасцініца), правядзеннем народных чытанняў на антыалкагольную тэматыку і іншыя тэмы, сачылі за выкананнем правіл дзяржаўнай "віннай" манаполіі, ажыццяўлялі арганізацыю культурнага дасуга насельніцтва, садзейнічалі адкрыццю і ўтрыманню лячэбных устаноў для хворых на алкагалізм і пакутваючых ад запояў [8, арк. 3].

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца дакументы Віцебскага, Мінскага і Магілёўскага губернскіх камітэтаў. Дакументы Віцебскага губернскага камітэта папячычельства аб народнай цвярозасці і яго павятовых аддзяленняў аб'яднаны ў 3 асноўныя фонды: ф. 2709 – дакументы ўласна губернскага камітэта (97 спраў), ф. 2555 – дакументы Віцебскага павятовага камітэта (247 спраў), ф.

3283 – дакументы Гарадокскага павятовага камітэта (1 справа). Дакументы ахопліваюць час з утварэння камітэтаў (1897 г.) да 1913 г. Большая частка дакументаў дачытыцца перыяду найбольшай актыўнасці камітэтаў 1897–1903 гг. Фонд Гарадокскага павятовага камітэта ўяўляе сабой усяго адзін дакумент за 1903 г. Дакументы Мінскага губернскага камітэта: ф. 57 – губернскі камітэт (22 справы), ф. 132 – Мінскі павятовы камітэт (65 спраў), ф. 1412 – Рэчыцкі павятовы камітэт (1 справа), ф. 1098 – Ігуменскі павятовы камітэт (1 справа). Часовыя рамкі – 1897–1917 гг. Дакументы Магілёўскага губернскага камітэта: ф. 2296 – Магілёўскі павятовы камітэт (11 спраў). Часовыя рамкі – 1897–1912 гг.

Як бачна, большая частка дакументаў датычыцца Віцебскай губерніі, і таму дзейнасць Віцебскага губернскага і павятовага камітэтаў прадстаўлена больш поўна. На разглядзе гэтых матэрыялаў спынімся больш падрабязна. Сярод архіўных дакументаў можна выдзяліць наступныя групы: справаздачы камітэтаў, журналы паседжанняў, перапіска з дзяржаўнымі ўстановамі і прыватнымі асобамі, бухгалтерскія кнігі.

Штогадовыя справаздачы віцебскага павятовага і губенскага камітэта, прызначаныя для Міністэрства фінансаў, ахопліваюць амаль час да 1913 г., калі іх дзейнасць паступова не прыпынілася, а у гады Першай сусветнай вайны страціла сваю актуальнасць у сувязі з заканадаўчымі абмежаваннямі продажу і ўжывання алкаголю. Штогадовыя справаздачы іншых губернскіх камітэтаў у архіве адсутнічаюць.

Справаздачы камітэтаў складаюцца з некалькіх раздзелаў: інфармацыя аб складзе камітэта, колькасць членаў, іх сацыяльны склад і ўзровень актыўнасці; асноўныя накірункі дзейнасці (дадзеныя па чайным і сталовым, бібліятэкам, народным спектаклям, чытанням і гулянням), фінансавыя рахункі, спіс маёмасці і т.д. Асобна вызначаліся адносіны мясцовага насельніцтва да мерапрыпрыемстваў камітэта, аналізаваліся прычыны няўдалых мерапрыемстваў [11, арк. 2–5]. Падобным чынам складаліся і справаздачы мясцовых ўстаноў – чайных, “народных дамоў”, бібліятэк.

У справаздачах загадчыкаў чайных указваліся цэны на прадукты, смета прыбытку і расходаў (арэндная плата, заробак персанала, прытак ад продажу габраты, цукра, папірос і закусак), колькасць наведвальнікаў па месяцах, асобна мужчын і жанчын, культурна-асветніцкія мерапрыемствы. Асобую цікавасць выклікаюць прыватныя яўрэйскія чайныя, якія адчыняліся былымі ўладальнікамі вінных крамаў, дзе прадавалася гарбата самых горшых гатункаў і дазвалалася распіваць прынесеныя з сабой гарэлку і віно, а часам і купляць іх [1, арк. 35]. Негледзячы на відавочнае парушэнне заканадаўства, улады так і здолелі іх ліквідаваць, з прычыны асцярожнасці ўладальнікаў і наведвальнікаў.

Бібліятэкі і чытальні, якія падпарадкоўваліся камітэтам забяспечвалі мясцовых жыхароў кнігамі, якія ці выдаваліся на абанемент, ці чыталіся на месцы. Загадчыкі бібліятэк-чытален у сваіх справаздачах адзначалі колькасць наведвальнікаў і абанементаў (асобна хрысціян і яўрэяў), вызначалі найбольш папулярныя літаратурныя жанры і вялі ўлік чытачоў па ўзросту [7, арк. 18].

Асобна можна вызначыць асабістыя дадзеныя членаў камітэтаў. Статут камітэта вызначаў колькасць абавязковых членаў з ліку службовых асоб і духавенства. Астатнім стаць членам камітэта можна было пасля асабістага прашэння, але часцей, улады рассылалі запрашэнні, абапіраючыся на спісы благанадзейных асоб, якія складаліся паліцэйскімі органамі[9, арк. 2-14]. Прыналежнасць да камітэта вызначалася ці актыўнай працай, ці 5-рублёвым шгогадовым членскім узносам.

Цыркуляры галоўнага ўпраўлення па неакладных збораў і казённага продажу піцей Міністэрства фінансаў датычацца арганізацыйнай дзейнасці камітэтаў. Гэта разнастайная інфармацыя ад узору знакаў адрознення членаў камітэта да вызначэння правіл арганізацыі чайных і паводзін іх наведвальнікаў [2, арк. 27; 3, арк. 141].

Выкананне гэтых норм было абавязковым, што часцей за ўсё перашкаджала эфектыўнай дзейнасці і не спрыяла развіццю ініцыятывы на месцах.

Акрамя антыалкагольнай дзейнасці камітэт займаўся асветніцтвам і арганізацыяй дасуга насельніцтва. Так у Віцебску была арганізавана зона адпачынку на Юр'евай Горцы, дзе праводзіліся народныя гулянні, пад час якіх працавалі каруселі, выступалі фокуснікі і гімнасты, праводзіліся кінапаказы і веласіпедныя спаборніцтвы [5, арк. 3]. Зімой на Заходняй Дзвіне дзейнічаў каток з лядовымі горкамі, які павінны быў адцягнуць насельніцтва ад кулачных баёў, якія праводзіліся тут жа [5, арк. 4]. Ладзіліся народныя гулянні з прычыны дзяржаўных урачыстасцей: 100-годдзя з дня нараджэння А.С. Пушкіна (1899 г.), 50-годдзя адмены прыгоннага права (1911 г.), 100-годдзя Айчыннай вайны 1812 года, 300-годдзя дома Раманавых (1913 г.). На Каляды і Новы год камітэт арганізоўваў ёлкі для дзяцей з бедных сямей.

Частка дакументаў датычыцца гісторыі віцебскага гарадскога тэатра. Гэта перапіска паміж камітэтам, гарадскімі ўладамі і кіраўніцтвам тэатра аб арганізацыі народных спектакляў і неабходнасці ў сувязі з гэтым рамонту тэатра; пералік спектакляў і тэатральнага рэквізіта [1, арк. 28]. Народныя спекталі праводзіліся да верасня 1903 г. і былі спынены ў сувязі з адсутнасцю інтарэса з боку "простага народу", большасць наведвальнікаў складалі яўрэі [6, арк. 5].

Сярод прыватнай перапіскі адзначаюцца лісты з просьбамі аб арганізацыі чайных і прыёме на працу. Працаваць у чайной з сярэднім заробкам 180 рублёў у год, выказвалі жаданне асобы рознага сацыяльнага стану: настаўнікі на летні перыяд, члены сямей святароў, жонкі чыноўнікаў [10, арк. 5].

Даволі актуальна і сёння гучаць лісты насельніцтва да губернатараў, з просьбамі не зачыняць чайныя. Так, напрыклад, ліст ад насельніцтва горада Сураж у сувязі з рашэннем закрыць з 1 красавіка 1907 г. гарадскую чайную: "…Трезвое же и просвещённое население более способно и к угождению Богу, и к исправному отбытию государственных повинностей, что в общем вполне способно пополнить государственному казначейству быть может получаемый какой-либо сравнительный недобор" [4, арк. 28].

Такім чынам, фонды губернскіх камітэтаў папячыцельтсва аб народнай цвярозасці могуць быць карыснымі як для даследчыкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне барацьбы з алкагалізмам, так і для даследчыкаў гісторыі дзяржаўных устаноў, гандлю, прадпрымальніцтва і паўсядзённага жыцця на мяжы XIX–XX стст.


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 9.
2. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 109.
3. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 113.
4. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 146.
5. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 200.
6. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 201.
7. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 241.
8. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 2.
9. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 10.
10. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 21.
11. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 85.

# Раздел 5
# ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ НОВЕЙШЕГО ВРЕМЕНИ

**Кукса А.Н.**

## АНАЛИЗ УКРАИНСКИХ СОБЫТИЙ 1917–1918 гг. В ЗАПИСКАХ КАНЧЕРА

На сегодняшний день в отечественной историографии немного внимания уделялось как личности Е.С. Канчера, так его творчеству и архивному наследию. В то же время в период выбора представителями белорусского народа вариантов дальнейшего развития событий на территории Беларуси, именно Е.С. Канчер оказался во главе Белорусского областного комитета Совета крестьянских депутатов, выступившего в декабре 1917 г. соучредителем Всебелорусского съезда в Минске. Из рукописей Е.С. Канчера следует, что именно он, пользуясь личным знакомством с В. Лениным, И. Сталиным и др. активно пропагандировал идею Белорусской советской республики. Красной нитью через его воспоминания проходит неприязнь к представителям Облискомзапа и, в отдельности к А. Мясникову, которые сорвали национальный проект Белорусской советской республики, реализуемый в декабре 1917 г. БОК совместно с представителями Великой Белорусской рады. Таким образом, Е.С. Канчер–это представитель течения пытавшегося объединить идеалы национальной белорусской государственности и идеи мировой пролетарской революции в одно целое, в связи с чем еще больший интерес вызывают его попытки анализировать параллельно развивавшиеся процессы в Украине.

Наиболее известной является работа Е. Канчера «Белорусский вопрос» [1], изданная в 1919 г., в которой он обращает внимание только на ключевые моменты истории белорусской государственности и того влияния, которое оказывало украинское национальное движение в моменты выбора дальнейшего пути развития. Идя, так сказать, по горячим следам, Е. Канчер, правда, преувеличивал влияние украинских событий на Беларусь, а иногда упрощенно воспринимал официальные версии. Так объективно подходя к выделению причин провозглашения независимости Белорусской республики «разгоном I Всебелорусского съезда и занятием части Белоруссии немцами», в то же время преувеличивает влияние украинской рады: «Опыт украинской национальной рады не давал покоя белорусской национально настроенной интеллигенции, и мы видим, как эта группа форсирует Белорусский Вопрос до отделения Белоруссии от России и до образования независимости Белорусской Республики» [1, с. 21]. Официальную же информацию, поступившую от Облискомзапа, при разгоне Центральной белорусской войсковой рады (ЦБВР) в январе 1918 г., «за связь с украинской радой», он трактует как попытку «вступить в союз с Украиной и даже образовать тройственный юго-славянский союз: Украины, Польши и Белоруссии» [1, с. 51]. Хотя на самом деле до таких проектов еще было рано.

Белорусским историком В.В. Скалабаном впервые упоминается предоставленная Е. Канчером в Секретариат истории Гражданской войны в 1937 г. рукопись «Из истории Гражданской войны в Белоруссии в 1917-1920 гг.», которая так и не была издана и хранится в Российском государственном архиве социально-политической истории. В фрагментах этой рукописи, опубликованных В. Скалабаном в 2010 г. в «Белорусской думке», также прослеживается большой интерес Е. Канчера к влиянию украинских событий на Беларусь. Учитывая ту обстановку, в которой создавалась эта рукопись, нельзя не заметить ее тенденциозность: возвышение роли Сталина и позиции Мясникова при принятии решения о проведении Всебелорусского съезда. Просто какое-то фатальное влияние Украинской рады на события в Минске, из воспоминаний Е. Канчера, при соответствующем критическом подходе, представляется как попытка оправдаться перед Сталиным за свои собственные

ошибки. Да и сам съезд, в этой рукописи, – это уже не стремление к проявлению воли белорусского народа, а попытка БОК взять под свой контроль национальное движение «иначе Белорусская рада, в союзе с Украинской радой, укрепит свои позиции и приведет к восстанию» [2, с. 96] против большевиков.

В то же время большую историческую ценность представляют собой записки Е. Канчера, созданные в 1960-х гг. и хранящиеся отдельным фондом № 311 в Национальном архиве Республики Беларусь: «Война и изучение государственного новообразования Украины и Белоруссии в 1914–1922 гг.», «Центральная Рада», «Украинцы» [3] и др.

Вопрос об истоках популярности большевистских настроений в массах в 1917 г. до сих пор вызывает интерес у исследователей. Практически все однозначно указывают на социальный аспект: конфликт бедных и богатых. На этом фоне тем больший интерес вызывает сравнительный анализ событий в национальных регионах Российской империи. В своей записке «Политические партии 1917 г.» Е. Канчер обратил внимание на то, что на территории Украины еще до 1917 г. проявились и начали доминировать антирусские настроения. За этим фактом следует однозначный вывод: «вот почему на Украине не имели успеха большевики» [4]. Но Канчер не останавливается на истоках этого явления, а интерпретирует известный ему факт в необходимой идейной оболочке. Для историка общеизвестно, что западные украинские регионы входили в состав Австро-Венгрии, которая воспитывала антирусские настроения с целью присоединения остальных частей Украины. На украинской же почве эти тенденции трансформировались в идею создания собственного государства. Центром украинского возрождения в нач. XX в. становится Галиция, которую общественные деятели того времени называли «украинским Пьемонтом». Проводя параллели с белорусским движением надо заметить, что у белорусов не было такого сильного побудителя национального фактора. Хотя М. Довнар-Запольский видит эти проявления в южных регионах Беларуси, но, несмотря на все надежды современников, Полесье не стало «белорусским Пьемонтом».

В этом контексте большой интерес у белорусских исследователей должен вызвать доклад Найденкова, озвученный в июне 1918 г. в Смоленске при обсуждении вопроса о судьбе Западной области. Одной из причин сохранения области он назвал бедность края: «Белоруссия представляет из себя голодный стан рабочих, готовых идти куда угодно и на какую угодно работу лишь бы избавить семью от лишнего рта» [5, л. 20]. По его мнению, более 75% насыпей железных дорог от Варшавы и до Амура были сделаны руками белорусов. Такое положение дел не могло не сказаться на формировании национального самосознания, как толерантного и безконфликтного к другим народам. Создавало это благодатную почву и для популяризации идей большевизма. Но не это имело определяющее значение в расстановке политических сил на территории Беларуси в 1917 г. В первую очередь необходимо учитывать значение Западного фронта, на котором солдат-белорусов практически не было.

В записке «Центральная Рада» Е. Канчер указывает на разительное отличие в формировании системы исполнительных органов власти от общероссийских тенденций, которое охватило Украину. В марте 1917 г., когда по всей России возникают губернские и уездные Советы рабочих и солдатских депутатов, в Украине «самостийники пошли своими путями: они начали с организации своих национальных «рад»: «малая Рада», «Центральная Рада» и т.д.». В развитии украинской государственности выделяет три этапа: Центральная Рада Украины, правительство гетмана П. Скоропадского и Директория Украины во главе с С. Петлюрой. Таким образом, он выделил схему, которая сейчас является классической в украинской историографической традиции.

В записке «Украинцы» особую роль в подогревании стремлений национальных организаций к самостийности Украины Е. Канчер отводит В. Ленину. В апреле 1917 г. «Ленин поощряет сепаратистское движение вообще и украинское в частности. Но не потому, что Ленину нужно было «счастье» украинцев, а потому, что Ленин на каждом шагу вредил Временному правительству» [3]. В мае 1917 г., когда Временное правительство отказало и представителям Беларуси и Украины в решении вопроса о самоопределении до Учредительного собрания, В. Ленин потребовал со стороны украинцев проведения национального восстания.

Надо заметить, что на Украине оказали решительное сопротивление этим настроениям Временного правительства и уже 10 июня 1917 г. издали I Уставную грамоту, в которой провозглашалось право украинского народа на национально-территориальную автономию. В Беларуси же национальные страсти угасают и только в июле 1917 г., после фактической победы Украинской рады в противостоянии с Временным правительством пытаются провести реорганизацию Белорусского национального комитета в Центральную раду белорусских организаций. Но в данном случае произошла механическая перестановка в руководстве, что не оказало положительного эффекта на национальное движение в целом.

В записке «Война и изучение государственного новообразования Украины и Белоруссии в 1914–1922 гг.» Е. Канчер акцентирует внимание на том, что планы России и Германии в годы Первой мировой войны способствовали развитию национальных идеалов. На оккупированной части территорий Российской империи Германия способствовала реализации права народов на самоопределение, вплоть до создания независимого государства. В ответ на это Временное правительство признало независимость Польши и обещало вскоре освободить эти территории, что заставляло правительство Керенского, несмотря на все неудачи, вести войска в наступление. Поддержка местного населения требовалась как одним, так и другим, что предоставляло национальным силам некий простор в выборе вариантов реализации своих стремлений к самоопределению. В связи с этим Е. Канчер пришел к следующей методике при рассмотрении вопроса о развитии белорусской государственности и параллельно украинской государственности, что проявилось в требовании «обязательно предварительно исследовать стремления, замыслы, планы Германии на завоевание земель на своем востоке в пределах: Польши, Литвы, Латвии, Эстонии, Белоруссии, Украины, Молдавии…» [3]. Из этого следует, что Е. Канчер как и другие современники тех событий геополитический фактор ставил выше местных условий, настроений населения и их жизненных нужд и потребностей.

Таким образом, призыв к самоопределению звучал и от Временного правительства (но с условием проведения Учредительного собрания), и от большевиков (но национальные партии в Украине вступили с ними в конфликт), и от США (но Америка далеко, а программа Вильсона распространялась только на самостоятельные субъекты). Наиболее реальным союзником национальных партий в этих условиях становится Германия. Первой на путь сближения с Германией и ее союзниками стала Украина, а за ней Литва, получившие признание своей независимости. На этот путь попытались встать и белорусские национальные силы, но признания добиться не сумели. Хотя, по мнению Е. Канчера, эта возможность появилась после ноябрьской революции 1918 г. в Германии, которая укрепляла против большевиков «республики Эстонию, Латвию, Литву и разговор вела с Белорусской радой о Белорусской незалежной республике» [3].

1. Канчер, Е.С. Белорусский вопрос. Сб. ст. / Е.С. Канчер. – Петроград: Изд. бел. отд. комиссариата по делам национал. СКСО, 1919. – 132 с.
2. Скалабан, В. Яўсей Канчар – палітык, гісторык, мемуарыст / В. Скалабан // Беларуская думка. – № 1. – 2010. – С. 88–97.

3. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). – Ф. 311.
4. НАРБ. – Ф. 311. – Оп. 4. – Д. 21.
5. НАРБ. – Ф. 59 п. – Оп. 1. – Д. 18.

**Бароўская В.М.**

## АГЛЯД КРЫНІЦ ПА ПРАБЛЕМЕ ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ ПЕРАГАВОРАЎ 1919–1921 гг. У АРХІВАХ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

Абсалютная большасць дакументаў, звязаных з ходам польска-савецкіх перагавораў 1919–1921 гг., з агульным міжнародным становішчам, унутранай і знешняй палітыкай Польшчы і Савецкай Расіі, утрымліваецца ў архівасховішчах суседніх Рэспублікі Беларусь дзяржавах (Расійскай Федэрацыі, Польшчы, Літве). Прапануем агляд крыніц па праблеме польска-савецкіх перагавораў ў сховішчах Расійскай Федэрацыі: Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ГАРФ), Расійскім архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі (РГАСПИ), Архіве знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АВП РФ), Архіве Расійскай акадэміі навук у г. Масква (Архіў РАН у г. Масква).

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ўтрымлівае фонды вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання агульнасаюзнага і расійскага значэння: Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (УЦВК, 1917–1936): фонд 1235 (вопісы 6, 7, 22, 23, 37, 38, 55, 56, 94, 95), Савета народных камісараў РСФСР (1917–1991): фонд 130 (вопісы 3, 4, 5, 22, 23, 25, 29), Расійскага тэлеграфнага агенцтва (РАСТА) пры Савеце Народных Камісараў РСФСР: фонд 391 (вопісы 1, 2, 8), Народнага камісарыята па справам нацыянальнасцяў (Наркамнац)РСФСР 1917–1924 гг.: фонд 1318 (вопісы 2, 20, 22, 23, 24, 25).

Найбольш буйным і значным для вывучэння тэмы польска-савецкіх узаемаадносін з'яўляецца фонд Савета Народных Камісараў (фонд 130). СНК РСФСР належала агульнае кіраванне палітыкай і эканомікай краіны, дзеля гэтай мэты выдаваліся дэкрэты, распараджэнні і інструкцыі. СНК РСФСР аб'ядноўваў цэнтральныя ведамствы рэспублікі і кіраваў іх дзейнасцю. Пастаянным органам СНК РСФСР з'яўлялася упраўленне справамі. Ва ўпраўленне справамі ўваходзілі сакратарыяты Вялікага і Малога Саўнаркома, канцылярыя, фінансава-гаспадарчы аддзел, прыёмная, аддзел сувязі.

У склад фонда ўваходзяць пратаколы пасяджэнняў Вялікага Савета народных камісараў 1919–1921 гг.: дэкрэты, пастановы, інструкцыі СНК РСФСР 1917–1923 гг., пратаколы пасяджэнняў СНК РСФСР за лістапад 1917 г. – май 1920 г., студзень 1921 г. – снежань 1921 г., пратаколы пасяджэнняў Малога СНК РСФСР за студзень 1918 г.– снежань 1919 г. (копіі), студзень 1920 г. – снежань 1923 г. (аўтэнтык) і дакументы да іх; дакументы старшыні СНК РСФСР (1918–1920 гг.) – лісты, тэлеграмы на імя У.І. Леніна. Акрамя таго, варта ўзгадаць рознага віду перапіску і звязаныя з ёй матэрыялы: з УЦВК – аб накіраванні дэкрэтаў на ўзгадненне, даклады аб працы агітацыйных цягнікоў УЦВК (1920 г.), пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума УЦВК (1919 г., 1920 г, аўтэнтыкі, копіі); з НКЗС – заключэнні перамір'я паміж РСФСР і Украінай (1918 г.), мірных перагаворах з Фінляндыяй (1920 г.), гандлёвага дагавора с Вялікабрытаніяй (1921 г.); з Наркамнацам РСФСР – аб становішчы на Украіне, фінансавым пытанням.

Неад'емнае месца фонда СНК РСФСР складаюць дакументы Бюро інфармацыі СНК РСФСР (1918–1922 гг.): агентурныя паведамленні і інфармацыйныя бюлетэні аб становішчы на фронце, у прыфрантавой паласе, па Наркамату па ваенным справам РСФСР, па НКЗС РСФСР–паведамленні, інфармацыйныя бюлетэні, паведамленні замежнай прэсы, радыёграмы аб становішчы за мяжой, міжнародных падзеях (1918–

1922 гг.); тэлеграмы і бюлетэні РАСТА, веснікі РАСТА, правінцыйнай і замежнай інфармацыі, агляды замежнай прэсы (1919–1922 гг.).

У рамках фонда варта звярнуць увагу на дакументы Бюро тэлеграм СНК РСФСР (1917–1922 гг.): тэлеграмы наркаматаў, розных ведамстваў, мясцовых Саветаў і устаноў аб міжнародным становішчы, узаемаадносінах РСФСР з краінамі Прыбалтыкі, Украінай, Беларуссю (1918–1919 гг.), Польшчай (1920 г.), становішчы ў нацыянальных рэгіёнах. У фондзе адклаліся: пратаколы Прэзідыума УЦВК (1921–1922 гг., аўтэнтыкі, копіі), бюлетэні аддзела друку НКЗС РСФСР (жнівень-снежань 1919 г.); матэрыялы па арганізацыі сістэмы дзяржаўных устаноў (наркаматаў і іншых ведамстваў) (1918–1921 гг.), пратаколы розных устаноў Беларусі, Украіны (1921 г.).

Фонд Расійскага тэлеграфнага агенства (РАСТА) пры Савеце Народных Камісараў РСФСР: фонд 391 (вопісы 1, 2, 8) утрымлівае звесткі аб абмене інфармацыяй з карэспандэнтамі РАСТА ў Германіі, Англіі, ЗША, Францыі і іншых краін, з карэспандэнтамі мясцовых аддзяленняў РАСТА; зводкі РАСТА, спецыяльныя інфармацыйныя зводкі замежных карэспандэнтаў РАСТА аб міжнародным становішчы; тэлеграмы РАСТА аб становішчы на франтах грамадзянскай вайны ў 1919 г.

Фонд Наркамнаца РСФСР 1917–1924 гг.: фонд 1318 (вопісы 2, 20, 22, 23, 24, 25) прадстаўлены пратаколамі пасяджэнняў камісарыята з 1918 г. па 1921 г., у тым ліку рашэнні аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята, змене кадравага складу камісарыята, рашэнне аб яго ліквідацыі. Адначаныя арганізацыйна-распарадчыя дакументы могуць служыць карыснай крыніцай вывучэння беларускага нацыянальнага руху, у тым ліку і працэса вядзення польска-савецкіх перагавораў 1919–1921 гг., ходзе беларуска-савецкіх перагавораў з пачатку 1919 г. паміж прадстаўнікамі БНР (А. Луцкевічам, А. Смолічам і прадстаўнікамі РСФСР).

З фонду Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага камітэту Савета рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх дэпутатаў: фонд 1235 найбольшую цікавасць прадстаўляюць стэнаграмы і пратаколы пасяджэнняў Усерасійскіх з’ездаў Саветаў (VII (5–9 снежня 1920 г.), VIII (22–29 снежня 1920 г.), IX (23–28 снежня 1921 г.); даклады СНК і наркаматаў РСФСР, тэксты дакладаў і выступленняў У.І. Леніна і іншых дэлегатаў з’ездаў, спіскі, анкеты, мандаты і пасведчанні дэлегатаў. Акрамя таго, у рамках фонда варта адзначыць, пратаколы і стэнаграмы пленарных пасяджэнняў і сесій УЦВК; дэкрэты, пастановы, рэзалюцыі і звароты УВЦК, “Зварот да польскіх працоўных, сялян і салдат у сувязі з інтэрвенцыяй Польшчы (2 лютага 1920 г.), Зварот УЦВК ад 23 верасня 1920 г.; пратаколы пасяджэнняў Сакратарыята УЦВК.

Праблематыка польска-савецкіх перагавораў 1919–1921 гг. прадстаўлена дакументамі Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі: так званага “архіва У.І. Леніна”, які ўключае непасрэдна ленінскія дакументы, рукапісы У.І. Леніна (фонд 2), матэрыялы яго сакратарыята (фонд 5), пратаколы СНК РСФСР (фонд 19). Варта адзначыць фонды дакументаў РКП(б)–КПСС: пратаколы пасяджэнняў VII Усерасійскай канфрэнцыі РКП(б) у снежні 1919 г. (фонд 42), IX з’езда РКП(б) у верасні 1920 г. (фонд 44), X з’езда РКП(б) (фонд 45). Найбольш буйным з’яўляецца фонд ЦК КПСС (фонд 17, 1898 г., 1903–1991 гг., 684 543 адз. зах.). Фонд сістэматызаваны ў 162 вопісы, які ахоплівае дакументы калектыўных органаў ЦК – Пленумаў, Палітбюро, Аргбюро, Сакратарыята і апарата ЦК (аддзелаў, упраўленняў, камісій). Да гэтага спісу неабходна дадаць асабістыя фонды членаў бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы, такіх як Г.В. Чычэрын (фонд 159), М.І. Калінін (фонд 78), Л.Б. Красін (фонд 137), Ю.Ю. Мархлеўскі (фонд 143), С.С. Пясткоўскі (фонд 300), К.Б. Радэк (фонд 326), С.М. Кіраў (фонд 80), Л.Д. Троцкі (фонд 325) і іншых дзеячоў.

Падчас вывучэння праблемы непасрэдная ўвага была звернута на агляд і збор архіўных крыніц на базе Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, прадстаўленага

фондамі рэферэнтуры па Польшчы (122 і 0122), сакратарыята Г.В. Чычэрына (4, 04), паўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР (СССР) у Польшчы (188 і 0188), рэферэнтуры па Літве (151, 0151).

Важнае месца займаюць крыніцы фонда 122 і 0122 (раней засакрэчанага). Значная частка з іх да гэтага часу не была ўведзена ў навуковы зварот. У фондзе захоўваюцца матэрыялы рознага кшталту: лісты Г.В. Чычэрына вышэйшаму савецкаму кіраўніцтву, у тым ліку У.І. Леніну, І.В. Сталіну, дыпламатычная перапіска з польска-савецкіх перагавораў з Мінску (з К. Данішэўскім), Рыгі (з А.А. Іофэ, Я.С. Ганецкім, В.В. Абаленскім), перапіска Чычэрын-Іофэ (за перыяд з студзеня 1919 г. па сакавік 1921 г.), справаздачы паўнамоцтных прадстаўнікоў РСФСР у Польшчы, якія былі накіраваны на адрас НКЗС РСФСР, дакументы па выкананні Рыжскага мірнага дагавора, матэрыялы аб ўзаемаадносінах Польшчы і БССР (1919 г, 1921 г.), дакументы аб спецыяльнай місіі А.І. Вянцкоўскага (сакавік-красавік 1919 г.), дыпламатычныя ноты і іншыя матэрыялы, накіраваныя ад імя БССР на адрас Польшчы, матэрыялы аб дзейнасці Польска-расійска-ўкраінскай узгадняльнай ваеннай камісіі, змешанай памежнай камісіі. У фондзе 122 прадстаўлены інфармацыйныя рэфераты паўнамоцнага прадстаўніцтва аб Польшчы, эканамічныя агляды, звесткі аб перагаворах паміж РСФСР і Польшчай, узаемныя ноты НКЗС РСФСР і польскага Міністэрства замежных спраў Польшчы, агляды ўзаемаадносін і г.д. Значную частку матэрыялаў фонда складаюць агляды польскай і еўрапейскай прэсы, якая датычыцца праблем міжнароднай і знешняй палітыкі Польшчы.

У склад фонда Сакратарыяту Г.В. Чычэрына (4, 04) уваходзяць дакументы, раней не публікаваныя, нотнай перапіскі Чычэрына, А.А. Іофэ і К. Данішэўскага з польскімі прадстаўнікамі Л. Васілеўскім, Я. Домбскім, Я. Сапегай; перапіска па палітычным пытанням мірнай дэлегацыі падчас перагавораў у Мінску (жнівень-верасень 1920 г.), і Рызе (верасень 1920 г. – сакавік 1921 г.), агляды польскай і еўрапейскай прэсы, якія непасрэдным чынам закранаюць беларускую праблематыку на польска-савецкіх перагаворах. Акрамя таго, у фондзе 4 і 04 утрымліваюцца пратаколы пленарных пасяджэнняў мірных канфрэнцый у Мінску і Рызе, пратаколы пасяджэнняў рабочых камісій, створаных падчас рыжскіх мірных перагавораў: юрыдычна-прававой, тэрытарыяльнай, па абмене ваеннапалонных, фінансава-эканамічнай; аб станаўленні і дзейнасці Літоўска-Беларускай ССР, развіцці ўзаемаадносін паміж РСФСР і БССР, БССР і Польшчай, праблеме ўзбуйнення БССР у 1924 г. і 1926 г., развіцці беларускага нацыянальнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Латвіі, Літвы з 1921 г. па 1926 г.

Фонд паўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР (СССР) у Польшчы (188 і 0188) прадстаўлены перапіскай бюро друку пры польскім прадстаўніцтве РСФСР у Польшчы, агляды польскай прэсы, дакументы па пытаннях мірных перагавораў з Польшчай у Мінску і Рызе (дыпламатычная перапіска Г.В. Чычэрына з А.А. Іофэ і К. Данішэўскім); матэрыялы аб дзейнасці Польска-расійска-ўкраінскай узгадняльнай ваеннай камісіі.

Падчас вывучэння праблематыкі польска-савецкіх перагавораў 1919–1921 гг., асабліва, апошняга рыжскага этапа сустрэч, нельга абмінуць фонд У.І. Пічэты (фонд 1548, вопіс 2), які ўтрымліваецца ў сховішчах Архіва Расійскай акадэміі навук у г. Масква. У.І. Пічэта, як член расійска-ўкраінскай мірнай дэлегацыі падчас перагавораў у Рызе і ўдзельнік юрыдычна-прававой камісіі, пакінуў поўныя ўспаміны аб ходзе канферэнцыі: працы галоўнай камісіі, правядзенні пленарных пасяджэнняў, выпрацоўцы “Дагавора аб перамір’і 12 кастрычніка 1920 г., дзейнасці іншых рабочых камісій. Акрамя таго, пад аўтарствам Пічэты спецыяльна для тэрытарыяльнай камісіі быў складзены гістарычна-краязнаўчы агляд беларускіх, украінскіх, літоўскіх зямель з выкарыстаннем шырокага кола статыстычнага матэрыялу.

**Шишанов В.А.**

# «АДРЕС ПРОФЕССОРА РЕПИНА НЕИЗВЕСТЕН…» (К ИСТОРИИ ОДНОЙ ПЕРЕПИСКИ ВОКРУГ УСАДЬБЫ ЗДРАВНЕВО)

Небольшая усадьба Здравнево неподалеку от Витебска стала для великого русского художника Ильи Репина местом, где его талант обрел новое дыхание. Здесь на протяжении 1892–1902 гг. художник создал ряд картин, вошедших в сокровищницу русского и мирового искусства: «Осенний букет» (1892), «На Западной Двине. Восход Солнца» (1892), «Белорус» (1892), «Лунная ночь» (1896), «Дуэль» (1896), «На солнце» (1900) и другие. Однако еще в 1899 году художник приобрел под Петербургом новую усадьбу – «Пенаты», где позже жил постоянно.

После Октябрьской революции и провозглашения независимости Финляндии «Пенаты» оказались оторванными от России. Репин невольно становится эмигрантом. В 1918 г. в Здравнёво из голодного Петрограда перебирается младшая дочь художника Татьяна Репина-Язева со своей дочерью. С этого момента события в былом месте отдыха на Витебщине становятся источником тревог и хлопот для Ильи Ефимовича. Действительно, близкие художника, по классификации большевиков, попадали в разряд «бывших помещиков» и «классово чуждых элементов», что ставило их в полную зависимость от милости верхов. Поэтому и Репин при всей вражде к Советской власти каждый раз должен был апеллировать к ним, чтобы как-то улучшить положение «родной ему семьи».

Так, в фондах Государственного архива Витебской области, Витебского областного краеведческого музея сохранилась достаточно обширная переписка 1923–1924 гг. (17 документов) по вопросу о помощи, проживавшим в Здравневе близким И.Е. Репина и охране усадьбы. Однако следы переписки уходят в «центр», в Москву. И не так давно, среди бумаг музейного отдела в фонде Главнауки Наркомпроса РСФСР в Государственном архиве Российской федерации (ГАРФ) нам удалось выявить новые документы. Безусловно, не все из них представляют интерес. В большинстве своем это распоряжения вышестоящих инстанций нижестоящим, отношения, сопроводительные записки которые, опускаясь по административной лестнице, порождают новый взаимообмен посланиями и, наконец, начинается подъем наверх полученных ответов с новыми сопроводительными записками. Таким образом, переписка, поступившая в организационный отдел ВЦИК в январе 1924 года насчитывает 16 листов [5, л. 3–19].

В июне 1921 года из Петрограда в Здравнёво на две недели приехала Вера Репина. В письме отцу она передает благодарность от младшей дочери за завещание ей Здравнева, но сообщает, что подобные завещания уже не имеют силы и советует: «<…> надо написать так, что: «Прощу Здравнёво оставить неприкосновенным, сохраняя и не разрушая его, как оно было – моего имени – охранителями же назначаю дочь Татьяну, внучку Татьяну и ее мужа Ивана Дмитр[иевича] Дьяконова. <…> Все крестьяне, волость и город Витебск помнят, вспоминают тебя за прошлое, и все сделают по желанию твоему» [7]. Обнаруженные документы заставляют усомниться в правомерности последней фразы. Ход, содержание и продолжительность переписки, последовавшей за обращениями о помощи, скорее можно отнести к курьезу, примеру бюрократической волокиты.

В публикациях уже приводились сведения о письмах отдела по делам музеев и охране памятников искусства, старины и природы Наркомпроса РСФСР, отправленных 15 и 20 февраля 1923 года соответственно в Витебский губисполком и губкоммунотдел, в которых органы местной власти информировались о том, что Здравнёво находится под «особой охраной» отдела [6, с. 25–26]. 28 февраля жилищный подотдел Витебского губкоммунотдела информировал отдел по делам музеев, что «сделаны соответствующие

распоряжения об охране усадьбы “Здравнево” и находящихся в ней художественных произведений» [1, л. 45; 4, л. 82–89]. В мае Витгубоно также доносил президиуму губисполкома о принятии мер к охране художественных ценностей в усадьбе [2, л. 420]. Казалось бы, проблемы близких Репина, во всяком случае, факт существования семьи Т.И. Репиной-Язевой и место жительства должны были стать известными местным властям.

4 мая 1923 г. заведующая отделом музеев Н.И. Троцкая получила следующее письмо Ильи Репина: «Близ гор. Витебска, Верховской волости в принадлежавшем мне имении «Здравнево» с 1892 г. я жил почти безвыездно более 10-ти лет, имея 130 десятин земли, с лесом, на берегу Западной Двины. Приспособляя, пристраивая к искусству живописи, которой всегда занимался и хозяйствовал все это время, давая заработок крестьянам соседних деревень.

Мастерская, башня, и проч. с росписью стен, камина еще несколько уцелели. Со времени нового правительства, дочь моя, Татьяна Ильинична Язева (рожд. Репина) с моей внучкой Татьяной Николаевной Диаконовой, преподают в школе, учрежденной в нашем доме и несут все повинности на 4-х десятинах земли, всего оставленных им для прокормления.

Иван Диаконов, женившийся на моей внучке, с ее матерью, работают сверх сил, личным трудом, чтобы как-нибудь не умереть с голода.

100 десятин я уступил дешево крестьянам, по их неотступной просьбе еще раньше. Теперь при усадьбе оставлено им 4-е десятины.

Прошу Отдел Музеев, не найдет ли он возможным охранять, под непосредственным ведением моей дочери Татьяны Ильиничны Репиной-Язевой, содействуя ей необходимым ремонтом, дома-школы, а также найти возможность прибавить им земли» [5, л. 285 и об.].

Спустя месяц, 5 июня Н.И. Троцкая посылает новое письмо в Витебский губисполком, в котором излагает содержание письма Репина и просит «обследовать при посредстве Ваших органов состояние дома художника и материальное состояние его семьи и в случае необходимости оказать семье мирового художника необходимое содействие» [5, л. 18 и об.]. Местные власти понимают буквально – нужно «помочь Репину» и спускают соответствующее указание уездному исполкому. Заместитель заведующего отделом управления уисполкома Герасименко, обнаруживая свою не осведомленность, 26 июня просит губисполком «сообщить местожительство такового [И. Репина – В.Ш.], в противном случае не представляется возможным произвести обследование его семейного и имущественного положения» [5, л. 16]. Секретарь Губисполкома в ответ сообщает: «Губисполкому адрес профессора Репина неизвестен, таковой можно узнать в УЗУ [уездном земельном управлении – В.Ш.]» [5, л. 15]. 16 июля Герасименко отправляет запрос в УЗУ. Резолюция на документе гласит: «Сам Репин находиться в Финляндии. Переписка о земле и постройках находится в Судебной комиссии. 17/VII-23» [5, л. 14].

28 июля ВитУЗУ возвращает в отдел управления Витуисполкома переписку на 6 листах и информирует, что семья – дочь и внучка, профессора живописи И. Репина проживают в имении Здравнево, Храповичской волости. Наконец, место нахождения здравневских страдальцев выяснено и следует резолюция: «Срочно направить Храповичскому ВИК для обследования и доставления материала президиуму со своим заключением. 31/VII» [5, л. 13]. Но волостной исполком не торопится и 12, а затем 14 октября следуют гневные письма секретариата Президиума Витуисполкома о немедленном проведении обследования дома И. Репина. Резолюция: «Т. Ивашеву. Срочно исполнить и дать объяснение, почему не исполнено 22/X с/г». Ответ – «За неимением времени, следует произвести обследование председ [ателю] сельсовета.

25/X 23 г.» [5, л. 11, 10]. 27 октября соответствующее распоряжение было послано председателю сельсовета [3, л. 112].

Наконец, спустя 7 месяцев после письма Н.И. Троцкой, 30 ноября 1923 года член Храповичского волисполкома С.И. Ивашнев, выехал в Здравнёво для проведения обследования. Составленный акт является важным документом для проведения реконструкции застройки усадьбы, в котором, что особенно ценно, помимо сведений о характере и состоянии построек, указываются их размеры [5, л. 8–9 об.].

11 декабря акт, вместе с сопроводительным письмом Храповичского волисполкома [5, л. 7], начал восхождение по бюрократической лестнице. Забавно, что в сопроводительных письмах сохранялась фраза – «переписка по поводу обследования семейного и имущественного положения профессора живописи Репина». И только в завершающем письме организационного отдела ВЦИК в отдел науки Наркомпроса от 17 января 1924 г. в машинопись от руки была внесена правка «<…> положения семьи профессора живописи Репина». Впрочем, и такая формулировка не вносила полной ясности, о какой семье идет речь [5, л. 3–6]. Материалы обследования были отосланы в отдел музеев «по принадлежности» и, как можно заключить из дальнейшего развития событий, ни каких мер по ремонту построек усадьбы предпринято не было. Семье Т.И. Репиной-Язевой удалось, в конце концов, решить только земельный вопрос, а новый дом для себя строить собственными силами.

Впереди семью Репиных-Дьяконовых ждали несколько относительно спокойных лет, прошедших в заботах о хозяйстве и детях и со своими маленькими семейными радостями. Но в 1929 г. началась новая волна репрессий по отношению к «бывшим» и только благодаря заступничеству А.В. Луначарского удалось избежать, казалось, неминуемого раскулачивания и выселения [8, с. 104–115]. В конце концов, близкие художника в июле 1930 г. покинули Здравнёво и выехали в Финляндию. К моменту отъезда главный дом усадьбы пришел в такое жалкое состояние, что его пришлось продать на дрова.


1. Витебский областной краеведческий музей. – Научный архив. – Ф. 3. – Д. 4.
2. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 56. – Оп. 1. – Д. 232.
3. ГАВО. – Ф. 94. – Оп. 1. – Д. 124.
4. ГАВО. – Ф. 1231. – Оп. 1. – Д. 52.
5. Государственный архив Российской Федерации. – Ф. А-2307. – Оп. 3. – Д. 297.
6. Кичина, Е.М. И.Е. Репин и Здравнёво. В обретении и разлуке / Е.М. Кичина. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – Витебск, 1994. – 112 с.
7. Научно-библиографический архив Российской Академии художеств. – Ф. 25. – Оп. 2. – Ед. хр. 424. – Л. 26–27. Письмо В.И. Репиной И.Е. Репину 24 июля 1921 г. В.И. Репина эмигрировала в Финляндию в апреле 1922 г.
8. Шышанаў, В. Невядомае Здраўнёва / В. Шышанаў // Віцебскі сшытак. – 2000. – №4. – С. 90–115.



**Давідоўская В.М.**


## АГЛЯД ФОТАДАКУМЕНТАЎ З ДАВАЕННАГА ЗБОРУ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ (1924–1941 гг.)

У зборы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (далей ВАКМ) калекцыя «Фотадакументы» з'яўляецца адной з самых інфармацыйна насычаных. Прадметам, якія ўваходзяць у яе склад, уласцівы адначасова і вобразна-выяўленчыя якасці, і дакументальнасць; яны не толькі маюць эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку, перадаючы інфармацыю зрокавым спосабам, але і ўтрымліваюць звесткі аб рэальных падзеях, фактах у жыцці людзей і грамадства, аб існаваўшых і існуючых прадметах, відах мясцовасцей, з'явах прыроды і г.д. У апошні час назіраецца павялічэнне ўвагі да фотадакументаў як з мэтай выкарыстання іх у навуковых даследаваннях, так і для

ўжывання ў экспазіцыйнай дзейнасці музея. Зразумела, перш чым выкарыстоўваць фотаздымкі ў якасці гістарычнай ці музейнай крыніцы, неабходна правесці атрыбуцыю гэтых прадметаў адпаведна патрабаванням музейнай навукі. Зыходзячы з вялікай колькасці прадметаў калекцыі «Фотадакументы» у зборы ВАКМ, з іх тэматычнай і жанравай разнастайнасці, а таксама з асаблівасцяў дзейнасці і развіцця музея ў цэлым, намі быў абраны шлях паэтапнага вывучэння фотадакументаў згодна храналагічнаму крытэрыю адпаведна паступленню іх ў музейныя фонды.

Агляд фотаздымкаў, якія ўвайшлі ў склад музейнага збору на пачатковым этапе яго стварэння і існавання (1919–1924 гг.), быў намі зроблены ў 2011 г. [4]. Як было вызначана, да 1924 г. у складзе музейнага фонду налічвалася 1070 фотаздымкаў, якія паступілі са збораў А.П. Сапунова, В.П. Федаровіча, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і Віцебскага царкоўна-археалагічнага старажытнасховішча. Да сённяшняга часу захавалася 59 фатаграфій.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца працяг вывучэння гісторыі фарміравання калекцыі «Фотадакументы», вызначэнне асаблівасцяў камплектавання і правядзенне атрыбуцыі прадметаў, трапіўшых у музейны збор на працягу 1924–1941 гг.

Пры выяўленні фотаздымкаў, якія паступілі ў музей за гэты час, узніклі пэўныя цяжкасці, звязаныя з адсутнасцю дакладных уліковых дакументаў адзначанага перыяду. Частка фотадакументаў выяўлена адпаведна «Кнізе паступленняў музейных экспанатаў Віцебскага аддзялення Беларускага Дзяржаўнага музею» [10]. Другая частка даваеннага збору ўстаноўлена дзякуючы захаваўшымся старым уліковым нумарам на фотаздымках, а таксама звесткам з асобных вопісаў і спісаў, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (ДАВО) і навуковым архіве ВАКМ. Т.ч., на сённяшні дзень удалося выявіць 49 фатаграфій, захаваўшыхся з даваеннага збору ВАКМ і паступіўшых у перыяд з 1924 па 1941 гг.

Асноўныя накірункі камплектавання музейных прадметаў у гэты час адпавядалі нарматыўным дакументам, якія тычыліся дзейнасці музея, а таксама існуючым аддзелам экспазіцыі. У 1925 г. у музеі былі выдзелены 4 аддзелы: гісторыка-археалагічны, прамыслова-эканамічны, аддзел мастацтва, этнаграфічны. Да 1930 года аддзел мастацтва параўтвораны ў куток малюнкаў, прамыслова-эканамічны – у аддзел сучаснай прамысловасці, з'явіліся грамадска-дзяржаўны аддзел, пададзел «Стары і новы Віцебск», антырэлігійны куток [11]. Да 1937 г. была створана новая экспазіцыя, якая складалася з аддзелаў старажытнай гісторыі, сярэднявяковай гісторыі, сацыялістычнага будаўніцтва і сталінскай канстытуцыі [12].

Безумоўна, рэарганізацыя аддзелаў музея і стварэнне новых экспазіцый не магло абыйсціся без выкарыстання фотаздымкаў. Згодна справаздачам і планам работы музея, у к. 1920-х – 1930-х гг. адбывалася вывучэнне фотаздымкаў і планавалася папаўненне музейных фондаў гэтымі прадметамі. У прыватнасці, «Перспектыўным планам працы Віцебскага беларускага дзяржаўнага музею на 4-гадовы адрэзак пяцігадовага плану 1928-29 – 1932-33» прадугледжвалася пашырэнне аддзелу мясцовай прамысловасці за кошт экспанатаў новых фабрык і заводаў Віцебшчыны, у т.л. фотаздымкаў, а таксама папаўненне створанага пададдзелу «Стары і новы Віцебск» фатаграфіямі, «характарызуючымі камунальную гаспадаркку і рост гораду ў разрэзе 5-гадовага плану» [5; с. 64].

Крыніцы папаўнення калекцыі фотаздымкаў у 1924–1941 гг. былі розныя: спецыяльна арганізаваныя выставы дасягненняў прамысловасці і сельскай гаспадаркі Віцебшчыны, паступленні ад прыватных асоб і прадстаўнікоў розных устаноў і арганізацый Віцебска і акругі.

Зыходзячы з тэматычнай разнастайнасці фатаграфій, захаваўшыхся з даваеннага збору ВАКМ, іх можна раздзяліць на некалькі груп. Сярод апошніх выдзяляецца

найперш група фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць развіццё прамысловасці Віцебшчыны. Асноўнай крыніцай паступлення гэтых прадметаў былі выставы, якія ладзіліся пры непасрэдным удзеле музея. У траўні 1925 г. пасля выставы, арганізаванай для 1-га Акруговага з'езду саветаў Віцебшчыны, у фонды музея былі перададзены прадметы фабрычна-завадской прамысловасці Віцебскай акругі ў ліку 605 экспанатаў і 162 дыяграм [2]. 86 з іх – фатаграфіі з выявамі знешняга выгляду, розных аддзяленняў і вырабаў віцебскіх прадпрыемстваў: піваварнага завода, алейнага завода, іголкавай фабрыкі, дзяржаўнай фабрыкі акуляраў, а таксама здымкі Лужаснянскай сельскагаспадарчай школы і яе гаспадарства [10]. Да сённяшняга часу ні адзін здымак не захаваўся.

Пасля правядзення ў 1927 г. юбілейнай выставы, прысвечанай 10-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, у фонды музея паступілі здымкі з выявамі віцебскіх фабрык–акулярнай, абутковай, швейнай «Прафінтэрн», папяровай «Чырвоная зорка», ільнопрадзільнай «Дзвіна» – агульнай колькасцю 35 адзінак [7; 8]. Да гэтага часу захаваліся дзве фатаграфіі: «Адзін з цэхаў ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна»» (зараз ААТ «Віцебскія дываны») і «Адзяленне па вырабу цвікоў абутковай фабрыкі імя Лекерта» (зараз існуе як ААТ «Чырвоны кастрычнік»). Выявы ўнутраных памяшканняў вышэйназваных фабрык могуць быць выкарыстаны ў якасці крыніцы пры вывучэнні тэхнічнага абсталявання прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці БССР у 1920-х гг.

У калекцыі «Фотадакументы» ВАКМ выяўлена яшчэ 8 здымкаў з даваеннага збору, якія характарызуюць развіццё прамысловасці Віцебшчыны. Два з іх былі зроблены ў цэхах завода «Чырвоны металіст» (зараз ААТ «Вістан»), адзін – у цэху скуранога завода імя Еўсцігнеева (зараз Віцебскі мехавы камбінат). На іншых здымках – агульны від ільнопрадзільнай фабрыкі ў м. Высачаны (дзейнічала да 1941 г.), ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна» у Віцебску, агульны від аднаго з будынкаў віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната (існаваў да 1941 г.), будаўніцтва цаглянага завода ў раёне Гутараўшчына (зараз на гэтым месцы студэнцкі гарадок акадэміі ветэрынарнай медыцыны, завод шляхам пераўтварэнняў існуе як ААТ «Кераміка»), працоўная арцель «Картанаж». Фатаграфіі датуюцца 1930-мі гг. Нягледзячы на тое, што адсутнічаюць дакладныя звесткі пра крыніцы іх паходжання, не ўстаноўлены імёны фатографаў, здымкі маюць дастатковую інфарматыўную насычанасць і значна пашыраюць крыніцазнаўчую базу даследаванняў, звязаных з развіццём прамысловасці Віцебшчыны.

Пэўная частка фотаздымкаў з даваеннага збору музея прысвечана грамадска-палітычнаму жыццю Віцебска. Перыяд 1920–1929 гг. прадстаўлены фатаграфіямі з выявай савецкіх святаў–1-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебску ў 1918 г., дэманстрацыі ў гонар гэтай падзеі ў 1920 г. Два здымкі зроблены ў 1929 г. падчас святкавання Дня кааперацыі: фатограф Окунеў занатаваў масавы мітынг на плошчы Свабоды ў Віцебску. Гэты ж фотамайстар прысутнічаў на старце велапрабегу Віцебск–Мінск 28 ліпеня 1929 г., аб чым сведчыць здымак з выявай удзельнікаў масавага спартыўнага мерапрыемства.

На некалькіх фатаграфіях з музейнай калекцыі адлюстраваны суботнікі, якія адбыліся ў 1920-х гг. па ачыстцы двара яўрэйскай бальніцы (зараз станцыя хуткай медыцынскай дапамогі) і ў садзе імя Свердлава (зараз парк культуры і адпачынку чыгуначнікаў). У пачатку 1920-х гг. у Віцебску, як і ў іншых гарадах Беларусі, праводзіліся «тыдні працоўнага фронту», «тыдні дапамогі фронту і транспарту». Падчас аднаго з падобных мерапрыемстваў у 1920 г. быў зроблены здымак з выявай работ па разгрузцы вагонаў з дровамі на чыгуначнай станцыі «Віцебск». Вышэйпералічаныя фатаграфіі павінны былі сведчыць аб самаахвярнай працы,

неабходнай для абароны заваёў рэвалюцыі і стварэння новага грамадства, аб адданасці ідэалам камунізму.

Занатаваныя на фотаздымках масавыя мерапрыемствы знаходзілі адбітак у газетных рэпартажах; пасля іх правядзення ладзіліся выставы, якія часта арганізоўвалі супрацоўнікі фатаграфічных устаноў горада. Напрыклад, з дакладной запіскі аб дзейнасці віцебскай 1-й Дзяржаўнай фатаграфіі вядома, што ў 1920 г. былі «произведены съёмки наиболее выдающихся моментов общественно-политической и военной жизни г. Витебска (съезды, конференции, отправка на фронт, демонстрации и проч.); устроены витрины для выставки произведенных снимков», а таксама выкананы здымкі, якія мелі дачыненне да рэвалюцыйнага руху і «изображающие моменты всех форм производства и строительства новой жизни в Витебской губернии» [6]. Можна меркаваць, што многія здымкі 1920-х гг. (у тым ліку тыя, што захаваліся ў музеі) былі выкананы ў 1-ай Дзяржаўнай фатаграфіі. Яна працавала ў Віцебску з 1919 г. Фатаграфаваннем розных грамадска-палітычных, культурна-масавых і іншых падзей таксама займаліся фатаграфія «Белдзяржкіно» (адкрыта ў 1924 г.) і арцель «Фототруд» (існавала ў 1930-х гг.). Здымкі гэтых устаноў таксама прысутнічаюць у музейнай калекцыі.

Яшчэ адна група захаваўшыхся фатаграфій (10 адзінак) прысвечана сельскай гаспадарцы. Здымкі былі зроблены ў калгасах Віцебскай акругі і датуюцца 1930-мі гг. Развіццё сельскай гаспадаркі было адным з важных накірункаў дзейнасці дзяржавы ў той перыяд. Хуткія тэмпы калектывізацыі, арганізацыя калгасаў і саўгасаў, дасягненні і поспехі ў іх дзейнасці не маглі застацца па-за ўвагай фатографаў і па-за межамі музейнай калекцыі. На захаваўшыхся здымках – конезавод, сіласная вежа і кухня калгаса «1 мая» Старасельскага сельсавета; скотны двор аднайменнага калгаса Бараўлянскага сельсавета. Невядомы аўтар сфатаграфаваў правядзенне інструктажу брыгадзіраў у калгасе «Бяроза» Вялікалятчанскага сельсавета, працэс даення кароў у калгасе «Страх ворагам» Старасельскага сельсавета і іншыя моманты працы і побыту калгаснікаў. На чатырох фатаграфіях маюцца штампы Віцебскага дзяржаўнага культурна-гістарычнага музея, на шасці–штамп фотастудыі «Белдзяржкіно», у якой былі зроблены здымкі (магчыма, па заказе музея).

Асобную групу складаюць здымкі з выявамі помнікаў і памятных месцаў, звязаных з архітэктурай Беларусі і ваеннымі падзеямі розных часоў на тэрыторыі нашай краіны. На фатаграфіях – помнік героям Айчыннай вайны 1812 г. у Віцебску; «французскі вал» і помнік У.І. Леніну ў Полацку; адзіночныя і брацкія могілкі партызан, загінуўшых у 1918 г. у барацьбе з нямецкімі акупантамі на тэрыторыі Аршанскага і Лепельскага паветаў; помнік у мяст. Бачэйкава на брацкай магіле 22 чырвонаармейцаў, загінуўшых у баях з белапалякамі ў снежні 1919 і студзені 1920 гг.; магіла камісара зямельнага аддзела па Высачанскай воласці Віцебскага павета П.М. Наследнікава, забітага ў 1918 г. кулакамі.

На васьмі фатаграфіях маюцца анатацыі: цытуюцца надпісы, зробленыя на помніках, падаюцца звесткі пра прозвішчы загінуўшых, якія ўдалося ўстанавіць, а таксама падаюцца спасылкі на працу Ю. Віцьбіча «Памятники революции, старины и искусства, взятые на учет правительственной научной экспедицией». Вядома, што падобныя экспедыцыі былі арганізаваны ў 1939 г. у розных рэгіёнах Беларусі. Адным з членаў Віцебскай экспедыцыі быў пісьменнік, грамадскі дзеяч Юрка Віцьбіч [1]. Для апісання помнікаў даўніны і мастацтва была распрацавана спецыяльная анкета, адным з пунктаў якой значылася «Фіксацыя аб’екту (планы, замалёўкі, здымкі)» [3]. Т.ч., анатацыі на здымках з музейнай калекцыі даюць падставу меркаваць, што яны з’яўляюцца часткай фотатэкі помнікаў, якая была складзена падчас работы экспедыцыі. Многія фатаграфіі існавалі ў некалькіх экзэмплярах, і некаторыя з іх (а магчыма, і ўсе)

пасля заканчэння экспедыцыі былі перададзены ў музей. На сённяшні дзень такіх фотаздымкаў выяўлена толькі 10.

Асобна хацелася б вылучыць фатаграфію з выявай палаца ў в. Бачэйкава. Апісанне гэтага помніка архітэктуры адпаведна ўсім пунктам анкеты ўтрымліваецца ў «Матэрыялах віцебскай навуковай экспедыцыі 1939 г.», апублікаваных у часопісе «ARCHE» (№ 4 за 2009 г.). Верагодная дата здымка – 1939 г., аўтар невядомы. Ю. Віцьбіч занатаваў у «Матэрыялах» кароткую гісторыю помніка, інфармацыю аб даце яго пабудовы і месцы знаходжання, аб функцыянальным прызначэнні і асобах, звязаных з палацам, і іншыя звесткі. У анкеце адзначаецца, што «дом цікавы як маёнтак памешчыка, як архітэктурны помнік, пабудаваны ў 1769 г. у стылі ракако… Экспедыцыя прапануе захаваць яго ад запланаванай на 1940 г. перабудовы і надбудоваў», а «парк настолькі цікавы, што заслугоўвае ўвагі спецыялістаў і павінен быць абаронены ад цалкам магчымых вырубак». Таксама ў анкеце пазначана, што маюцца два фотаздымкі палаца ў Бачэйкаве [3, с. 131]. Атрымліваецца, што адзін фотаздымак зараз знаходзіцца ў музеі, другі – у царкоўным архіве храма Св. Еўфрасінні Полацкай (г. Саўт-Рывер, ЗША), дзе пасля смерці Ю. Віцьбіча ў 1975 г. захоўваецца ўвесь яго ўласны архіў, у тым ліку частка матэрыялаў віцебскай навуковай экспедыцыі 1939 г. Дарэчы, сярод гэтых дакументаў маюцца фотаздымкі і анкетныя лісты з апісаннем помнікаў і памятных месцаў, якія знаходзяцца ў Віцебску, Полацку, Смалянах, Копысі, Бешанковічах, Оршы і іншых населеных пунктах. Не даючы адзнаку Ю. Віцьбічу як асобе, хацелася б заўважыць значнасць працы, якую зрабілі члены навуковай экспедыцыі па апісанні помнікаў архітэктуры і помнікаў, звязанных з ваеннымі падзеямі, і падкрэсліць несумненна вялікую краязнаўчую каштоўнасць гэтых матэрыялаў.

Заслугоўваюць увагі здымкі з выявамі Віцебска рознага перыяду. З тых, што паступілі ў даваенны час, захавалася няшмат. Дакладна вядома, што ў 1927 г. з Віцебскага гарадскога камунальнага аддзелу ў музей былі перададзены 75 фатаграфічных здымкаў з выявамі грамадзянскіх работ па плану 1925/26 гг. [10]. На жаль, гэтыя здымкі не захаваліся, адсутнічае нават іх апісанне. Дастатковай інфарматыўнасцю і экспрэсіўнасцю валодаюць фатаграфіі «Вароты яўрэйскіх могілак у 2-ой частцы Віцебска» (1920-я гг.), «Нікольская набярэжная» (1920-я гг.), «Паводка ў Віцебску» (1929 г.). Асобнае месца займае здымак «Панарама левага берага Зах. Дзвіны». Зроблены невядомым аўтарам у 1860-х гг. (да 1868 г.), ён з'яўляецца адным з самых ранніх з выявай Віцебска. Фатаграфія ўтрымлівае інфармацыю адразу пра некалькі культавых пабудоў розных канфесій, змешчаных на невялікай прасторы, а таксама пра забудову 2-ой часткі Віцебска. На здымку выразна бачны фарны касцёл XVIII ст., Дабравешчанская царква XII ст., пачатак вул. Замкавай, касцёл Св. Міхаіла (дамініканскі касцёл) XVIII ст., Харальная сінагога XIX ст. Усе гэтыя пабудовы былі разбураны ў розныя часы, вул. Замкавая да сённяшняга часу змяніла свой напрамак. Фотаздымак – неацэнная крыніца для вывучэння горадабудаўніцтва і архітэктуры апошняй трэці XIX ст.

Трэба адзначыць, што згаданая вышэй фатаграфія паступіла ў музейны збор у 1925 г. ад старшыні секцыі светазнаўства Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства (ВАТК) Б.М. Сямеўскага. У 1924–1932 гг. музей вельмі цесна ўзаемадзейнічаў з ВАТК, сябрамі гэтай арганізацыі былі супрацоўнікі музея Я.І. Васілевіч, У.Г. Краснянскі, В.В. Дабравольскі, А.Р. Брадоўскі і інш. Адной з агульных спраў ВАТК і музея было захаванне віцебскай царквы Св. Тройцы на Пескаватыку. На жаль, будынак выратаваць не ўдалося – у 1928 г. ён быў разабраны. У музей былі перададзены прадметы рэлігійнага культу, якія знаходзіліся ў царкве, а таксама два здымкі з выявай руін храма, зробленыя падчас яго агляду камісіяй пасля

абвалу (не захаваліся). На сённяшні дзень у зборы музея маецца фатаграфія з выявай царквы Св. Троіцы, якая датуецца 1920–1927 гг. Яна паступіла ў 1929 г. ад старшыні Полацкага акруговага таварыства краязнаўства С. Мялешкі, аб чым сведчыць даравальны надпіс на адваротным баку здымка. Тут жа змешчана прозвішча фатографа – А. Жудро. На здымку – частка інтэр'еру храма (левы бок) з выразна бачнымі дэталямі ўнутранага ўбранства, з фрагментам іканастаса.

Такім чынам, з даваеннага збору музея да сённяшняга часу захавалася 108 фатаграфій, у тым ліку 49 – якія паступілі з 1924 па 1941 гг. Невялікая колькасць гэтых музейных прадметаў кампенсуецца ўласцівымі ім экспрэсіўнасцю і эмацыянальнасцю. Тэматычная рознабаковасць і інфармацыйная насычанасць дазваляюць выкарыстоўваць іх пры вывучэнні развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі Віцебшчыны, асаблівасцяў грамадска-палітычнага жыцця, архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебска. Фотадакументы нароўні з іншымі крыніцамі ўдзельнічаюць у пашырэнні крыніцазнаўчай базы, вывучэнне іх дае больш магчымасцяў для выкарыстання ў навуковых даследаваннях і экспазіцыйнай дзейнасці музея.


1. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 4: Варанецкі – Гальфстрым / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1997. – С. 237.
2. Васілевіч, Я. Віцебскі Дзяржаўны культурна-гістарычны музей / Я. Васілевіч // Віцебшчына: неперыядычны зборнік Віц. Акруговага Тав-ва Краязнаўства. Том II. – Віцебск, 1928. – С. 197–203.
3. Віцьбіч, Ю. Нататкі краязнаўца / Ю. Віцьбіч // Arche. – 2009. – № 4. – С. 81–134.
4. Давидовская, О.Н. Пути формирования коллекции фотодокументов Витебского областного краеведческогго музея (1919–1924) / О.Н. Давидовская // Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі : матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 450-годдзю віцебскага гарадскога права і 100-годдзю выдання першай кнігі зборніка «Полоцко-Витебская старина», Віцебск, 6-7 кастрычніка 2011 г. / Віц. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.М. Дулаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2011. – С. 291–295.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1947. – Воп. 1. – Спр. 24.
6. ДАВВ. – Ф. 2268. – Воп. 3.
7. Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ВАКМ). – Ф. 11. – Спр. 9.
8. Навуковы архіў ВАКМ. – Ф. 11. – Спр. 11.
9. Навуковы архіў ВАКМ. – Ф. 11. – Спр. 12.
10. Навуковы архіў ВАКМ. – Ф. 17. – Спр. 2.
11. Навуковы архіў ВАКМ. – Ф. 42. – Спр. 1.
12. Навуковы архіў ВАКМ. – Ф. 938. – Спр. 1.



**Алиева Л.В.**


## КОРПУС ИСТОЧНИКОВ ПО ИСТОРИИ КРЕСТЬЯНСКОЙ ПОЗЕМЕЛЬНОЙ ОБЩИНЫ СЕВЕРО-ЗАПАДА РОССИИ 1920-х гг*.

История крестьянской поземельной общины Северо-Запада России в 1920-е гг., одного из важнейших субъектов региональных аграрных отношений, может быть изучена на основе комплекса различных источников, большая часть которых представлена в архивах изучаемого региона: Государственном архиве Псковской области, Государственном архиве новейшей истории Псковской области, Государственном архиве Новгородской области, Государственном архиве новейшей истории Новгородской области, Центральном государственном архиве г. Санкт-Петербурга, Центрального государственного архива историко-политических документов г. Санкт-Петербурга и др.


* Работа подготовлена при финансовой поддержке Российского гуманитарного научного фонда грант № 12-11-60008 и Государственного комитета Псковской области по культуре.

В первую очередь, к характеризуемому корпусу источников следует отнести директивные акты руководящих органов партии и инструктивную документацию партийного аппарата, позволяющие оценить характер партийно-политических установок в отношении крестьянской общины рассматриваемого периода.

Вторую группу источников составляют в основном опубликованные нормативно-правовые документы, законодательные акты, документы и материалы государственных и народнохозяйственных органов и учреждений: ВЦИК и СНК РСФСР и СССР, комиссариатов земледелия и продовольствия, Центрального отдела землеустройства народного комиссариата земледелия РСФСР и др., которые позволяют получить представление о формировании аграрного курса правительства и государства, определить основные направления политики в отношении крестьянской поземельной общины и ее преломление на региональном уровне.

Следующая группа источников представлена делопроизводственными документами органов власти, партийных структур, снабженческих, заготовительных организаций, налоговых, плановых и земельных органов. Документы данной группы преимущественно не опубликованы, что несколько затрудняет работу с ними, но вместе с тем, они позволяют выявить общие тенденции развития крестьянской поземельной общины в 1920-е гг.

В отдельную группу следует выделить различные статистико-экономические материалы, которые, несмотря на справедливую критику в свой адрес, позволяют получить представление об уровне дифференциации крестьянских дворов в крестьянской поземельной общине.

Пятая группа источников состоит из материалов периодической печати, которые позволяют раскрывать социально-политические аспекты жизни крестьянской поземельной организации.

Наиболее четкое, на наш взгляд, представление об управлении и общественной жизни общины дают мирские приговоры, содержащие решения мирских сходов. Мирской приговор – это скрепленное личными подписями письменное решение крестьянского схода, носящее публично-правовой характер. Мирские приговоры 1920-х гг. по своему формуляру, как правило, состояли из трех частей: 1) преамбулы, в которой указывались дата и место созыва схода, часто поименный состав участников; 2) основной части, с указанием причины созыва схода и обсуждаемых вопросов; 3) результативной, содержащей формулировку решений. Приговор скреплялся подписями участников схода и составителей документа.

Ценность приговоров как источников состоит в том, что по ним, на основании перечня участвовавших в сходе и поставленных подписей, можно определить представительность сходки, по формулировкам их основной части и заключений выявляется круг вопросов, традиционно решаемых на сходах, а также типичность их решения, т.е. правовые нормы и их обоснование. Кроме того, при наличии наиболее полных (в идеале – годовых) комплектов приговоров возможно также выявление повседневных функций мирского схода. В ходе революции и войны архивы Северо-Запада России сильно пострадали, поэтому книг приговоров сохранилось относительно немного, что не позволяет рассмотреть в целом жизнедеятельность каждой отдельной общины. Однако и на имеющемся материале можно выявить основные тенденции развития мирской организации крестьян в изучаемый период времени.

Как правило, по своему формуляру приговоры состояли из трех частей:

1. Преамбулы, в которой указывались дата, место созыва схода, часто поименный состав участников. Например, «*Мы нижеподписавшиеся граждане Псковской губернии и уезда Жуковской волости Подвяского общества деревни Церковщины входящий состав в Подвяского общества сельсовета пользующей землей через полосна. Собравшиеся сего*

*числа* $25^{го}$ *Марта. Под председательством председателя Сельсовета тов. Петрова на сельском сходи в числе 15 человек…»* [2, л. 4 – 5].

2. Основной части, с указанием причины созыва схода и обсуждаемых вопросов: *«Выслушав объяснения уполномоченного нашего по земельным делам о недовольстве некоторых граждан существующим у нас распределением земли принимая во внимание неудобства пользования землею при существующей мелкополосице и устарелую форму полеводства, обсудив все преимущества перехода к улучшенным формам землепользования большинством голосов ЕДИНОГЛАСНО против — не согласившихся постановили…»* [4, л. 5 – 6].

3. Результативной части, содержащей формулировку решений: «*…мы, две семьи, составляющие более, чем 1/5 часть всех домохозяев селения имеем право получить причитающуюся нам долю земли из селения в одном месте»* [1, л. 20].

4. В конце приговора – подписи присутствовавших на сходе или выбранных уполномоченных, подпись и печать сельского старосты: «*Означенный приговор вступает в законную силу по зарегистрированию его в Волостном Исполкоме, на основании ст. 120 Земельного Кодекса или в Уездном Земельном Управлении на основании ст. 140 Зем. Код.*

*К сему подписуемся: (подписи) Г. Краснов, В. Назаров, П. Петров, И. Власов, А. Краснов…»* [3, л. 39 – 40].

Поскольку приговоры составлялись сельским сходом – органом крестьянского самоуправления – и являлись проявлением инициативы «снизу», то они, бесспорно, отражают общее настроение сельского населения, показывая, чем жила деревня в указанный период времени. Информация, содержащаяся в приговорах, не противоречила крестьянскому мышлению хотя бы потому, что крестьяне никогда не подписывали те приговоры, в которых что-либо было им непонятно. Участникам схода важно было, чтобы в приговоре фигурировало лишь то, что отвечало их чаяниям.

В целом приговоры являются универсальным источником. Содержание приговоров дает практически полное представление о жизни и быте крестьян северо-западной деревни 1920-х гг., их нуждах, мечтах, восприятии крестьянами окружающей их социальной действительности, суждениях крестьян о своем месте в обществе, их представлениях об идеальном порядке в России.

С различной степенью полноты приговоры раскрывают экономическое и социально-политическое положение крестьянских масс, многообразие конфликтных зон повседневной действительности, конкретные причины и поводы для народного недовольства и протеста, социальной агрессивности. Содержание большинства документов является комплексным; в них сочетается политическое и экономическое, общественное и бытовое, всероссийское и местное, революционное и мирное. Приговоры выявляют крестьянский кругозор, поскольку в них объективизировалось общественное сознание и настроение российского крестьянства.

Комплексное использование вышеперечисленных, а также иных групп источников, дает возможность определить базисные детерминанты развития крестьянской общинной организации в указанном регионе в 20-е гг. XX в. и провести комплексную историко-научную реконструкцию ее бытия.

1. Государственный архив Псковской области (ГАПО). – Ф. Р-203. – Оп. 1. – Д. 28.
2. ГАПО. – Ф. Р-203. – Оп. 1. – Д. 63.
3. ГАПО. – Ф. Р-203. – Оп. 1. – Д. 293.
4. ГАПО. – Ф. Р-203. – Оп. 1. – Д. 295.

**Карпекін К.Р.**

# СТАН АРХІВАЎ ІЎДЗЕЙСКІХ МЕТРЫЧНЫХ КНІГ У БЕЛАРУСІ Ў 1917–1929 гг.

Рэлігійныя абшчыны, якія дзейнічалі на тэрыторыі Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стст., не толькі задавальнялі духоўныя патрэбы вернікаў, але і выконвалі шэраг грамадскіх функцый. Адной з іх з'яўлялася вядзенне метрычных запісаў, на аснове якіх органы дзяржаўнай улады адсочвалі дэмаграфічную статыстыку. Іўдзейскія абшчыны беларуска-літоўскіх губерняў не былі выключэннем: згодна з "Палажэннем аб яўрэях", прынятым у 1835 г., на рабінаў – кіраўнікоў рэлігійных аб'яднанняў – ускладаўся абавязак па вядзенні метрычных кніг з адлюстраваннем фактаў нараджэнняў, шлюбаў, разводаў і смерцяў членаў абшчын [12, с. 139].

Пасля ўсталявання савецкай улады ў кастрычніку 1917 г. і аддзялення царквы ад дзяржавы ў студзені 1918 г. урады савецкіх рэспублік пачалі ажыццяўляць мерапрыемствы па змяншэнні ролі рэлігійных абшчын у грамадстве, якія закранулі справу вядзення метрычных запісаў.

У цяперашні час указаныя метрычныя кнігі з'яўляюцца важнымі дакументальнымі крыніцамі, якія можна шырока выкарыстоўваць для гістарычных даследаванняў і генеалагічных пошукаў. З улікам таго, што ў канцы XIX ст. іўдзеі складалі 13,5% вернікаў беларуска-літоўскіх губерняў, іх метрычныя архівы складалі значную долю сярод агульнага комплексу метрычных запісаў. Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць стан іўдзейскіх архіваў Беларусі ў перыяд першых мерапрыемстваў савецкай улады.

Пытанне пра новы парадак вядзення метрычных запісаў было закранута ўжо ў першых заканадаўчых актах, прынятых урадамі савецкіх рэспублік. У прыватнасці, згодна з дэкрэтам УЦВК і СНК РСФСР "Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў стану" ад 18 снежня 1917 г., усе рэлігійныя інстытуты, якія да гэтага былі адказнымі за ўнясенне запісаў пра нараджэнні, шлюбы і смерці ў спецыяльныя кнігі, абавязаны былі перадаць іх для захавання ў адпаведныя павятовыя і валасныя органы ўлады [1, с. 249]. У дэкрэце СНК РСФСР "Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных грамадах", які ўступіў у сілу 20 студзеня 1918 г., было дакладна ўказана, што акты грамадзянскага стану павінны весціся "выключна грамадзянскай уладай, аддзеламі запісу шлюбаў і нараджэнняў" [1, с. 372].

Пасля абвяшчэння БССР 1 студзеня 1919 г. і прыняцця СНК БССР дэкрэта "Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы" 11 студзеня 1922 г. аналагічны парадак усталяваўся і на тэрыторыі новаўтворанай рэспублікі [12, с. 156]. Згодна з цыркулярам НКУС и НКЮ БССР ад 26 жніўня 1922 г., рэгістрацыя актаў дакладна размяжоўвалася на афіцыйную частку, якая была перададзена ў веданне органаў савецкай улады, і культавую, якая засталася ў кампетэнцыі рэлігійных служыцеляў (яны мелі права выконваць усе абрады, звязаныя з нараджэннем, заключэннем шлюбу, разводам, пахаваннем, але выключна пасля іх рэгістрацыі ў пададдзеле ЗАГС) [14, с. 17].

Нягледзячы на дадзеныя нарматыўныя дакументы, органамі ўлады не былі прыняты належныя меры па стварэнні ў структуры выканаўчых камітэтаў пададдзелаў ЗАГС. На тэрыторыі Беларусі яны пачалі функцыянаваць з 1919 г. (у некаторых рэгіёнах – пазней). Акрамя таго, у 1919–1921 гг. ішла савецка-польская вайна, якая значна замаруджвала мерапрыемствы савецкай улады.

Па ўказаных прычынах многія рэлігійныя абшчыны, у тым ліку іўдзейскія, працягвалі весці метрычныя кнігі нават пасля прыняцця ўказаных вышэй заканадаўчых актаў. У прыватнасці, у 1918 г. рэгістрацыю нараджэнняў, шлюбаў, разводаў і смерцяў ажыццяўлялі рабіны Узды, Сянна, Гомеля, у 1918–1919 гг. – рабіны Бабруйска [13].

Савецкая ўлада была вымушана прызнаць такое становішча: 7 верасня 1921 г. Цэнтральны аддзел ЗАГС пры Народным камісарыяце унутраных спраў РСФСР выдаў цыркуляр, згодна з якім метрычныя кнігі, што вяліся рэлігійнымі служыцелямі той ці іншай мясцовасці да з'яўлення там пададдзела ЗАГС (незалежна ад часу з'яўлення), мелі юрыдычную сілу і на падставе іх магчыма было выдаваць афіцыйныя даведкі [7, арк. 3].

Адначасова савецкі ўрад прымаў захады па канцэнтрацыі метрычных кніг рэлігійных абшчын у архівах органаў улады. Пра парадак указанага мерапрыемства магчыма меркаваць па цыркуляры аддзела кіравання Віцебскага губернскага выканаўчага камітэта ад 30 жніўня 1921 г. У прыватнасці, выяўленнем метрычных кніг у малітоўных будынках займаліся пададдзелы ЗАГС павятовых, гарадскіх, местачковых і валасных выканкамаў. У іх жа абавязкі ўваходзіла арганізацыя вывазу метрычных кніг: капійных асобнікаў – ва ўласныя архівы, а арыгіналаў – у архівы пададдзелаў ЗАГС губвыканкама. Выманню з культавых будынкаў падлягалі ў першую чаргу дакументы за 1863–1917 гг. Пры выяўленні кніг за больш ранні перыяд іх арыгіналы і копіі неабходна было перадаць губернскаму ўпаўнаважанаму Галоўнага ўпраўлення архіўнай справы. Згаданы цыркуляр прадпісваў захоўваць архівы метрычных кніг у асобных, бяспечных памяшканнях, весці іх строгі ўлік. Установы і насельніцтва мелі права звяртацца ў пададдзелы ЗАГС па даведкі, пры гэтым прыватныя асобы маглі атрымаць толькі па адной выпісцы пра сваё нараджэнне, шлюб і развод. Для паўторнага атрымання даведкі неабходна было прадаставіць пісьмовае хадайніцтва з тлумачэннем, для чаго яна патрэбна. Выключэнне складалі толькі выпіскі пра нараджэнне мужчын, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту: дазвалялася бесперашкодна атрымаць любую колькасць даведак для прадстаўлення іх у ваенныя ўстановы [7, арк. 5].

У першыя паслярэвалюцыйныя гады працэс перадачы метрычных кніг ад іўдзейскіх абшчын органам савецкай улады праходзіў дастаткова складана. Напрыклад, Латыгаўскі валвыканкам у 1919–1920 гг. быў не ў стане арганізаваць ні канцэнтрацыю ў сябе копій метрычных кніг, ні перадачу іх арыгіналаў пададдзелу ЗАГС Магілёўскага губвыканкама [11, арк. 4, 5, 7, 10].

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, да пачатку 1920-х гг. мясцовымі органамі ўлады была сабрана значная колькасць метрычных кніг, канфіскаваных з сінагог і іўдзейскіх малітоўных дамоў. Напрыклад, у 1921 г. у пададдзеле ЗАГС Чашніцкага местачковага выканкама захоўваліся метрычныя кнігі Чашніцкіх сінагог [7, арк. 9–9 адв.], у Лепельскім павятовым выканкаме – архівы сінагог Лепеля, Бешанковічаў, Улы, Ушачаў, Кублічаў, Каменя, Бачэйкава, Бабінічаў, Пышна і Арэхава [8, арк. 12]. Да 1922 г. Красналуцкі і Зембінскі валвыканкамы завяршылі перавозку да сябе архіваў адпаведных іўдзейскіх абшчын [10, арк. 315]. Як бачна з прыведзеных фактаў, справа арганізацыі архіваў з метрычных кніг была наладжана недасканала: на практыцы не існавала дакладнага размежавання, у выканкаме якога ўзроўню павінны захоўвацца метрычныя кнігі. У сваю чаргу гэта выклікала ў насельніцтва цяжкасці пры запатрабаванні даведак, бо незаўсёды было зразумела, у які менавіта пададдзел ЗАГС неабходна звяртацца – местачковы, валасны ці павятовы.

Яшчэ адной асаблівасцю метрычных архіваў Беларусі ў пачатку 1920-х гг. было тое, што перадача ў Галоўныя ўпраўленні архіўнай справы дакументаў да 1863 г. была наладжана не ва ўсіх рэгіёнах. Напрыклад, што тычыцца Дрысенскага павета, то да снежня 1921 г. кнігі азначанага храналагічнага перыяду былі перададзены ва ўпраўленне толькі адным валвыканкамам [5, арк. 14]. У Астровенскім валвыканкаме іўдзейскія метрычныя кнігі за перыяд з 1843 г. захоўваліся да моманту ліквідацыі гэтага органа мясцовай улады ў 1924 г. [2, арк. 34].

З увядзеннем у 1924 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР на акругі, раёны і сельскія саветы пачало назірацца пэўнае ўпарадкаванне архіваў

мясцовых органаў улады, у тым ліку той іх часткі, якая складалася з метрычных кніг. У прыватнасці, адбылася іх канцэнтрацыя ў раённых выканаўчых камітэтах. Так, 21 жніўня 1924 г. пададдзел ЗАГС Бешанковіцкага валвыканкама перадаў аднайменнаму райвыканкаму 25 іўдзейскіх метрычных кніг, якія вяліся ў сінагогах Бешанковічаў [3, арк. 70–74 адв.]. 18–20 лістапада 1925 г. Барысаўскі акруговы выканкам накіраваў райвыканкамам для далейшага захоўвання шэраг метрычных кніг, якія да гэтага знаходзіліся ў яго веданні. Так, у архіў Бялыніцкага райвыканкама паступіла 2 кнігі за 1918 г. іўдзейскай абшчыны Эсьмонаў, у Халопеніцкі райвыканкам – 3 кнігі (пра нараджэнні і шлюбы за 1917 г., пра разводы за 1918 г.) абшчыны Халопенічаў, у Плешчаніцкі райвыканкам – 2 кнігі абшчыны Плешчаніцаў (пра нараджэнні і шлюбы за 1891 г.), у Зембінскі райвыканкам – 3 кнігі абшчыны Зембіна (пра нараджэнні за 1918 г., пра шлюбы за 1891 г. і 1917 г.), у Лагойскі райвыканкам – 5 кніг абшчыны Лагойска (пра нараджэнні і шлюбы за 1891 г., пра разводы за 1891 г. і 1918 г., пра смерці за 1917 г.), у Смалявіцкі райвыканкам–2 кнігі абшчыны Смалявічаў (пра нараджэнні і шлюбы за 1918 г.) [9, арк. 16–21].

У канцы 1920-х гг. адбылося чарговае ўпарадкаванне метрычных архіваў: з мэтай больш зручнага карыстання яны былі перададзены з райвыканкамаў у сельскія саветы (калі ў горадзе ці мястэчку функцыянавалі яўрэйскія нацыянальныя саветы, то іўдзейскія метрычныя кнігі перадаваліся менавіта ім). Напрыклад, 13 сакавіка 1929 г. з пададдзела ЗАГС Высачанскага райвыканкама метрычныя кнігі Бабінавіцкай іўдзейскай абшчыны былі перададзены ў Бабінавіцкі сельскі савет [6, арк. 32–32 адв.]. Аналагічныя захады ажыццявіў Лёзненскі райвыканкам: архівы Лёзненскай, Калышанскай і Дабрамыслінскай абшчын былі здадзены на захаванне адпаведна Лёзненскаму местачковаму, Калышанскаму нацыянальнаму яўрэйскаму і Дабрамыслінскаму сельскаму саветам [4, арк. 48, 49, 53].

Аналіз храналагічных межаў іўдзейскіх метрычных кніг, якія на працягу 1920-х гг. захоўваліся ў архівах мясцовых органаў савецкай улады, дазваляе сцвярджаць, што самыя раннія з іх, нягледзячы на згаданую вышэй рэгламентацыю, утрымлівалі звесткі за 1843 г., а самыя познія – за 1919 г. Захаванасць архіваў іўдзейскіх абшчын была не дастаткова добрай: пры параўнанні храналагічных межаў кніг пра нараджэнні, шлюбы, смерці адной і той жа абшчыны ў шэрагу выпадкаў заўважаюцца значныя прабелы. Кнігі пра разводы ўяўляюць пэўнае выключэнне, бо з’явы скасавання шлюбаў у асяроддзі вернікаў-іўдзеяў былі дастаткова рэдкімі. У якасці прыкладу можна прывесці архіў іўдзейскіх метрычных кніг, якія ўзніклі ў выніку дзейнасці Лёзненскай абшчыны і ў 1929 г. захоўваліся ў Лёзненскім местачковым савеце. Указаны архіў складаўся з кніг пра нараджэнні за 1854–1857, 1859–1860, 1864–1865, 1876–1877, 1881–1883, 1885–1886, 1888, 1890–1894, 1896–1900, 1902–1904, 1906, 1908–1911, 1913–1916 гг., пра шлюбы за 1860, 1863–1865, 1872, 1876–1877, 1879–1916 гг., пра смерці за 1854–1858, 1860, 1863–1864, 1871–1872, 1877–1912, 1914–1916 гг., пра разводы за 1878, 1892, 1900 г. [4, арк. 48].

Акрамя таго, частка кніг была папсавана: напрыклад, у метрычных кнігах пра нараджэнні за 1897–1899, 1902–1903, 1905 гг. Бешанковіцкай абшчыны не хапала некаторых аркушаў [3, арк. 73], а ў кнігах, складзеных рабінамі Астроўна, былі зроблены выпраўленні [2, арк. 34].

Такім чынам, пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. функцыя вядзення метрычных кніг была перададзена ад рэлігійных абшчын да органаў савецкай улады. Згодна з устаноўленым парадкам, архівы метрычных кніг, якія ўтварыліся на працягу сярэдзіны XIX – пачатку XX стст. мусілі захоўвацца ў пададдзелах ЗАГС выканкамаў. У працэсе іх перадачы мясцовым органам улады магчыма вылучыць наступныя этапы: 1) 1917 г. – пачатак 1920-х гг. – выяўленне метрычных кніг у культавых будынках і першыя спробы іх упарадкавання ў савецкімі органамі ўлады, 2) 1924–1928 гг. –

перадача метрычных архіваў райвыканкамам, 3) з 1929 г. – знаходжанне метрычных кніг у архівах сельскіх і местачковых саветаў. Нягледзячы на ўсе прынятыя меры, поўная захаванасць метрычных архіваў забяспечана не была: іх частка была страчана і папсавана.


1. Декреты Советской власти: в 13 т. / ред. комисс.: Г.Д. Обичкин [и др.] – М.: Политиздат, 1957. – Т. 1: 25 октября 1917 г. – 16 марта 1918 г. – 625 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 104. – Воп. 1. – Спр. 99.
3. ДАВВ. – Ф. 118. – Воп. 1. – Спр. 573.
4. ДАВВ. – Ф. 160. – Воп. 1. – Спр. 40.
5. ДАВВ. – Ф. 289. – Воп. 1. – Спр. 10.
6. ДАВВ. – Ф. 591. – Воп. 3. – Спр. 12.
7. ДАВВ. – Ф. 1732. – Воп. 1. – Спр. 3.
8. ДАВВ. – Ф. 2282. – Воп. 1. – Спр. 108.
9. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 5. – Воп. 1. – Спр. 24.
10. ДАМВ. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 21.
11. Занальны дзяржаўны архіў у г. Оршы. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Спр. 50.
12. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / В.В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 340 с.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1520. – Воп. 4. – Спр. 2; Воп. 7. – Спр. 9; Ф. 3410. – Воп. 1. – Спр. 15а; Воп. 4. – Спр. 38 – 40.
14. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства ССРБ. – 1922. – № 12.



**Михальченко С.И.**


## НЕОПУБЛИКОВАННЫЕ «ВОСПОМИНАНИЯ» Е.В. СПЕКТОРСКОГО КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ РУССКОЙ ЭМИГРАЦИИ В ЧЕХОСЛОВАКИИ СЕРЕДИНЫ 1920-х гг.*

Выдающийся отечественный ученый и деятель образования Евгений Васильевич Спекторский (1875–1951) известен как автор многочисленных трудов по философии, теории и истории права, культурологии, социологии, истории и литературоведению. Деятельность Спекторского протекала, в основном, в рамках системы высшего образования – в дореволюционный период он прошел весь путь вузовского преподавателя от магистранта до ординарного профессора. Став в 1920 г. эмигрантом, Спекторский не оставил академической работы – он был среди основателей Русского научного института в Белграде, некоторое время руководил Русским юридическим факультетом в Праге, долгие годы преподавал в Люблянском университете, а в последние годы жизни в Свято-Владимирской Духовной академии в США. [1; 3; 4; 7; 8] Судьба распорядилась так, что бóльшую часть времени, отведенного на творческую жизнь, Спекторский провел за рубежом (31 год). Тем больший интерес вызывают новые источники, позволяющие подробней осветить этот период. Одним из таких источников являются «Воспоминания» Спекторского. «Воспоминания» долгое время считались утраченными при бегстве Спекторского из Любляны в Триест в конце апреля 1945 г. Однако, по счастливому стечению обстоятельств, это оказалось не так. Текст «Воспоминаний», наряду с другими сочинениями, был сохранен учеником Спекторского В.Боначем и куплен архивом Института Восточной Европы Университета Бремена (Германия) (Forschungsstelle Osteuropa an der Universität Bremen. Historisches Archiv) [6].

Сейчас они находятся в фонде 01-30.230 (Bonač, Vladimir), е.х.II «Воспоминания». Это хранящиеся в пяти коробках листы (пагинация лл. 42–929) тетрадного формата, причем заполнена рукописным текстом только левая половина


* Подготовлено при поддержке гранта РГНФ № 13-01-00099 а.

каждого листа, правая сторона иногда содержит дополнения и исправления, оборот листа пустой. Текст хронологически обнимает собой всю жизнь Спекторского до начала 1930-х годов, причем изложение обрывается на полуслове. Текст содержит множество подробностей как частной жизни Спекторского, так и событий эпохи, свидетелем которых он был.

Мемуары, судя по замечаниям в тексте, создавались автором в годы Второй мировой войны, когда он проживал в Любляне. До 1943 г. Спекторский был действующим профессором университета, но в 1943 г. университет был закрыт оккупационными властями и, вероятно, у Спекторского появилось время обобщить ведшийся им много лет дневник. Именно существование дневника («Летописи»), в настоящее время большей частью утраченного (в том же архиве сохранились только две тетради с записями за 1930–1932 гг.), позволяет объяснить высокую степень подробности, характерную для воспоминаний.

Предметом рассмотрения в настоящей статье является русская эмиграция в Чехословакии по мемуарам Спекторского. Спекторский работал на Русском юридическом факультете в Праге с 1924 по 1927 год. В 1924 г. умер основатель и декан Русского юридического факультета в Праге П.И.Новгородцев. Спекторский был приглашен на освободившуюся таким образом кафедру энциклопедии права, желая, как он вспоминал, поработать для русской науки и образования, поскольку в Белграде он вынужден был преподавать по-сербски для местных студентов.

«Воспоминания» Спекторского изобилуют подробными характеристиками профессоров факультета, а равно и других представителей академического мира, оказавшихся в Праге. Здесь и декан факультета Д.Д.Гримм («строг, но справедлив по отношению к студентам. Они побаивались его, но и уважали своего «железного декана» [6, л. 597], и известный историк русского права М.В.Шахматов, больной туберкулезом позвоночника («Свою магистерскую диссертацию он писал на подвешенном пюпитре, лежа на животе. Он был трудолюбив и любил свою науку. Но у него не было строго научного духа. Он писал ad demonstrandum, non ad narrandum*. И это портило его исторические исследования. Так, например, он изображал Древнюю Русь какими-то сентиментальными и идиллическими чертами» [6, л. 599], и знаменитый П.Б.Струве («Недостатком П.Б.Струве было то, что он не прошел, как мы, систематического ученого стажа. Ему, по-видимому, было трудно прочесть законченный курс. Кроме того, его чересчур отвлекала политика. Однажды он в разгаре учебных занятий, не предупредив ни декана, ни студентов, помчался в Лондон и просидел там довольно долго. Должно быть, он считал, что для России это было необходимее, чем чтение регулярных лекций» [6, л. 602]. Вспоминался Спекторскому и «П.Н.Савицкий, талантливый, но и честолюбивый идеолог евразийства, из-за этого разошедшийся со Струве. Он жил в Мокропсах, где над его жилищем, как уверяли злые языки, будто бы развевался верблюжий хвост: ставка Чингисхана» [6, л. 603].

Наряду с юристами, на факультете преподавали историки и философы, так как Новгородцев, проектируя учебный план, кое-что позаимствовал из организации учебного процесса в Варшавском университете, где было много непрофильных дисциплин на юрфаке. Спекторский оставил одобрительную характеристику А.А.Кизеветтера («...Блестящий лектор. У него остатки кадетского духа, вызывавшие у некоторых студентов недовольство «крамольным стариком», сочетались с оскорбленным национальным чувством по поводу унижения, нанесенного нашей родине третьим интернационалом. Как и Струве, он решительно боролся против

* лат. ради доказательства, а не повествования. По смыслу, скорее, правильнее обратное ad narrandum, non ad demonstrandum, т.е. писание ради рассказа, а не для доказательства.

евразийства» [6, л. 610]; сочувственную – Г.В.Флоровского («несомненно, очень талантливый человек»), а также Н.О. Лосского, И.И.Ломшакова [6, л. 613–614] и других.

Наряду с характеристиками профессоров факультета, мемуары Спекторского полны метких и подробных описаний студенчества. «Объективно наши студенты были, конечно, несчастны, – подчеркивал он. – Без родины, без семьи, без обеспеченного будущего, они ели чужой хлеб, за что их попрекали с разных сторон: социалисты – потому что они не были социалистами, чехи из России – потому что хотели получить в возмещение понесенных ими убытков суммы, шедшие на иждивение и т.д. Здоровье их было в неудовлетворительном состоянии. Очень велик был процент склонных к туберкулезу. За четыре года умерло 62 студента. Морально наши учащиеся с трудом оправлялись от недавно перенесенных потрясений» [6, л. 621]. Удручало Спекторского снижение общего уровня студенчества («Среди наших студентов было немало талантливых молодых людей, работавших хорошо и даже с отличием. Но общеевропейское понижение общего образования сказывалось у большинства. Слушая ответы на экзаменах, нередко я вспоминал одну фразу Островского: «Эх ты, моя необразованность» [6, л. 623–624].

Спекторский не ограничился характеристиками профессоров, преподававших на факультете – мемуары полны портретов ученых, не связанных непосредственно с РЮФ, но живших в Праге. При этом, как гуманитариев, так и естественников. Спекторский описал академические организации, существовавшие в столице Чехословакии («В Праге существовал целый ряд наших ученых обществ, в которых постоянно читались доклады. Это создавало обстановку напряженной духовной жизни» [6, л. 639]. Подробно, с адресами, - условия жизни представителей науки, в том числе, бытовые («Мой друг В.А.Францев жил на Халковой улице. Он занимал две комнаты в пренеудобной квартире, без электричества, без ванны, с уборной на лестнице. В одной комнате жил опекавшийся им его племянник, студент, который пропитался левым духом, будучи гимназистом в Моравской Тшебове. Их хозяйкой была очень почтенная особа, дочь эконома в имении какого-то графа, обладавшая большим кулинарным талантом» [6, л. 637–638]. Есть у него и характеристики представителей эмиграции, живших в других городах страны (Пржибраме, Брно, Братиславе).

Спекторский оставил также краткие характеристики писателей, живших в Праге (В.И.Немировича-Данченко, Е.Н.Чирикова), журналистов, представителей военных (в частности, генерала А.П.Кутепова) и религиозных кругов.

Меньше в мемуарах характеристик чешских политиков и ученых. Из тех, что есть, наиболее подробна характеристика К.Кадлеца («Кадлец был чрезвычайно добросовестный и трудолюбивый ученый с наклонностью к крохоборству. Он усердно работал над огромным глоссарием, дававшим ему право считать себя Дюканжем славянского права. На нашем русском юридическом факультете он руководил занятиями молодых историков русского и славянского права» [6, л. 688].

Спекторский отмечал, что у русских эмигрантов «отношение к чехам колебалось между возмущением по поводу поведения их легионеров в Сибири и выдачи ими Колчака большевикам и признательностью за начавшуюся «русскую акцию» [6, л. 529] Вообще, в отличие от отношения к властям КСХС, к которым Спекторский относился с большим уважением (а короля Александра просто боготворил), чешские власти вызывали у него скорее, иронию, смешанную с раздражением. Он отмечал, что, например, после избрания Т.Масарика президентом «его превратили в легендарного героя, в демиурга республики, в «татичка», т.е. батюшку чешского народа, забыв, что место отца этого народа уже было предоставлено историку Палацкому». При этом «огромные суммы расходовались из средств государственного казначейства на рекламу

такого Масарика на всевозможных и притом не только европейских языках. Ему стали всюду поспешно ставить памятники еще при жизни» [6, л. 537]. Впрочем, Спекторский, конечно, не мог не признать, что «Масарик и его дочь Алиса не только не возражали против благотворительной «русской акции», но и деятельно помогали как целым эмигрантским учреждениям, так и отдельным лицам. Он много сделал для культурного подъема своей страны» [6, л. 540]. Достаточно скептически Спекторский относился и к Э.Бенешу. Единственным человеком в чешском истеблишменте, к которому мемуарист относился с симпатией, был лично ему знакомый К.Крамарж. «Мы видели в нем друга России, не изменявшего ей и тогда, когда она попала в беду, – подчеркивал Спекторский. – Мы знали, что он ездил к Деникину и, что именно он побудил правительство и представительство Чехословакии прийти на помощь русской эмиграции. И мы были уверены, что он всегда будет противиться признанию третьего интернационала и его агентов законным русским правительством, хотя бы из-за этого ему пришлось встретить противодействие в собственной партии» [6, л. 542].

В 1927 г. Спекторский покинул Прагу, так как начала сворачиваться «русская акция» и постепенно сокращалось количество студентов на РЮФ. «Галлиполийцы устроили мне прощальный ужин у Беранека. Францев назвал меня славистом, Шахматов уподобил солнцу, а Кизеветтер – Сызранскому мосту через Волгу. Епископ Сергий отслужил напутственный молебен» [6, л. 728].

Таким образом, несомненно, «Воспоминания» Спекторского являются важнейшим источником для изучения биографии ученого и – шире – истории русской эмиграции в Чехословакии середины 1920-х годов.


1. Билимович, А.Д. Профессор Е.В.Спекторский / А.Д. Билимович // День русского ребенка. – Сан-Франциско, 1952. – Вып. XIX. – С. 129–134.
2. Воспоминания Е.В. Спекторского. / публ. С.И. Михальченко // Journal of Modern Russian History and Historiography. – №3 (2010). – P 161–199.
3. Ермичев, А.А. Е.В.Спекторский (1875–1951). Биобиблиографическая справка / А.А. Ермичев // Спекторский, Е.В. Проблема социальной физики в XVII столетии / Е.В.Спекторский. – СПб.: Наука, 2006. – Т. II. – С. 506–521.
4. Михальченко, С.И. Евгений Васильевич Спекторский / С.И. Михальченко, Е.В. Ткаченко // Вопросы истории. – 2013. – № 1. – С. 31–53.
5. Михальченко, С.И. Документы Е.В. Спекторского в Архиве Института Восточной Европы Бременского университета / С.И. Михальченко // Отечественные архивы. – 2011. – № 6. – С.64–68.
6. Спекторский, Е.В. Воспоминания / Е.В. Спекторский // Forschungsstelle Osteuropa an der Universität Bremen. Historisches Archiv. – FSO. 01-30.230.II (Bonač, Vladimir).
7. Ткаченко, Е.В. Общественно-политические взгляды Е.В. Спекторского / Е.В. Ткаченко. – Брянск: РИО БГУ, 2009.
8. Ульяновський, В. Останній ректор Університету Святого Володимира Євген Васильович Спекторський / В.Ульяновський, В.Короткий, О.Скиба. – Київ: КНУ, 2007.



**Гуменюк Е.А.**


## ИСТОЧНИКИ ПО УКРАИНСКОЙ И БЕЛОРУССКОЙ СТУДЕНЧЕСКОЙ ЭМИГРАЦИИ В СТРАНАХ ЦЕНТРАЛЬНО-ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ В 1920–1939 гг.

Страны Центрально-Восточной Европы являлись важными центрами для украинской и белорусской эмиграции в 1920–1930-е годы. Немалую часть среди эмигрантов составляли студенты. В период между двумя мировыми войнами наиболее благоприятной страной для студентов-эмигрантов была Чехословакия. Следует отметить, что в Чехословакии действовали украинские высшие учебные заведения: Украинский свободный университет в Праге, основанный в 1921 г.; Украинская хозяйственная академия в Подебрадах (УХА) с 1922 г.; Украинский высший

педагогический институт им. М. Драгоманов в Праге с 1923 г. и т.д., где имели возможность обучаться не только украинцы, но и представители других наций, среди которых было немало белорусских студентов.

Украинские и белорусские студенты активно сотрудничали на уровне организаций, проводили совместные культурные акции в Чехословакии, Польше, Германии и Австрии, часто выступали заодно на международных форумах и конференциях. По численности белорусская студенческая эмиграция уступала украинской, но ее деятельность имела большое значение для налаживания связей, как с эмигрантами, так и с народами тех европейских стран, где они проживали.

Больше всего украинских и белорусских студентов-эмигрантов проживало в Чехословакии. Среди архивных документов и на страницах прессы 1920–1930-х годов встречается довольно много упоминаний о белорусах, которые учились в Украинском свободном университете в Праге, Украинском высшем педагогическом институте им. М. Драгоманов, Украинской хозяйственной академии в Подебрадах. А так же документы содержат информацию о украино-белорусских организациях в Чехословацкой Республике, основным заданием которых была материальная помощь студентам.

Условия пребывания украинских и белорусских эмигрантов в разных странах Европы отличались. Но в плане материального обеспечения наилучшее положение было у эмигрантов в Чехословакии. Помимо различных международных организаций, которые предоставляли материальную помощь, чехословацкое правительство развернуло «русскую акцию» для помощи эмигрантам из бывшей Российской империи [7, с. 30–31]. Исходя из неплохих материальных условий и пользуясь благосклонным отношением чехословацкого правительства, украинская эмиграция смогла развернуть широкомасштабную культурно-образовательную деятельность в ЧСР, а так же обеспечить материальную поддержку студентам. С целью наилучшего материального обеспечения создавались специальные организации. В данном контексте следует упомянуть о украино-белорусских вспомогательных организациях. Среди архивных документов, которые иллюстрируют данную сторону сотрудничества украинцев и белорусов, стоит отметить документы Центрального государственного архива высших органов власти и управления Украины (ЦГАВО Украины), а именно фонд 3920 – Чешско-украинский комитет помощи украинским и белорусским студентам в Праге. Чешско-украинский комитет помощи украинским и белорусским студентам был основан в Праге в 1921 г. В статуте Комитета определялись его задачи: «нести материальную и моральную помощь студентам украинцам и белорусам» [6, л. 9].

Еще одной организацией, которая оказывала материальную помощь студентам, был Вспомогательный фонд украинских и белорусских студентов основан в Праге в 1931 г. Информация о деятельности данного Фонда содержится в фонде 19 Центрального государственного архива зарубежной украиники (ЦГАЗУ), фонде 4465 ЦГАВО Украины. В состав Фонда входили украинцы и белорусы, возглавлял его академик, профессор Станислав Днестрянский (украинец), а заместителем был Василий Захарка (белорус) [2, л. 1]. В уставе Вспомогательного фонда украинских и белорусских студентов в Праге отмечалось: «Целью Вспомогательного фонда является помощь (стипендии и другая помощь) украинским и белорусским студентам, которые обучаются в высших учебных заведениях Чехословацкой республики. Помощь может получить украинский или белорусский обыкновенный или равный ему в правах чрезвычайный слушатель высших учебных заведений Чехословакии.

Вспомогательный фонд получает материальные средства для осуществления своих заданий через: а) членские взносы; б) пожертвования, наследство, фундации, прибыль с акций организации и т.д. [5, л. 1–2]. Членские взносы составляли 60

чехословацких крон ежегодно или же 5 крон ежемесячно. Взнос члена-фундатора составлял 200 чешских крон [2, л. 1].

Обучаясь в украинских высших учебных заведениях, белорусы основывали не только совместные с украинцами организации, но и свои собственные. В фонде 3795 ЦГАВО Украины можно встретить информацию, что среди множества различных студенческих организаций при Украинской хозяйственной академии в Подебрадах был основан и действовал Белорусский студенческий кружок, который официально был зарегистрирован в феврале 1925 г. В уставе указан характер кружка как профессионально-национальный аполитический. Цель организации: объединение белорусского студенчества в Украинской хозяйственной академии в Подебрадах, взаимопомощь в учебе, материальная и моральная, средствами для чего являются: а) организация рефератов и научных лекций для членов и более широкой аудитории; б) организация концертов или праздничных собраний; в) создание библиотеки и читальни; г) издание журналов; д) организация научных экскурсий и пленарных заседаний [3, л. 198].

Главой Белорусского студенческого кружка был М. Абрамчик [3, л. 195]. Еще в 1923 г. Белорусский студенческий кружок при УХА в Подебрадах организовал выступление с рефератом на тему «Возрождение Беларуси» по поводу пятой годовщины провозглашение независимости Белорусской Народной Республики 25 марта [3, л. 14].

Так же пресса межвоенного периода является ценным источником по изучению украинской и белорусской студенческой эмиграции. На страницах печатных изданий рассматривались различные аспекты деятельности эмигрантов. В архивных и библиотечных фондах украинских государственных центральных архивов, а так же Центральной научной библиотеки им. В.И. Вернадского и Библиотеке им. О. Ольжича хранятся важные для изучения студенческого эмигрантского движения газеты, журналы, бюллетени. В прессе публиковались не только заметки, но и развернутые статьи о белорусской эмиграции в европейских странах. А так же, можно встретить и белорусские эмиграционные печатные издания, например, в фонде 15 ЦГАЗУ хранятся отдельные номера «Селянкой доли» и «Бюлетэня Заграніччной групы белорускай партыі соцыялістау-ревалюцыянерау», где содержится информация о отдельных аспектах белорусской эмиграции в странах Европы в 1920–1939 гг. [1].

Еще одним источником по изучению украинской и белорусской студенческой эмиграции могут быть воспоминания бывших студентов, научные работы, очерки и т.д. самих эмигрантов. В данном контексте следует упомянуть работу С. Нарижного [4], в которой автор характеризует украинскую эмиграцию в европейских странах, вспоминая и о белорусской эмиграции, а так же большое значение имеет статистический очерк Л. Шрамченка [8] об украинских, белорусских и грузинских студентах в Чехословакии.

Источники по изучению украинской и белорусской студенческой эмиграции представляют собой архивные документы, публикации в прессе, воспоминания бывших студентов, научные работы самих эмигрантов. Особенностью данных источников является то, что они зачастую иллюстрируют сотрудничество украинских и белорусских студентов в странах Центрально-Восточной Европы и дополняют информацию о деятельности как белорусских, так и совместных украино-белорусских организаций.

1. Бюлетені українських білоруських політичних, студентських, кооперативних та інших еміграційних організацій. – ЦГАЗУ. – Ф. 15. – Оп. 2. – Д. 53.
2. Відозви та звернення Допомогового фонду українських і білоруських студентів та Українського допомогового бюро у Празі до емігрантів про збір пожертв. – ЦГАЗУ. – Ф. 19. – Оп. 1. – Д. 40.

3. Листування і статути різних організацій при Академії. – ЦГАВО Украины. – Ф. 3795. – Оп. 1. – Д. 118.
4. Наріжний С. Українська еміграція: культурна праця української еміграції між двома світовими війнами / С. Наріжний. – Прага, 1942. Ч.1. – 271 с.
5. Статут товариства Допомоговий фонд українських і білоруських студентів в Празі. – ЦГАВО Украины. – Ф. 4465. – Оп. 1. – Д. 269.
6. Статут Чесько-українського комітету допомоги українським та білоруським студентам в Празі. – ЦГАВО Украины. – Ф. 3920. – Оп. 1. – Д. 1.
7. Сладек, З. Русская эмиграция в Чехословакии: развитие «русской акции»/ З. Сладек // Славяноведение. – 1993. -№ 4. – С. 28 – 38.
8. Шрамченко Л. Українське, білоруське та грузинське студентство на високих школах в Чехословацькій республіці / Л. Шрамченко. – Подєбради, 1926. – 29 с.

**Дедурин Г.Г.**

## «БЕЛАРУСКІ ХРЫСЬЦІЯНСКІ РУХ» АДАМА СТАНКЕВИЧА КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ СТАНОВЛЕНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО ДВИЖЕНИЯ БЕЛОРУСОВ

Адам Станкевич (1891–1949) – знаковая фигура белорусской истории XX века. Связав свою судьбу с костелом, он не ограничивался лишь религиозной деятельностью. Адам с детства проявлял интерес к истории, традициям, культуре своего народа и став ксендзом активно использовал церковный амвон для пропаганды идей белорусского национального возрождения, что было особенно актуально в годы пребывания Западной Беларуси в составе II Речи Посполитой, проводившей политику полонизация белорусов.

К сожалению, политико-идеологическая конъюнктура долгое время не позволяла дать адекватную оценку А. Станкевичу и его творческому наследию. Белорусская советская историография обличала его, как «буржуазного националиста», «предателя трудового народа». Начиная с 1930-х годов немало критиков «белорусского национализма» делают Станкевича, едва ли не главным врагом «прогрессивных сил» национального движения [1; 9; 14; 16]. Такое внимание является своеобразным свидетельством не заурядности этой личности даже в глазах идейных противников. В послевоенное время его имя упоминалось лишь в контексте критики БХД (Белорусская христианская демократия) и других белорусских сил не просоветского направления [7; 13; 17; 20]. Не уделяли достаточно внимания Адаму Станкевичу и представители белорусской диаспоры. Это можно объяснить тем, что ее интеллектуальная элита состояла преимущественно из людей, которые оставили Беларусь во время революционных событий и гражданской войны в 1917–1920 гг., когда фигура Станкевича, еще находилась в тени.

В конце 1980-х годов в Беларуси начинают появляться работы, авторы которых пытались избавиться устаревших штампов в оценке белорусского движения и его лидеров. Непосредственно А. Станкевичу были посвящены работы А. Сидоревича, У. Конана, Л. Луцкевича [5–6; 8; 18]. Однако следует отметить, что ни одна из них не была написана профессиональным историком. Это объясняет их скорее публицистический, чем научный характер. Более взвешенными стали оценки лидера хадеков (сокращение от христианские-демократы – *авт.*) и в обобщающих работах по истории Беларуси XX века. Их авторы признают не только весомый вклад Адама Станкевича в белорусскую культуру, но и указывают на правильность многих политических альтернатив сформулированных ксендзом, даже в современных условиях [2, с. 199; 15, с.70].

Среди белорусских историков начала XXI века большое внимание исследованию деятельности А.Станкевича уделял Э. Мазько [10–12]. Он сумел достаточно убедительно доказать ведущую роль этого человека в процессе формирования идеологических основ

Белорусской христианской демократии. Большую работу провели гродненские историки А. Вашкевич и А. Пашкевич, которые несколько лет назад подготовили первое собрание трудов ксендза на историко-культурную и религиозную тематику [19]. Основные вехи жизненного и творческого пути Адама Станкевича попытался так же осветить и автор данных строк [4].

Многие публикации А. Станкевича до сегодняшнего дня не утратили актуальности и представляют значительный научный интерес для религоведов, филологов, философов, историков. В контексте интересов последней группы ученых, следует подробнее остановиться на книге идеолога БХД «Беларускі хрысьціянскі рух», долгое время являвшейся единственным источником информации по истории белорусского христианско-демократического движения и одним из немногих, дававшим представление о развитии национального движения белорусов в XIX – первой половине XX века в целом [21].

Данный исторический очерк был закончен незадолго до Второй мировой войны – в 1936 году и, по задумке автора, должен был обобщить основные достижения и обозначить наиболее острые проблемы белорусского движения за более чем вековую его историю.

Работа была поделена по проблемно-хронологическому принципу на 11 разделов. В первом из них А. Станкевич предпринял попытку поиска истоков белорусского национального возрождения в XIX веке и выяснения степени влиянии на этот процесс христианства в белорусских землях. Ксендз считал, что точкой отсчета национального возрождения, следует считать появление интереса к истории и культурным традициям своего народа отдельных представителей белорусской униатской и католической интеллигенции (В. Равинский, Я. Чечот, В. Дунин-Марцинкевич). Особо отмечается роль Ф. Богушевича, который выступил связующим звеном между белорусской национальной мыслью XIX и XX веков [19, с. 463]. Это вполне согласуется с современными взглядами на основные этапы становления нации, где в качестве первого этапа, как правило, отмечается обращение к культурному наследию народа и его «собирание» [3]. В этом же разделе, А. Станкевич отмечает значительно меньшую активность на ниве национального возрождения белорусских православных деятелей, которые оказались куда более подверженными денационализации, чем их католические собратья. В этом ксендз и видел одну из основных проблем на пути становления белорусской нации.

Во втором разделе речь идет о началах сознательного белорусского национального движения. Хронологически этот период автор обозначил 1900–1910 годами. Главным событием этого периода, священнослужитель, безусловно, считает появление Белорусской революционной громады, вскоре трансформировавшейся в Белорусскую социалистическую громаду (БСГ). С этим событием А. Станкевич увязывает появление двух течений в белорусском движении – эволюционного, представители которого, как и ранее, отдавали предпочтение культурно-просветительской деятельности и революционного, стремившегося к более решительным действиям. Однако, при этом ксендз отмечает, что между этими течениями не было жесткой конфронтации и белорусский революционный социализм имел скорее не марксистскую, а народническую окраску. В этой связи он упоминает имена таких белорусских деятелей, как Карусь Каганец, Иван Луцкевич, Алоиза Пашкевич (Тетка) [19, с. 469].

Третий раздел рассказывает об организационных процессах, происходивших в среде белорусов-католиков накануне Первой мировой войны. А. Станкевич приводит многочисленные примеры организаторской деятельности ксендзов-белорусов по созданию кружков, ориентированных на объединение национально сознательной

молодежи и воспитанию ее в духе христианских заповедей и патриотизма. Одним из первопроходцев в этом отношении, он называет гродненского ксендза Ф. Гринкевича [19, с. 473]. Подобные кружки действовали не только на территории Беларуси, но и в других городах империи. В частности, одним из наиболее активных, считался Белорусский кружок при Духовной католической академии в Петербурге, который посещал и А. Станкевич.

Четвертый, пятый и шестой разделы посвящены бурным событиям, имевшим место на территории Беларуси в годы мировой и гражданской войн и роли в них представителей белорусского католического возрождения. В первые месяцы оккупации части белорусских земель, немцы проводили достаточно лояльную национальную политику. Это позволило активизировать отдельным белорусским ксендзам (Я. Германович, К. Стэпович, У. Толочко) национально-просветительскую деятельность [19, с. 487]. А. Станкевич справедливо признает, что в 1917–1918 гг. католический элемент белорусского движения не имел должного влияния на белорусское общество в целом, состоявшее преимущественно из православных. Поэтому, в момент распада Российской империи и, последовавшим за этим провозглашением Белорусской народной республики в марте 1918 года, ксендзы не могли существенно повлиять на ход этих процессов. Тем не менее, лидер БХД подчеркивал, что именно эти события послужили катализатором к переходу христианского движения на качественно новый этап и все более тесному его переплетению с национальным. В связи с этим, он выделяет такие события как создание в мае 1917 года в Петрограде Белорусской христианско-демократической злучности, у истоков которой стояли Ф. Абрантович и Л. Хвецька и принятие первой программы БХД в 1920 году, текст которой приводится полностью [19, с. 512–516]. Принятие программы, по мнению А. Станкевича, свидетельствовало о завершение организационного оформления христианско-демократического крыла национального движения и готовности его представителей к всесторонней деятельности в рамках отстаивания социальных, национальных и культурных прав белорусов.

1921 год вновь разделил белорусские земли и их западная часть, по условиям Рижского мира, отошла к возрожденному польскому государству. Именно на межвоенный период приходится наиболее плодотворный этап деятельности ксендза. Поэтому неудивительно, что значительное место в работе отведено анализу ситуации, сложившейся на западнобелорусских землях в 1921–1939 годах. Этому посвящены 7–11 разделы очерка. В них можно найти немало интересных сведений об особенностях национальной политики разных польских правительств, о попытках белорусских деятелей защитить права своего народа с трибуны польского сейма и при помощи организации массовых кампаний в поддержку белорусского языка и школы.

Нельзя оставить без внимания и те сведения, которые А. Станкевич приводит об отношениях между разными течениями белорусского движения. Ксендз осуждал его леворадикальное направление, небезосновательно считая, что оно лишено самостоятельности и лишь выполняет волю московского центра. Вместе с тем, он признавал успехи достигнутые в середине 1920-х гг. Белорусской-крестьянско рабочей громадой и указывал, что именно пример БКРГ стал толчком для дальнейшей эволюции христианского движения, что вылилось в принятии программы БХД 1926 года, в которой впервые речь шла о ее надконфессиональном характере [19, с. 531].

1930-е гг. стали серьезным испытанием для белорусов по обе стороны рижской границы. Отказ от политики белорусизации в БССР, начало массовых репрессий сталинского режима и переход к политике национальной ассимиляции в Западной Беларуси, делал особенно ценным существование таких организаций как БХД, продолжавших настаивать на своем «незалежніцкім» характере.

Хронологически последними событиями о которых идет речь в очерке, стали попытки создания единого народного фронта на основе БХД и КПЗБ, предпринимавшиеся в 1935–1936 гг. и завершившиеся неудачно. Автор очерка в полном объеме приводит документ принятый христианскими демократами в ответ на предложение ЦК КПЗБ [19, с. 563–565]. В качестве главной причины отказа, указывалась несамостоятельность местных коммунистов и диаметральная разница в идеологических основах двух политических сил. Как показал дальнейший ход событий и, прежде всего, роспуск КПЗБ по указке Коминтерна в 1938 году, утверждения лидера хадеков были небезосновательны.

Безусловно, автор, будучи заинтересованной стороной и непосредственным участником многих из описываемых в очерке событий, не избежал отдельных фактических неточностей, субъективизма в оценке своих политических оппонентов, некоторой идеализации христианско-демократического движения, которое, несмотря на все попытки его лидеров, все же так и не смогло стать объединительным центром для всего белорусского общества. Тем не менее, это не помешало Адаму Станкевичу вполне убедительно показать эволюцию, в течение ста с лишним лет, не только христианского, но и белорусского движения в целом.


1. Гарадоцкі, А. Як беларуская хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і селян / А. Гарадоцкі. – Вільня, 1934.
2. Гісторыя Беларусі у кантэксце еурапейскай цывілізацыі / пад рэд. У.А. Сосны. – Мінск, 2003.
3. Грох, М. Нацыянальная гісторыя як канструкцыя: чэшскае выключэнне ці еўрапейская норма? / М. Грох // Homo historicus. – 2008. – С. 337–349.
4. Дедурін, Г. Адам Станкевич – ідеолог і практик білоруського національного руху у ІІ-ій Речі Посполитій / Г. Дедурін // Збірник Харківського історико-філологічного товариства. – Т. 13. – Х., 2009 – С. 59–75.
5. Конан, У. Ксендз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне у Беларусі / У. Конан. – Мінск, 2003.
6. Конан, У. Лідэр беларускага каталіцкага адраджэння / У. Конан // Голас Радзімы, 1998. – 22 кастрычніка.
7. Ладысев, В. В борьбе за демократические права и свободы / В. Ладысев. – Мінск, 1988.
8. Луцкевіч, Л. Адам Станкевіч / Л. Луцкевіч // Партрэты віленчукоу. – Вільнюс, 2006.
9. Лучанін, М. Заходняя Бєларусь пад пануванням Польшчы / М. Лучанін. – Мінск, 1926.
10. Мазько, Э. Дзейнасць БХД па арганізацыі беларускага школьніцтва ў Заходняй Беларусі у 20–30-я гг. ХХ ст. / Э. Мазько // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіена Беларусі. – Брэст, 1998. – Ч. ІІ. – С. 130–135.
11. Мазько, Э. Ідэалагічныя падставы дзейнасці Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (1917–1939 гг.) / Э.Мазько // Гістарычны альманах. – Гародня, 2000. – Т. 3. – С. 71–76.
12. Мазько, Э. Уплыў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі на фармаванне культурнай сітуацыі у Заходняй Беларусі у 20 – 30 гады ХХ стагоддзя: дыс. … канд. гіст. навук / Э. Мазько. – Гродна, 2003.
13. Мараш, Я. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918 – 1939) / Я. Мараш. – Мінск, 1983.
14. Некрашэвіч, А. Беларускі нацыял-фашызм і нацыянал-дэмакратызм / А. Некрашевіч. – Мінск, 1930.
15. Нямкевіч, І. Гісторыя грамадсько-палітычных течій беларускага руха / І. Нямкевіч. –, 2006.
16. Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине. – Мінск, 1935.
17. Полуян, В. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии / В. Полуян. – Мінск, 1978.
18. Сідарэвіч, А. З Айчынай і богам у сэрці: Адам Станкевіч (1891–1949) / А. Сідарэвіч // Вяртання маўклівая споведзь. – Мінск, 1994. – С. 203–212.
19. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі. Збор твораў / за ред.: А. Пашкевіча; А. Вашкевіча. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
20. Сташкевич, Н. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии в 1917–1925 годах / Н. Сташкевич. – Минск, 1985.
21. Stankiewic Ad. Bielaruski Chryscijanski ruch / Ad. Stankiewic. – Vilnia, 1939.

**Швед В.В.**

# МАТЭРЫЯЛЫ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА Ў БЕЛАСТОКУ (ПОЛЬШЧА) ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ Ю. ЯДКОЎСКАГА ПА ЗАХАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ГРОДНА

Ю. Ядкоўскі для горада Гродна – чалавек, які заслужыў помніка сваёй актыўнай дзейнасцю на пасадах Беластоцкага акруговага кансерватара, стваральніка і кусташа Гродзенскага дзяржаўнага музея, збіральніка і захавальніка гісторыка-культурных рэчаў на Гарадзеншчыне, аўтара папулярных артыкулаў і брашур па гістарычнай спадчыне Гродна і ваколіц. У дзяржаўным архіве ў Беластоку нам пашчасціла знайсці цікавыя і не выкарыстаныя дагэтуль матэрыялы пра дзейнасць Ядкоўскага, якія, на наш погляд, не страцілі актуальнасці і ў наш час, калі ідзе размова пра рэстаўрацыю помнікаў гісторыі і культуры Гродна.

Храналагічна ранейшым са знойдзеных дакументаў ёсць "Справаздача Камісіі апекі над забыткамі мастацтва і культуры пры кіраўніцтве Гродзенскага павета (14.03.1920 – 1.07.1921)". З яе бачна, што за год, не гледзячы на ваенныя падзеі 1920 г., Камісія разглядзела праблемы кансервацыі 11 помнікаў гісторыі і культуры Гродна і ваколіц: касцёлаў (уніяцкага, брыгіцкага, Фары Вітаўта – усе ў Гродна, Бераставіцкага, Азёрскага), гродзенскага Старога замка, будынкаў ("Баторыеўка" і дом Стурмака ў Гродне). Дзякуючы намаганням Камісіі, былі выратаваны кафля і іншыя прадметы са старых будынкаў, зруйнаваных падчас савецка-польскай вайны 1920 г., а таксама дакументы з былых савецкіх органаў улады, якія патрапілі ў рукі гродзенскіх гандляроў, пусціўшых іх на паперу для абгортвання тавараў. Камісія зберагла для будучага музея 5 крыжоў з дамініканскага касцёла, старые ключы з гродзенскай казны XVIII ст., рэшткі расійскага педагагічнага музея, 240 старых планаў (пераважна XVIII ст.) [zesp. 47, sig. 151].

Наступны архіўны дакумент "Спіс плошчаў, вуліц, аб'ектаў старой будоўлі г. Гродна, якія падпадаюць паводле дэкрэта ад 31.10.1918 (Дзеннік праў, № 16, 1918 г.) апецы права". Ён цікавы тым, што сярод пералічаных 24 аб'ектаў ёсць усе тыя, якія сёння выкарыстоўваюцца як турыстычныя рэсурсы (замкі, палацы, храмы, гістарычныя будынкі), а таксама названы помнікі гісторыі і культуры, якія ўжо не існуюць (а прайшло толькі 80 гадоў!): касцёл і кляштар бернардзінак, частка будынкаў па праваму ад замкаў боку вул. Маставой, дамініканскі касцёл, частка тызенгаўзаўскіх дамоў [zesp. 47, sig. 151, к. 35]. Звяртаю ўвагу на тое, што падпісаўшы гэты дакумент Ю. Ядкоўскі апекаваўся не толькі каталіцкімі і польскімі помнікамі, але і перыяду "варяжскага", ВКЛ, уніяцкім і праваслаўнымі – усе былі для яго помнікамі "крэсовымі".

У святле сённяшніх спроб рэстаўрацыі Старога замка цікава ведаць намаганні Ядкоўскага па яго рамонту, кансервацыі і пераўтварэнню ў музейны цэнтр у 1920–1930-х гадах. Дакументы беластоцкага архіва сведчаць, што ў студзені 1926 г. праводзіліся рэстаўрацыйна-кансерватыўныя працы. У ліпені 1927 г. Ядкоўскі скардзіўся на тое, што прыстасаванне Старога замка да патрэб музея ідзе павольна і праектант Бруна Збароўскі не быў у Гродне з 1925 г. Праект быў зроблены ў чэрвені 1928 г., але ў бюджэце 1929–1930 гг. грошаў на працы ў замку не было прадугледжана [zesp. 47, sig. 245, к. 11,13,46].

Паводле рашэння Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы Ядкоўскі быў агульным адміністрацыйным кіраўніком прац на Старым замку і адказваў за праект і дэталі унутраных прац памяшканняў, дзе будзе размешчаны Гродзенскі музей [zesp. 47, sig.245, к. 29–30]. З каштарыса прац 1928 г. бачна сума, якая прызначалася на капітальны рамонт і частковую перабудову левага крыла замка для патрэбаў ствараемага музея. На мурарскія, цяслярскія, сталярскія, слесарскія, малярскія працы,

тынкаванне, шкленне вакон і іншае планавалася выдадкаваць 46066.60 злотых [zesp. 47, sig. 245, к. 5–6].

У 1926 г. абвалілася частка замкавай гары каля Новага замку з-за дрэнна працуючай каналізацыі (утварыўся роў глыбінёю 6 м і шырынёю 10 м), а ў наступным годзе адбыўся абвал зямлі ў выніку падмыва водамі ракі і падкопаў насельніцтва, якое капала ў падножжа замка жвір і мела гароды. Ядкоўскі кінуў свае сілы на ратаванне замка і да восені 1928 г. Упраўленнем водных дарог быў пабудаваны ахоўны бульвар, так любімы сённяшнімі гродзенцамі. Падчас прац знайшлі драўляныя пабудовы часоў Ягелонаў. У 1929 г. планавалася рэканструяваць Сенацкую залу, зрабіць уваход з боку галоўнай лесвіцы, пабудаваць прыбіральню з боку Нёмана, адрамантаваць уязную браму. Ядкоўскі дабіўся закрыцця акруговага вайсковага шпіталю, які размяркоўваўся ў Новым замку, і размяшчэння музея ў Старым замку [zesp. 47, sig. 244, k. 1, 5; sig. 245, к. 17, 27–28, 38].

У 1927 г. Ядкоўскі выступіў супраць будаўніцтва стадыёна на месцы перадгістарычных могілак і сярэднявечага дзядзінца Барысаглебскай царквы, якое задумалі мясцовыя вайсковыя ўлады. Пра гэта ён не аднаразова пісаў у Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы ў 1928–1930 гг. Пераконваў, што праваслаўная кансісторыя часткова выкупіць гэтую тэрыторыю, часткова заменіць на іншую. Стадыён не быў пабудаваны! Ядкоўскі (як сябра Камітэту адбудовы царквы на Каложы) паспрыяў узнікненню новага плоту вакол царквы, раіў зрабіць яго са знешняга боку з каменя (што гарманавала з мураванай царквой), а з унутранага – з цэглы [zesp. 47, sig. 256, к. 9, 14, 19, 29].

Звярнуў сваю ўвагу Ядкоўскі і на Фару Вітаўта (тады гарнізонны касцёл), пра адраджэнне якой сёння шмат гаворыцца ў Гродне. З Пратакола паседжання Камітэта адбудовы касцёла ад 6.05.1922 г. вядомы яго склад на чале з ксяндзом дэканам Л. Зэброўскім. Паводле асабістага погляду акруговага кансерватара Ядкоўскага ад 22.10.1922 г. гэты помнік заслугоўвае ўвагі, бо мае багатую гісторыю ад часоў Вітаўта і Ягелонаў. Пацярпеўшы ад вайны 1920 г. ён патрабуе хуткай дапамогі: накрыцця дахам (абавязкова дахоўкай тыпу галанскай ці карпувкі), адбудовы тыльнай шчытовай сцяны [zesp. 47, sig. 250, к. 4, 5, 12].

14 жніўня 1922 г. Ядкоўскі пісаў гродзенскаму старасце К. Рагалевічу, што даведаўся пра тое, што з брігіцкага касцёла нейкія два галанскія манахі-капуцыны (адзін іх айцец Маркс) па дазволу біскупскай курыі ў Вільне вывезлі ў трох скрынях фундацыі Аляксандры з Сабескіх Весялоўскай (XVII ст.) гістарычныя каштоўнасці (18 абразоў, кнігі, старажытныя рэчы [zesp. 47, sig. 253, к. 11, 16, 18, 23, 26–28]. У поле зроку Ядкоўскага былі і іншыя касцёлы Гродна. Так, у 1922 г. ён прапаноўваў замест бляхі пакрыць галанскай дахоўкай дах францішканскага касцёла і прасіў акруговага кансерватара спыніць малярныя працы і хутка (з-за інфяцыі) выдзеліць грошы на рэстаўрацыю фрэсак 1740 г. (16 медальёнаў, раслінны арнамент) [zesp. 47, sig. 251, к. 10, 11, 22, 27, 30]. 31.08.1925 г. Ядкоўскі спыніў унутраны рамонт у паезуіцкім касцёле (Францішка Ксаверыя), бо ён мог знішчыць старажытныя фрэскі і галоўны алтар [zesp. 47, sig. 252, к. 7, 23]. У 1930 г. Ядкоўскі просіць дапамогі ў беластоцкага ваяводы для упарадкавання агароджы і тэрыторыі касцёла бернардзінак, указваючы, што грошы можна ўзяць з фундацыі гродзенскага магістрата для безпрацоўных [zesp. 47, sig. 255, к. 1].

Турбаваў Ядкоўскага і лёс такіх будынкаў, вядомых у Гродне, як: палац М.Валіцкага, дом пісьменніцы Ажэшкі і так званая Баторыеўка, якую цяпер звязваюць з іншым будынкам, чым Ядкоўскі. З падання праваслаўнага кансыстожа ў аддзел мастацтва ваяводскага ўпраўлення вядома, што будынак праваслаўнага кансыстажа (былы палац Валіцкага) атрымаў разам з вакольным паркам статус помніка. У доме Ажэшкі ў 1928 г. размяркоўвалася гандлёвая школа, якой кіраваў інжынер Радзіваноўскі. Баторыеўку на

паседжанні канферэнцыі (з удзелам Ядкоўскага), якая адбылася 19.02.1929 г., было вырашана выкупіць у цяперашніх шматлікіх уладальнікаў кватэр [zesp. 47, sig. 249, к. 4; 250, к. 5; zesp.353, sig. 5, k.2, 7].

Ядкоўскі выступаў супраць змен у гістарычным цэнтры Гродна. У дакументах беластоцкага архіва знаходзім яскравы прыклад такіх паводзін. Калі ў 1927 г. на плошчы Баторыя (цяпер Савецкай) запланавалі будаўніцтва аднапавярховай бетоннай вежы трансфарматара, Ядкоўскі выслаў ваяводскаму кансерватару тэлеграму з просьбай забараніць яго [zesp. 47, sig. 248, к. 4]. Адхіліў Ядкоўскі і дрэнна выкананую мастацкі мемарыяльную дошку Э.Ажэшкі, якую зрабілі для прымацавання на доме, у якім яна жыла апошнія гады і дзе памёрла [zesp. 47, sig. 247, к. 10].

Значную ролю адыграў Ядкоўскі ў збіранні і захаванні гістарычных артыфактаў у Гродзенскім дзяржаўным музеі, які існуе да сённяшняга часу. Пачаўся музей у красавіку 1920 г., дзякуючы Камісіі апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Савецка-польская вайна 1920 г. перашкодзіла яго развіццю. Са "Справаздачы Камісі апекі над забыткамі мастацтва і культуры пры кіраўніцтве Гродзенскага павета (14.03.1920 – 1.07.1921)" вядома, што 9 скрынь са зборамі Камісіі былі эвакуаваны з Гродна 18 ліпеня ў Вроцлавек, а потым у Быдгошч, адкуль вырнуліся 30 чэрвеня 1921 г. [zesp. 47, sig. 151; 194, к. 35–36]. Музей ("скарбніца краёвых памятных рэчаў") быў адчынены 9.12.1922 г. у памяшканні гродзенскага староства. Кусташам яго стаў кансерватар беластоцкай акругі Юзэф Ядкоўскі Мы знайшлі прапанаваны Ядкоўскім Статут музея 1923 г., з якога бачна, што сваю дзейнасць ён распаўсюджваў на тэрыторыю, якая ў XIII – XV стст. Складала Гродзенскае княства, а пазней да XVIII ст. – Гродзенскі павет у ВКЛ [zesp. 47, sig. 194, к. 15–16, 19]. Многа намаганняў прыклаў Ядкоўскі для пераводу музея ў памешканні Старога замка, пра што мы пісалі вышэй.

Такім чынам, матэрыялы Дзяржаўнага архіва ў Беластоку дапамагаюць ацаніць яшчэ болей шматгранную дзейнасць Юзэфа Ядкоўскага ў Гродне і па-новаму звярнуць увагу на гродзенскую гістарычную спадчыну.

**Дзмітрук А.П.**

## БЕСПАРТЫЙНЫ БЛОК СУПРАЦОЎНІЦТВА З УРАДАМ МАРШАЛА Ю. ПІЛСУДСКАГА (1928–1939) НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: АСАБЛІВАСЦІ КРЫНІЦАЗНАЎЧАЙ БАЗЫ

Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам маршала Ю. Пілсудскага (далей ББСУ) – польская ўрадавая палітычная групоўка, сфарміраваная ў 1928 г. і праіснаваўшая да 1935 г., якая дзейнічала і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Па метадам і формам адлюстравання крыніц, якія датычаць генезісу і актыўнасці блока, асноўная іх маса – пісьмовыя. Крыніцазнаўчую эўрыстыку, як правіла, падзяляюць на архіўную і бібліяграфічную [1].

Пошук матэрыялаў, якія б датычылі вызначанай палітычнай арганізацыі сярод ужо апублікаваных крыніц вынікаў не прынёс. Выкарыстанне даведачнай літаратуры дазволіла на першых этапах працы выявіць не супадзенне напаўнення тэрмінаў у айчыннай і польскай навуковай літаратуры, таксама акрэсліць архівы, якія могуць змяшчаць інфармацыю аб партыі.

Асаблівасцю архіўнай крыніцазнаўчай базы па Беспартыйнаму блоку супрацоўніцтва з урадам з'яўляецца яе сціпласць (польскія даследчыкі выкарыстоўваюць нават тэрмін «убогасць»). Фактычна матэрыялы старшыні партыі – В. Славека па яго распараджэнню былі спалены ў канцы 30-х гг. XX ст. яшчэ да яго самагубства [2]. А тое, што знаходзім у Архіве новых актаў у Варшаве ў 62 фондзе –

гэта справаводства генеральнага сакратарыята ББСУ і парламенцкага клуба. Такім чынам, аб дзейнасці блока можна даведацца толькі на гэтым арганізацыйным узроўні.

Асноўная маса матэрыялаў – гэта справы шэрагу грамадскіх арганізацый пілсудчыкаў, якія ўваходзілі ў склад блока, дзейнасць парламенцкага клуба па змене Канстытуцыі – асноўнага накірунку прац ББСУ за 1928–1935 гг., справа аб унутраных супярэчнасцях і дзейнасці суда клуба. Інфармацыя аб выбарах у сейм і сенат дастаткова спецыфічная і нераўнамерная. Сур'езным яе недахопам з'яўляецца тое, што вылучыць з матэрыялаў дзейнасць блока на тэрыторыі Заходняй Беларусі – Віленскім, Навагрудскім, Палескім, Беластоцкім ваяводствах – амаль не магчыма. Яна фрагментарна, слаба паддаецца аналізу. Адзначаецца нарастанне матэрыялаў і разнастайнасць іх відаў па меры станаўлення партыі.

Вельмі нязначную, але найбольш каштоўную частку спраў фонду складаюць арганізацыйна-распарадчыя дакументы генеральнага сакратара: арганізацыі і прынцыпы дзеяння ББСУ, рэгламенты, распараджэнні генеральнага сакратара і старшыні блока, палітычна-гаспадарчыя камунікаты генеральнага сакратарыята. Яны даюць уяўленні аб пабудове групоўкі, функцыях на пэўных узроўнях, але ўсе яны вельмі фрагментарныя.

Важнымі крыніцамі з'яўляюцца асабістыя акты вядомых дзеячоў партыі і дзяржавы. У некаторых папках захоўваюцца чарнавікі прамоў, праекты законаў, нават партыйныя справаздачы. А вось рэшткі фонду старшыні ББСУ В. Славека расчароўваюць.

Больш ні ў адным архіве, дзе сабраны матэрыялы па Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду – Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным архіве Брэсцкай і Гродзенскай вобласці, Дзяржаўным архіве грамадскіх арганізацый Гродзенскай вобласці, Занальным дзяржаўным архіве Мінскай вобласці ў г. Маладзечна, Літоўскім цэнтральным архіве ў г. Вільнюсе, дзяржаўным архіве ў Беластоку – асобнага фонду ББСУ не знойдзем.

Аднак спробы сістэматызаваць архіўны матэрыял, які датычыць гэтай урадавай групоўкі назіраюцца ў Брэсце. Нягледзячы на тое, што ББСУ не вылучаны з першага фонду – Палеская ваяводская установа – некалькі дзесяткаў спраў з назвай «фашысцкі Беспартыйны блок» у ім знайсці магчыма. Акрамя гэта традыцыйна найбольшую цікаўнасць ва ўсіх даследчыкаў выклікае 67 фонд – Камандаванне акруговага корпуса IX. Дзякуючы працы Т.Д. Ліберуўскай створана картатэка дастаткова фрагментарнага матэрыялу, якая датычыць арганізацыі і дзейнасці гэтай ўрадавай групоўкі.

Але і сярод гэтых дакументаў, партыйныя, гэта велізарная рэдкасць. Іх можна пералічыць па пальцах, усе яны асобныя, выпадковыя. Найбольшую цікаўнасць выклікае адна справа, у якой знойдзена фактычна 70% партыйных дакументаў [3]. Сабрана інфармацыя аб ББСУ з 1929 па 1934/1935 гг. Яе камплектацыя, змест застаўляюць уражанне, што перад намі своеасаблівая справаздача аб этапах станаўлення блока і ўзроўні яго развіцця ў Палескім ваяводстве.

У такой сітуацыі прываблівае бібліяграфія. Але і тут назіраюцца пэўныя цяжкасці. У сувязі з тым, што ў Беспартыйны блок увайшло шмат палітычных і грамадскіх арганізацый – ад левых да правых па сваёй арыентацыі, якія мелі свае праграмы, вызначыць якую з іх ён рэалізоўваў не магчыма. Тое ж датычыць і лідэраў: чыё выступленне, публікацыю лічыць за пазіцыю ўрадавай арганізацыі? Праграмы некаторых партый, якія ўвайшлі ў блок былі дыяметральна супрацьлеглыя. Аднак звяртаюць на сябе ўвагу прапагандысцкія брашуры, надрукаваныя ў рэгіянальных выдавецтвах напярэдадні выбараў 1928 г., дзе папулярызаваліся поспехі ўрада. Яны нешматлікія, занадта агульныя па зместу, таму малакарысныя, бо зразумець урадавую

праграму з іх увогуле не магчыма. А вось напярэдадні выбараў 1930 г. упершыню з'яўляецца шэраг брашураў пад маркай самой палітычнай групоўкі. Аўтары зусім розныя, матэрыялы таксама датычаць самых розных спраў, амаль усе папулярызуюць поспехі ўрада, а іх выдаўца – блок. Іх інфармацыйная карыснасць таксама невялікая. Але характар выданняў і іх колькасць змяняюцца ў 1933 г. Упершыню з'яўляюцца публікацыі пад назвай «З'езд грамадска-гаспадарчы …» з указаннем або павета, або ваяводства. У іх непасрэдна ідзе указанне на раду ББСУ, не зразумела толькі ці гэта аўтар, ці выдавецтва, але па зместу яны вельмі нагадваюць матэрыялы канферэнцыі. Былі знойдзены адпаведныя крыніцы па Віленскаму і Навагрудскаму, па Палескаму ваяводству. Іх каштоўнасць розная, але яны непасрэдна сведчаць аб дзейнасці палітычнай групоўкі. Такім чынам, фактычна крытэрыем адбору публікацый стала выдавецтва, прамое ўказанне на ББСУ. У сувязі з тым, што ініцыятарам стварэння блока быў урад, то актыўна выкарыстоўвалася інфармацыя надрукаваная ім, і адміністрацыяй у рэгіянальных выдавецтвах, каб скарэкціраваць агульнадзяржаўныя пастулаты з мясцовымі.

Мемуарная літаратура, за выключэннем двух аўтараў не датычыць Заходняй Беларусі [4; 5]. А калекцыі пракламацый і лістовак ББСУ цікавы момант яе дзейнасці, але малаінфарматыўны.

Пры аналізе ўрадавага друку таксама паўстаюць цяжкасці, па-першае, пры вызначэнні адпаведных выданняў, па-другое, у якасці галоўных рэдактараў у рэгіёнах выступалі ваяводскія сакратары ББСУ, якіх прызначаў ваявода. Фактычна змест артыкулаў, нават па стылю нагадваў, а то і непасрэдна паўтараў справаздачы адміністрацыі – «З дзейнасці ББСУ». Увогуле ў рэгіянальнай перыёдыцы пераважалі газеты-аднаднеўкі. Нешматлікія матэрыялы, якія датычаць ідэалагічных установак, сістэматызаваць вельмі цяжка настолькі яны разнародныя, як правіла, агульнага характару. Часцей за ўсё нагадваюць звыклыя перадвыбарчыя лозунгі, матэрыялы, якія прапагандуюць дзейнасць урада, яго поспехі, дасягненні на розных этапах, але вылучыць з іх праграму ці тэзісы немагчыма. Або ў якасці праграм на рэгіянальным узроўні вылучаюцца канкрэтныя справы – пабудаваць лазню ў вёсцы …, або грамадскі дом і г. д.

Выключэннем стала сакрэтнае, «на правах рукапісу» выданне генеральнага сакратарыята ББСУ, якое пры адсутнасці агульнай ідэалогіі і адпаведных праграм палітычнай групоўкі забяспечвала некаторае адзінства думак ва ўрадавым грамадска-палітычным руху. Фактычна большасць рэгіянальных артыкулаў, некаторых выступленняў – гэта частковыя перадрукоўкі з ёй. У ім папулярызаваліся законы, выдадзеныя ўрадам, ці тыя, якія яшчэ рыхтаваліся, тлумачылася з якой мэтай, якія карысці з іх прадугледжаны, адлюстроўвалася дзейнасць урада па некаторым накірункам. Але, асноўная частка гэтых матэрыялаў – асвячэнне дзейнасці ўлад.

Такім чынам, сярод партыйных крыніц з дакументальных матэрыялаў пераважна захавалася арганізацыйна-распарадчая дакументацыя (арганізацыйная, распарадчая, інфармацыйна-даведачная, бягучая), за выключэннем такой яе разнавіднасці як пратаколы, але ўся яна ўвогуле нешматлікая. Да 1933 г. фактычна адсутнічаюць справаздачы. Улікова-кантрольная справаводства настолькі адрывістая, што не дазваляе прааналізаваць ні колькасны, ні сацыяльны склад партыі. З апавядальнай літаратуры дастаткова шырока прадстаўлены публіцыстычныя творы, перыядычныя друкаваныя выданні, але з пункту гледжання інфармацыі аб дзейнасці самой палітычнай групоўкі малакарысныя для даследчыка. Як працаваць у такіх умовах? На многіх дакументах блока стаіць надпіс «сакрэтна», або «спаліць».

У выніку найбольш масавай крыніцай аб дзейнасці блока з'яўляюцца справаздачы грамадзянскай і ваеннай адміністрацыі. Аб'ектам для абодвух улад

з’яўляўся грамадска-палітычных рух, але перыядычнасць прадстаўлення і абшар дзейнасці ў іх былі рознымі. Ваявода складаў справаздачы па рэгіёну за тыдзень і месяц, а ваенныя ў межах сваёй акругі і як правіла квартальныя, або за паўгода (у залежнасці ад палітычнай напружанасці).

Пры выкарыстанне гэтага тыпу крыніц трэба мець на ўвазе, што ваявода стаяў на чале ўрадавага грамадска-палітычнага руху ў рэгіёне, што замацавана юрыдычна ў распараджэнні прэзідэнта Р П Польшчы аб арганізацыі і абшары дзейнасці ўлад агульнай адміністрацыі і нёс асабістую адказнасць за яго развіццё [6]. Такім чынам, ён — асоба зацікаўленая каб гэтыя справаздачы выглядалі як мага лепш. Рыхтаваў іх на падставе рапартаў паліцэйскіх органаў, інфармацыі старастаў, ад грамадскіх арганізацыі і г. д.

Застаецца надзея, што своеасаблівым спосабам праверкі інфармацыі ў такіх умовах могуць стаць справаздачы ваенных улад, якія не заўсёды супадаюць з інфармацыяй, якую падаваў ваявода. Яны больш аналітычныя, крытычныя і заўсёды выклікаюць найбольшую цікаўнасць даследчыкаў. І сапраўды неяк карэкціруюць дадзеныя ваявод, але да пэўнага ўзроўню.

Фрагментарнасць, дазіраванасць інфармацыі, што, з аднаго боку, акрэсліваецца і самім фармулярам справаздачы, з іншага спецыфічным стылем яе падачы. Фактычна і ваявода і ваенныя выконваюць сваю ролю: адны апісваюць арганізацыйную дзейнасць, выбарчую акцыю, другія – даюць ім ацэнку, улічваючы і правяраючы дакладнасць інфармацыі, але працуюць зыходзячы з адных мэтаў, прынцыпаў, на жаль не акрэсленых прама.

Вызначыць памер, ступень развіцця не толькі ББСУ, але і польскага грамадска-палітычнага руху на іх падставе немагчыма. Сфармуліраваных мэтаў, якія ставіліся перад блокам, ідэалагічных указанняў, установак амаль не аднатоўваецца. Увесь інфармацыйны матэрыял абумоўлівае фактычна высновы і самога даследчыка, які на іх абапіраецца. Яркім прыкладам некрытычнага выкарыстанне гэтых крыніц з’яўляецца шэраг артыкулаў блізкіх па тэме даследавання [7; 8; 9].

Узаемасувязь паміж крыніцамі назіраецца не столькі па іх відах, колькі па суб’екту, які іх выпрацоўваў, таму вельмі важна адлюстроўваюць ад каго зыходзіць інфармацыя. Акрамя гэтага на розных этапах развіцця блока партыйныя крыніцы, ды і адміністрацыйныя адрозніваюцца як па колькасці, так і па свайму ўзроўню. Фактычна магчыма класіфікаваць крыніцы і па храналагічнаму прынцыпу. А мэта даследавання дзейнасці ББСУ на тэрыторыі Заходняй Беларусі дазволіла сканцэнтраваць увагу і на рэгіянальным прынцыпе камплектацыі матэрыялаў. Можна сцвярджаць, што польскія ўлады самі за нас ужо сістэматызавалі гэтыя крыніцы, зрабілі неабходныя высновы ў справаздачах. Але цікава, што сістэматызацыя праведзена пры выкарыстанні амаль усіх яе прынцыпаў [1].

Такім чынам, аналізуючы дзейнасць ББСУ пры апоры на справаздачы адміністрацыі, даследчык павінен улічваць, што аб’ектыўныя дадзеныя ён атрымоўвае не толькі і не столькі аб генезісе і дзейнасці палітычнай групоўцы, колькі аб самім суб’екце, які іх выпрацоўваў, мэтах, якія ён праследуе і метадах, якія пры гэтым выкарыстоўвае, што выключае апісальны стыль.

Акрамя таго, інфармацыйную аддачу ад крыніц магчыма павысіць шляхам вылучэння скрытай інфармацыі са справаздач грамадскай і ваеннай адміністрацыі, бо вядома, што разам з той інфармацыяй, якую суб’ект імкнецца намерана атрымаць, вылучаецца і інфармацыя залішняя, якая зафіксавана міжвольна і таму невідавочная для суб'екта [10, с. 130]. Структурны характар гэтай інфармацыі дазваляе аналізаваць узаемасувязі, уласцівыя даследуемым з’явам і працэсам, на падставе непасрэдна выражаных у крыніцах дадзеных.

Усё гэта абумоўлівае прымяненне ў даследаванні палітычнай групоўкі сістэмнага падыходу, як найбольш эфектыўнага метаду.


1. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэбны дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 1999. – 193 с.
2. Chojnowski, A. Piłsudczycy u władzy. Dzieje BBWR / A. Chojnowski. – Wrocław-Warszawa [et al.]: Wyd-wo Ossolineum, 1986. – 294 s.
3. Государственный архив Брестской области (ГАБО). – Ф. 1. – Оп. 9. – Д. 2475.
4. Szymanowski, G. Dwanaście lat – wspomnienia z lat 1927–1939 / G. Szymanowski. – Toruń: Wyd-wo A. Marszałek, 1998. – 312 s.
5. Świtalski, K. Diarusz 1919–1935 r. / K. Świtalski. – Warszawa: Czytelnik, 1992. – 840 s.
6. Rozporządzenie prezydenta Rzeczypospolitej z 19 stycznia 1928 r. o organizacji w zakresie władz administracji ogólnej, poz. 86 // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1928. – № 11.
7. Kabot, T. Z działalności BBWR w województwie Poleskim w latach 1928–1935 // Res historica. – 1999. – Z. 8. – S. 71–81.
8. Cichoracki, P. Wybory 1935 r. w okręgu nr. 55 (Pińsk, Łuniniec, Stolin) // Гістарычная брама. – № 1 (25). – 2010. – С. 31–39.
9. Ким, И. Парламентские выборы 1935 г. в Полесском воеводстве / И. Ким // Гістарычная брама. – № 1 (24). – 2009. – С. 42–51.
10. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – М.: Наука, 1987. – 451 с.



**Субоцін А.А.**


## КРЫНІЦЫ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ШТОДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ СТАХАНАЎЦАЎ БССР (1935–1941 гг.)

У працэсе разгортвання стаханаўскага руху назіраюцца карэнныя змены ў матэрыяльным становішчы працоўных, узнікаюць новыя стымулы да ўдасканалення працы, а яго ўдзельнікі вылучаюцца ў асобную сацыяльную катэгорыю, якая становіцца новым эталонам людзей працы. Адзначаныя абставіны патрабуюць больш глыбокага аналізу сацыяльных наступстваў разгортвання стаханаўскіх кампаній. Для асвятлення спецыфікі штодзённасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў якасці сацыяльнай праблемы важным будзе прыцягненне як вядомых друкаваных крыніц, так і не выкарыстаных раней архіўных матэрыялаў, што дазволяць выявіць асаблівасці матэрыяльных ўмоў жыцця перадавікоў, формы арганізацыі іх вольнага часу, стратэгіі паводзін у задавальненні побытавых патрэбаў і асаблівасці ўспрымання свайго штодзённага акружэння. Мэта даклада: выяўленне асаблівасцяў выкарыстання крыніцавай базы для вывучэння штодзённага жыцця стаханаўцаў БССР у 1935–1941 гг.

Для даследавання штодзённага жыцця стаханаўцаў можа быць выкарыстаны комплекс дакументальных, апавядальных і выяўленчых крыніц, якія раскрываюць сацыяльныя характарыстыкі стаханаўцаў БССР, даюць інфармацыю пра асаблівасці іх матэрыяльна-бытавога і культурнага становішча.

Сярод дакументальных крыніц у першую чаргу варта выкарыстаць пастановы вышэйшых партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных органаў СССР і БССР, апублікаваныя ў зборніках дакументаў і матэрыялаў [2, 3, 6]. Гэтыя дакументальныя крыніцы датычыліся розных аспектаў развіцця народнай гаспадаркі, арганізацыі мерапрыемстваў па разгортванні стаханаўскага руху ў галінах эканомікі, дзе асобнымі пунктамі вылучаліся задачы па паляпшэнню бытавых умоў удзельнікаў руху, матэрыяльнай падтрымцы жанчын-стаханавак. Асноўная ж канцэпцыя зменаў матэрыяльнага становішча насельніцтва СССР па выніках разгортвання стаханаўскага руху і роля гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва ў пабудове сацыялізму была вызначана ў стэнаграме выступленняў І. Сталіна на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў у Маскве 14–17 лістапада 1935 г. [4].

Для даследавання вялікае значэнне мае шэраг неапублікаваных дакументальных крыніц, што захоўваюцца ў архівах Беларусі рэспубліканскага, абласнога і занальнага ўзроўню: фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ), Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (ДАМВ), Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку (ЗДА у г. Полацку) і іншыя. У пераліку архіўных крыніц значная колькасць інфармацыі па тэме штодзённасці стаханаўцаў знаходзіцца ў дакументах партыйных органаў, найперш, справаздачных: дакладных запісках аддзелаў ЦК КП(б)Б, мясцовых партыйных арганізацый, кіраўнікоў прадпрыемстваў па пытаннях разгортвання руху. У іх змяшчаюцца падрабязныя звесткі аб заработнай плаце ўдзельнікаў стаханаўскага руху на асобных гаспадарчых адзінках, асаблівасцях увядзення прагрэсіўна-здзельнай аплаты працы, аказанні грашовай дапамогі стаханаўцам і выплаце прэмій. Асобнае месца ў партыйных дакументах займае інфармацыя пра матэрыяльнае становішча стаханаўцаў сельскай гаспадаркі, а менавіта пра ўзровень забяспечанасці іх прадуктамі харчавання і рэчамі штодзённага ўжытку.

Каштоўнай крыніцай з'яўляюцца зводкі органаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР. У іх змяшчаюцца факты недахопаў, якія назіраліся на асобных прадпрыемствах пры ажыццяўленні матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў. Акрамя гэтага зводкі адлюстроўваюць характар узаемаадносін у калектывах паміж стаханаўцамі і астатнімі працоўнымі, адмоўнае стаўленне некаторых рабочых і калгаснікаў да лепшага матэрыяльнага становішча стаханаўцаў.

Вялікае значэнне для вывучэння стаханаўскага руху, матэрыяльна-бытавога забеспячэння яго ўдзельнікаў, правядзення культурнай працы з імі маюць дакументальныя крыніцы прафсаюзных арганізацый. Грунтоўныя звесткі, напрыклад, змяшчаюць у сабе дакументы Беларускага рэспубліканскага савета прафесійных саюзаў (НАРБ, фонд 265), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых тарфяной прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 277), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых гарбарнай прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 283), Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза рабочых малочна-мясных саўгасаў (НАРБ, фонд 297), Мінскага абласнога камітэта прафесійных саюза рабочых МТС (ДАМВ, фонд 493), Віцебскага гарадскога савета прафесійных саюзаў (ДАВВ, фонд 1021) і іншыя.

У адзначаных архіўных фондах змяшчаецца бягучая перапіска паміж цэнтральнымі прафсаюзнымі органамі і прафсаюзнымі камітэтамі прадпрыемстваў, дзе адлюстраваны пытанні бытавога і культурна-масавага абслугоўвання стаханаўцаў і іх сем'яў, у прыватнасці багаты матэрыял па арганізацыі курортнага адпачынку перадавікоў. Вялікі пласт дакументаў прафсаюзных арганізацый займаюць справаздачныя матэрыялы, якія ўключаюць у сябе звесткі пра правядзенне мерапрыемстваў стаханаўскага руху, дакладныя запіскі пра стан руху па асобных прадпрыемствах і раёнах (у іх знаходзіцца інфармацыя, якая датычыцца ўзроўню заработнай платы стаханаўцаў, крыніц фарміравання бюджэту іх сем'яў, харчовага і жыллёвага забеспячэння перадавікоў, іх медыцынскага, культурнага абслугоўвання, цікавымі з'яўляецца вынікі апытанняў стаханаўцаў, па якіх можна прасачыць узровень матэрыяльнага становішча перадавікоў і характар іх побытавых патрэбаў). Важнай крыніцай у справаздачнай дакументацыі з'яўляюцца спісы стаханаўцаў па асобных гаспадарчых адзінках, рэгіёнах і БССР у цэлым, дзе ўказаны ўзрост, працоўны стаж, сацыяльнае паходжанне, а таксама адзначаны матэрыяльныя і маральныя ўзнагароды перадавікоў за працоўныя рэкорды. Інфармацыю пра сістэму аплаты працы стаханаўцаў і іх колькасны склад утрымліваць у сабе статыстычныя дадзеныя прафсаюзных арганізацый.

Сярод архіўных крыніц трэба вылучыць дакументы асобных прадпрыемстваў. Напрыклад, фонд Віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната (ДАВВ, фонд 96) утрымлівае улікова-кантрольную дакументацыю, прадстаўленную ў выглядзе індывідуальных картак стаханаўцаў з іх біяграфічнымі звесткамі, характарыстыкамі працоўнай і грамадскай дзейнасці, узроўнем заработнай платы.

Другую вялікую групу крыніц складаюць апавядальныя. Сярод іх важнае значэнне для даследавання штодзённасці маюць папулярныя брашуры, выдадзеныя ў другой палове 1930-х гг. [1, 5, 7–11], у якіх змяшчаюцца аўтабіяграфіі стаханаўцаў і іх расказы пра здзяйсненні сваіх працоўных рэкордаў, пра матэрыяльны стан. Нягледзячы на тое, што брашуры былі надрукаваныя з агітацыйнымі мэтамі для стварэння ідэальнага вобразу стаханаўцаў у грамадстве і ўтрымліваюць у сабе шмат савецкіх моўных штампаў, гэтыя крыніцы паказваюць на тое, як паляпшаліся ўмовы жыцця стаханаўцаў, і якую палітыку праводзіла дзяржава для павышэння іх культурнага ўзроўню.

Каштоўнай групай крыніц, якая сумяшчае рысы як апавядальнага, так і дакументальнага тыпу, з'яўляецца перыядычны друк. Пры правядзенні даследавання штодзённага жыцця стаханаўцаў вялікае месца займаюць матэрыялы рэспубліканскіх газет "Звязда", "Рабочий" і "Советская Белоруссия". Публікацыі ў пералічаных выданнях дазваляюць значна дапоўніць дакументальныя звесткі пра разгортванне стаханаўскага руху і становішча стаханаўцаў. У прыватнасці ў газетах быў надрукаваны шэраг пастаноў дзяржаўных і прафсаюзных органаў, што датычыліся паляпшэння матэрыяльных умоў жыцця стаханаўцаў і ўзнагарод за выдатную працу. Багаты матэрыял змяшчаюць у сабе артыкулы карэспандэнтаў газет: тут вызначаецца пэўная інфармацыя па харчоваму і жыллёваму забеспячэнню стаханаўцаў, арганізацыі іх адпачынку і вольнага часу, мерапрыемствах, звязаных з ўзбагачэннем ведаў перадавікоў. У прыватнасці шмат матэрыялаў у газетных публікацыях можна знайсці пра дзейнасць Універсітэта выхаднога дня для стаханаўцаў Мінска.

Важнае месца сярод газетных публікацый займаюць эпісталярныя матэрыялы – гэта індывідуальныя і калектыўныя лісты стаханаўцаў у рэдакцыі газет, у якіх пераважна змяшчаліся скаргі на недахопы працы мясцовых кіраўнікоў пры арганізацыі харчавання, адпачынку, забеспячэння жыллём, таварамі першай неабходнасці, а таксама прыводзіліся прапановы па лепшаму правядзенню вольнага часу. Хаця адзначаныя лісты былі строга адрэдагаваныя, яны змяшчаюць у сабе каштоўную інфармацыю пра асаблівасці ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на матэрыяльную падтрымку стаханаўцаў і вызначаюць праблемы, якія ўзнікалі пры гэтым. Акрамя таго па адзначаных лістах можна вылучыць спецыфіку ўсведамлення "знатнымі людзьмі" свайго месца ў грамадстве і іх матэрыяльныя патрэбы.

Рэспубліканскія газеты таксама змяшчаюць у сабе шэраг выяўленчых матэрыялаў, прадстаўленых фотаздымкамі, якія адлюстроўваюць розныя бакі побыту стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Безумоўна, што гэта былі ў большасці сваёй пастановачныя фота, што мелі агітацыйных характар, але, нягледзячы на гэта, яны даюць магчымасць вызначыць высокі статус стаханаўцаў у грамадстве і паказаць, як іх штодзённасць звязвалася з паказнымі бакамі тагачаснага грамадскага жыцця.

Такім чынам, для вывучэння штодзённага жыцця стаханаўцаў БССР можа быць выкарыстаны шэраг разнастайных крыніц: пастановы вышэйшых дзяржаўных і гаспадарчых органаў БССР і СССР, што датычыліся арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, і дзе вызначаліся задачы па паляпшэнню матэрыяльнага становішча ўдзельнікаў стаханаўскага руху; справаводчыя дакументы партыйных і прафсаюзных арганізацый, у якіх знаходзіцца багаты матэрыял па заработнай плаце, харчоваму,

медыцынскаму і жыллёваму забеспячэнню стаханаўцаў, мерапрыемствах па арганізацыі іх вольнага часу; папулярныя брашуры аб стаханаўцах розных галін і прадпрыемстваў БССР з іх кароткімі аповядамі пра свой жыццёвы і працоўны шлях; публікацыі рэспубліканскіх газет, што даюць дадатковую інфармацыю пра розныя бакі штодзённасці стаханаўцаў, змяшчаюць лісты, фотаздымкі з побыту перадавікоў.


1. За стахановскую работу на стройках. – Мн.: Государственное издательство Белоруссии, 1936. – 84 с.
2. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: в 6 т. / Ин-т истории при ЦК КПБ. – Мн.: Беларусь, 1983–1987. – Т. 3: 1933–1945 / под ред. Г. Г. Барташевича и др. – 1985. – 551 с.
3. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – 9-е изд., доп. и испр. – М: Политиздат,1983 – 1990. – Т.6. – 1985. – 431 с.
4. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц-стахановцев. 14–17 ноября 1935 г. Стенографических отчёт. – М.: Партиздат ЦК ВКП(б), 1935. – 397 с.
5. Радасная праца, радаснае жыццё. – Мн.: Дзяржнаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
6. Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919–1941 гг.): документы и материалы / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР и др.; [Составитель Васильева Р.С. и др.]. – Мн: Беларусь, 1980. – 272 с.
7. Стаханаўкі льнаводства БССР. – Мн.: Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 35 с.
8. Стаханаўская змена на скурзаводзе “Бальшавік”. – Мн.: Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 64 с.
9. Стаханаўскім шляхам. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
10. Стаханаўцы “Камунаркі”. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
11. У калоне перадавікоў. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.



**Кузнецова Т.И.**


## „ES VIŅU PAZĪSTU: LATVIEŠU BIOGRĀFISKĀ VĀRDNĪCA” (1939): ОПЫТ АНАЛИЗА ИСТОЧНИКА

В основе данной работы лежит ряд не блещущих новизной, но для автора важных положений, которые определяют методы анализа исторических источников и, прежде всего, вербально-письменных. Во-первых, исторический источник – это любой текст, понимаемый как различного характера внешнее выражение человека, которое в силу этого является актом и результатом коммуникации. Поэтому текст можно определить как узел разнохарактерных и разноуровневых социальных связей. Во-вторых, текст является целостностным и качественно определенным. В-третьих, природа текста двойственна: он и творение, исторически, социально и индивидуально обусловленное в своем «рождении», и творец, обладающий социальным созидательно-разрушительным потенциалом. В-четвертых, ядром текста (в обоих его ипостасях) является воплощенная в нем, в его разного уровня структурных компонентах определенная картина мира, причем как отражающая наличные представления людей о себе и о мире, так и формирующая их. И в-пятых, любого характера текст есть составная часть социальной реальности – «физической», и эмоционально-ментальной, являющейся предметом исторической науки. И сама реальность предстает системой разнородных текстов, анализируя которые историк пытается увидеть, понять и в конечном итоге реконструировать социальное целое.

Для Латвии конца 30-х годов XX века особой значительностью обладал такой текст как биографический словарь «Es viņu pazīstu: Latviešu biogrāfiskā vārdnīca/ Я его знаю: Латышский биографический словарь», изданный в 1939 году. Редактором этой книги стал человек достаточно молодой (родился в 1902 году), закончивший классическую гимназию в Елгаве, учительские курсы, изучавший в Латвийском университете теологию и юриспруденцию и рано начавший активную жизнь публициста: с 1923 по 1975 год он был членом редакции и редактором многих газет и журналов, опубликовав более 1000 газетно-

журнальных статей и написав 12 книг, – к 1979 же году заведовавший 10. Рижской городской библиотекой [1, с. 504] – Жанис Унамс. По его свидетельству, работа над составлением биографического словаря была начата в январе 1939 года и закончена в ноябре того же года. Сия книга уникальна как своей типичностью, так и экстраординарностью. Она типична, поскольку вписывается в известный ряд биографических изданий, дающих синхронический срез общества. Но одновременно и исключительна как по актуализации в ней структуры исторического календаря, ежедневно публикуемого на страницах газеты «Brīvā Zeme»/«Свободная Земля» [см.: 4], так и по придаваемому ей с самого начала статусу. Вдохновителем подготовки и публикации данного издания, а также автором его названия был Карлис Улманис – глава правительства и президент страны. Книга вышла для масштаба Латвии немалым тиражом в 6500 экземпляров и разошлась, по словам Ж. Унамса, за пять месяцев [1, с. 3]. Тотчас же приступили к разработке второго дополненного издания, в которое предполагалось включить уже около 8000 биографий. Оно должно было увидеть свет в ноябре 1940 года. При этом имело место намерение каждые 2 – 3 года переиздавать с дополнениями данный биографический словарь. Подобные замыслы указывают на статус действенного идеологического средства консолидации общества, его стабилизации, в чем оно весьма нуждалось в 1939 году. Это был год, когда, как отметил К. Улманис в своем обращении к народу 12 октября (причем опубликована было речь К. Улманиса как на латышском, так и на русском языках), «события на полях войны и в кабинетах государственных мужей происходят с невиданной прежде, невероятной стремительностью» [1, с. 1], когда уже начался отъезд балтийских немцев в Германию и об этом же стала думать часть латышей [1, с. 7], когда среди них в связи с заключением договора о взаимопомощи с Советским Союзом на фоне эмиграции немцев возникли панические настроения [1, с. 7]. Об идеологической, социально-созидательной значимости этой книги говорит и факт её переиздания в 1975 году в Мюнхене под редакцией того же Ж. Унамса.

Итак, какая модель осмысления и переживания общества формировалась биографическим словарем „Es viņu pazīstu”, обеспечивая его идеологическую функцию? Первостепенное значение в её выявлении имеют такие параметры текста как название книги и соотнесенный с ним отбор материала.

Название исследуемого текста – «Es viņu pazīstu: Latviešu biogrāfiskā vārdnīca/ Я его знаю: Латышский биографический словарь» – указывает, во-первых, на людскую общность, скрепленную энергией личных отношений («я его знаю») и потому эмоционально окрашенную, причем подчеркивается активность, инициатива, исходящие от индивидуального я; во-вторых, на бытие в настоящем, поскольку личное местоимение «я» обнажает «вот-здешность» [5, с. 468]; в третьих, на этническую гомогенность социума. Однако содержание книги, отбор информации и характер её подачи не вполне соответствует задаваемым контурам образа латышского общества. Так, данная книга демонстрирует диахронический срез общества, включая в свой состав лиц как живших в IX веке, так и родившихся в веке XX. Например, с одной стороны, упоминается Локерс, бывший в конце IX в. правителем куршей и, по сведениям Саксона Грамматика, разбивший датчан, пленивший их вождя Хавдинга и даровавший ему после исцеления свободу [1, с. 317]. С другой же стороны, в биографическом справочнике находим данные о весьма молодом человеке – конькобежце Альфонсе Берзиньше, появившемся на свет в 1916 году [1, с. 68]. Подобный подбор персонажей утверждал укорененность латышей в мире, создавал временную перспективу, обнаруживал глубину настоящего и тем самым внушал представление о настоящем моменте как достигнутой цели на долгом пути. О

правомерности такого вывода свидетельствуют устойчивые обороты встречающиеся в характеристике лиц: «борец за права крестьян»[*], «участник борьбы за свободу»[†], «пал смертью героя»[‡] или «пал смертью мученика»[§]. Более того подобные лексические формулы, отмечающие акт жертво-приношения/самопожертвования, придают настоящему состоянию латышского общества оттенок сакральности и обещания экзистенциальной вечности.

Парадигмально такое видение человеческого мира связано с новозаветной концепцией истории. Однако очевидно существенное отклонение от неё: новозаветно-христианское представление об истории, признавая в ней цель, отрицает достижимость её сейчас и здесь и тем самым исключает абсолютизацию какого-либо земного сообщества, манифестирует её (цели) долженствование и одновременно принципиальную неизвестность сроков её исполнения. И, таким образом, наличный мир всегда предстает в состоянии становления [см., например, 3, с. 98].

Диахроничность содержания анализируемой книги состоит и в значительном удельном весе имен лиц, к 1939 году уже ушедших в мир иной: таковых 777 (из общего числа 6336), причем весома доля тех, кто жил и умер до 1900 года (280 из 777), т. е. тех, кто принадлежал к иным поколениям, не могущим встретиться во времена Первой Латвийской республики. Сочетание живых и мертвых в пространстве одной книги вкупе с принципиальной незавершенностью её (уже в первое издание в связи с уехавшими из страны немцами были внесены изменения) формировало представление об обществе как растущем органическом целом. Быть может, потому так существенен генеалогический момент в структуре сведений о включенных в биографический словарь людях, которй заставлял сообщать данные (имена, род занятий) об отцах, матерях, мужьях, женах, братьях.

Для этого «организма» важны все его члены, независимо от возраста (возрастной перепад составляет от 90 до 20 лет) и социальной значимости лица. Таким образом вырисовывается путь долгой напряженной борьбы, приведший к органическому единству, основание коего – этноцентризм, проявлявшийся двояко. По отношению к настоящему он сказался в тщательной фиксации (со всеми перемещениями на протяжении жизни) разного уровня должностных позиций, занимаемых латышами, и акцентированием их плодотворной деятельности в области науки, искусства и литературы. По отношению же к прошлому этноцентризм выразился в том, что большинство прежде живших на территории Латвии представителей инонациональных групп (особенно немцы) упомянуты в связи с их заслугами перед латышами или просто положительным отношением к последним.[**] При этом заданный названием рассматриваемого текста и очевидный в характере описания лиц этноцентризм сочетался с полиэтничностью состава этих лиц. Так, в книге упоминаются 129 немцев, 68 русских, 12 поляков, 8 литовцев, 8 евреев, а также датчане, голландцы, англичане, белорусы, венгр, «размещение» которых во времени различно. Заметны насыщенность прошлого немцами и необремененность его

---

[*] См., например: «Дзирна Тенис, 1735 – 1808, сельский хозяин, борец за права латышских крестьян» [1, с. 148].

[†] Например: «Бекерис Паулс, сельский хозяин, старейшина Баускской волости, родился в 1901 году, участвовал в борьбу за свободу Латвии 1, с. 61].

[‡] Например: «Эмберс Арнолдс, 1901 – 1920, солдат Резекненского полка, пал смертью героя у Мечан на Латгальском фронте» [1, с. 156].

[§] Например: «Фихтенбергс Карлис, 1886 – 1919, лейтенант, герой борьбы за свободу Латвии, пал смерть мученика» [1, с. 164].

[**] Например: «Бруинингс Карлис, 1782 – 1848, прибалтийский немец, хозяйственник, доброжелатель латышей» [1, с. 100].

присутствием других, что вкупе с подчеркиванием благих деяний немцев для латышей подводило к мысли о будущем скорее с немцами, чем с кем-либо другим, ибо залог тому – весьма гармоничное прошлое.

Кроме того, выявленный отбор материала и характер его подачи, во-первых, должен был снять определенное напряжение в отношениях с немцами в 1939 году, а во-вторых, открывали возможность расширительной интерпретации этнонима «латыш», который на фоне достаточно частого упоминания представителей инонациональных общностей становился обозначением гражданина Латвии.

Содержание книги не вполне отвечало заявленному в её названии принципу этнической гомогенности ещё и в том плане, что в ней значителен удельный вес имен иностранцев – подданных других стран, которые то благоволили латышам, Латвии (таких лиц 27), то были почётными консулами Латвии (таковых фигур 60). Подобным образом утверждалось присутствие Латвии в мировом, главным образом западном пространстве.

Итак, проведенный анализ книги «Es viņu pazīstu» позволяет определить предлагаемую ею модель осмысления и переживания социума как эмоционально-чувственную, для которой характерны следующие представления:

1) мы укоренены во времени и потому являемся историческим народом;

2) мы есть растущее органическое целое, состоящее из множества членов, заметных и почти неизвестных, но необходимых для существования целого;

3) мы находимся в западном, европейском пространстве.

Такая система представлений вела к определенной абсолютизации наличного состояния общества, вербальным воплощением которого и стала данная книга.


1. Es viņu pazīstu : Latviešu biogrāfiskā vārdnīca / Žanis Unāms. – [B. v.]: Raven Printing, 1975.
2. Uguns šķīsta zeltu, grūtības – cilvēku: Valsts Prezidenta K. Ulmaņa Vēstījums tautai 12. oktobrī 1979. g. – [B. v.]: Rota, [b. g.] – 1.–9. lpp.
3. Аверинцев, С. Поэтика ранневизантийской литературы / С. Аверинцев. – Москва: Coda, 1997. – 343 с.
4. Кузнецова, Т. История на страницах «Brīvā Zeme» (1929): некоторые особенности подачи информации в историческом календаре / Т. Кузнецова // Daugavpils Universitātes Humanitārās fakultātes XII Zinātniskie lasījumi: Vēsture VI (1). – Daugavpils: Saule, 2003. – С. 100–109.
5. Топоров, В.Н. Об индивидуальных образах пространства: «феномен» Батенькова / В.Н. Топоров. – Миф. Ритуал. Символ. Образ: Исследования в области мифологического. – Москва: Прогресс; Культура, 1995. – С. 446–475.



**Новікаў С.Я.**


## ФРАНТАВЫЯ БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ЛЕТАМ 1941 г. У АЙЧЫННЫХ І ЗАМЕЖНЫХ ДАКУМЕНТАХ: ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ

З мэтай стварэння комплекснай карціны баявых дзеянняў у ходзе двух танкавых контрудараў, праведзеных камандаваннем Заходняга фронту на лепельскім напрамку ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, неабходна пачаць з Дырэктывы № 16 ад 4 ліпеня 1941 г. [1, с. 340]. У ёй новае камандаванне на чале з Маршалам С.К. Цімашэнка вызначыла мэты і ставіла задачы для вайсковых часцей фронту, у тым ліку для 5-га і 7-га мехкарпусоў 20-й арміі: ліквідаваць лепельскую групоўку праціўніка, якая наступала з раёна Лепеля, Полацка ў напрамку Віцебска. Для гэтага ў штабе арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П.А. Курачкіна быў распрацаваны план аперацыі, адпаведна якому: 7-му МК была загадана наступаць з раёна Віцебска ў напрамку Бешанковічы – Лепель; у далейшым нанесці ўдар па флангу і ў тыл полацкай групоўкі 3-й танкавай групы праціўніка; 5 МК нанесці ўдар ў напрамку Сянно – Лепель з мэтай

далейшага развіцця ўдару на захад, на Глыбокае і Докшыцы. Гэта азначала, што два цалкам самастойных контрудары ў напрамку Лепеля адначасова павінны былі правесці 5-ы і 7-ы МК, якія наносілі танкавыя ўдары па збежных напрамках на Лепель. У загадзе камандарма 20-й арміі ў якасці тэрміну пераходу ў контрнаступленне была вызначана дата 5 ліпеня 1941 года, 6 гадзін раніцы [1, с. 340].

Наступным крокам бачыцца выяўленне фактычнай укамплектаванасці танкамі савецкіх мехкарпусоў на момант пачатку нанясення котрудараў. З айчынных архіўных дакументаў* вынікаюць наступныя даныя: у 13-й і 17-й танкавых дывізіях (ТД) 5-га МК па стану на 7 ліпеня 1941 г. было 838 танкаў, тады як у 7-м МК (у 14-й і 18-й ТД) іх было толькі 507 баявых адзінак [1, с. 334, 347]. Адразу ж звернем увагу на неабходнасць карэляцыі даных, якія выкарыстоўваюцца ў айчынных даследаваннях, з аднаго боку, а з другога – прыведзеных паводле журнала баявых дзеянняў 5-га МК. У апошнім вялося штодзённае апісанне ходу баёў 13-й, 17-й танкавых і 109-й мотастралковай дывізій і прыводзілася ацэнка вынікаў "Лепельскай аперацыі з 6 па 11 ліпеня 1941 г.": корпус прыбыў на фронт па штатах мірнага часу. На 5 ліпеня ў танкавых дывізіях укамплектаванасць выглядала наступным чынам: па 2 батальёны танкаў БТ-7 (усяго 100 машын); па адным батальёне танкаў Т-26 (усяго па 31 машыне) і адным батальёне танкаў ХТ-26 (усяго па 31 танку). Як бачна, сярод названых лічбаў табліцы і фактаў дакумента найбольшая ступень карэляцыі назіраецца толькі ў апошнім выпадку. Узнікае пытанне, наколькі ўліковы штат танкавага парку быў задзейнічаны ў баявых дзеяннях у час Лепельскай аперацыі. У танкавым палку мотастралковай дывізіі па штату знаходзілася 158 танкаў, з якіх на фронт прыбылі толькі 70 танкаў, астатнія 88 танкаў да раёна выгрузкі на ўчастку Смаленск – Орша не дайшлі. Пры гэтым жа згадваецца, што ўсяго корпус быў укамплектаваны 802 танкамі [2, арк. 102].

З дакументаў бачна, што на пачатак нанясення контрудараў двумя механізаванымі карпусамі агульная колькасць баявых машын складала 1345 танкаў розных тыпаў, у тым ліку 96 танкаў КВ і Т-34. Таксама неабходна мець на ўвазе 153 бронеаўтамабілі, якія знаходзіліся на ўзбраенні 5-га механізаванага корпуса, і 70 танкаў, якія прыбылі разам з мотастралковым палком у раён Оршы. Дакументы сведчаць, што з баявых машын новых тыпаў большасць знаходзілася ў 7-м механізаваным корпусе, дакладна ў 14-й танкавай дывізіі, у якой на тэрыторыі Беларусі ваяваў сын Сталіна Я.І. Джугашвілі.

Аб колькасці танкаў з нямецкага боку існуюць частковыя звесткі. Паводле выяўленых на цяперашні час дакументаў можна ўбачыць наступную карціну укамплектаванасці танкамі 7-й і 12-й нямецкіх ТД у пачатку ліпеня 1941 г. Па стану на 1.7.41 г. на ўліку у іх знаходзілася 342 танкі, з якіх 71 Pz.II, 219 LT v. 38, 17 Pz. III і 35 Pz. IV [3, Bl. 13]. З параўнання прыведзеных у айчынных і нямецкіх дакументах лічбавых даных вынікае наступны вывад: танкавы парк 5-га і 7-га савецкіх МК значна пераўзыходзіў колькасць машын нямецкага баявога парку. Дакументальныя звесткі паказваюць суадносіны баявой тэхнікі з савецкага і нямецкага бакоў. Як пісаў пра гэта былы начальнік штаба 5 МК палкоўнік В.В. Буткоў [4, с. 63] па танках удзельнікі контрудару на лепельскі напрамку пераўзыходзілі нямецкі бок ў 3–4 разы. Апрача таго, неабходна мець на ўвазе фактар адначасовага ўдзелу баявых машын у танкавым баі на адной баявой прасторы. З дзённікаў баявых дзеянняў савецкіх танкавых дывізій вынікае, што баі ў асноўным вяліся з удзелам палкоў, але не дывізій, не кажучы пра адначасовы ўдзел танкаў усяго корпуса ў баях пад Сянно і Лепелем.

---

* Аўтар выказвае падзяку маскоўскаму ваеннаму гісторыку кандыдату гістарычных навук У.В. Фядзюніну за інфармацыйную падтрымку.

Аналіз як айчынных, так і замежных дакументальных крыніц дазваляе выявіць тыя аспекты баявых дзеянняў, якія раней заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў. Звернем увагу на "Баявое данясенне № 8" ад 8 ліпеня 1941 г., у якім камандуючы 20-й арміяй даносіў аб выніках баявых дзеянняў 5-га і 7-га механізаваных карпусоў у першыя тры дні з моманту пачатку Лепельскай аперацыі [5, с. 325–326]. Ён дакладаў у Генеральны штаб пра тое, што 5 і 7 МК працягвалі выконваць задачу па знішчэнні лепельскай групоўкі праціўніка, наносячы ўдары ў напрамку Сянно, Лепель. Пры гэтым 7-ы МК пад прыкрыццём 153-й стралковай дывізіі і мотастралковых часцей 18-й танкавай дывізіі, якая займала раён Сянно, у 13 гадзін пачаў перагрупоўку да левага флангу. У той жа час танкі праціўніка пры падтрымцы авіяцыі атакавалі правы фланг 18-й танкавай дывізіі з лясоў на поўнач ад Сянно і перайшлі ў наступленне, заняўшы Новае Сяло (6 км на ўсход ад Сянно). Бой працягваецца. 5-ы МК да 9 гадзін раніцы заняў зыходнае палажэнне ў раёне саўгасу Федэратыўны, Лозы, ст. Клімавічы (10–15 км на поўдзень ад Сянно), маючы насупраць сябе 27-ю мотадывізію праціўніка, якая з артылерыяй абараняецца на рубяжы Вяцера, Дзідава. Адбіўшы а 13-й гадзіне на рубяжы Чырвоны Маяк, Азярышча атаку каля 100 танкаў, падтрыманых авіяцыяй, корпус перайшоў у наступленне, прычым 17-я танкавая дывізія на ўчастку Вялікія і Малыя Ліпавічы (20 км на паўднёвы захад ад Сянно) разграміла 36-ы мотастралковы полк 27-мотадывізіі, знішчыла цяжкую батарэю, пры лёгкія батарэі і пяць супрацьтанкавых гармат. На полі бою праціўнік пакінуў шмат трупаў. Рэшткі праціўніка на машынах адышлі ў напрамку на Чарэю, якія праследуюць часці 17-й танкавай дывізіі. У гэты ж час 13-я танкавая дывізія ў баях на поўдзень ад Сянно разграміла да двух батальёнаў 34-га мотапалка 27-й мотадывізіі. У якасці баявой задачы наступнага дня быў вызначаны працяг наступлення чатырма дывізіямі двух МК у агульным напрамку на Лепель з тым, каб разграміць лепельскую танкавую групоўку праціўніка [5, с. 326].

У адпаведнасці са "Справаздачай аб баявых дзеяннях 13-й танкавай дывізіі 5-га МК", да 9.00 раніцы 8 ліпеня ёй ставілася задача наступаць у напрамку Лукомль і Лепель, знішчыць праціўніка і да зыходу дня авалодаць паўднёвай часткай Лепеля. Выкананне баявой задачы забяспечвалі два танкавых палкі – 25-ы і 26-ы, 13-ы мотастралковы полк, 13-ы артылерыйскі полк. Атака пачалася ў 12.00 без артылерыйскай падрыхтоўкі, паколькі да таго моманту артылерыйскі полк, зенітны дывізіён і батальён цяжкіх танкаў знаходзіліся толькі на падыходзе да раёна зыходных баявых пазіцый. Таму першы дывізіён 13-га артылерыйскага палка заняў пазіцыі і адкрыў агонь толькі а 14-й гадзіне, тады як другі дывізіён дасягнуў раён агнявой падрыхтоўкі толькі ў 17 гадзін, таму фактычна не ўдзельнічаў у баявых дзеяннях. У раёне Навінкі, Толпіна дывізія сутыкнулася з моцна арганізаванай процітанкавай абаронай. Праведзеныя дывізіяй з 16.00 да 20.00 некалькі танкавых атак прывялі да вялікіх страт, але поспеху не прынеслі. Больш таго, на працягу другой паловы дня і да 20 гадзін вечара актыўна дзейнічала нямецкая авіяцыя і ад бесперапыннага ўздзеяння варожых штурмавікоў дывізія панесла значныя страты ў танках. Цяжкія танкі, якія складалі рэзерв дывізіі, былі выкліканы на месца бою, але прыбылі толькі ў 20.00. Таму дзённае наступленне сарвалася. Баявая матэрыяльная частка патрабавала папаўнення і боезапасаў. У дакуменце адзначаецца, што часці дывізіі панеслі вялікія страты: 26-ы танкавы полк страціў 47 танкаў, 25-ы – 27, батальён цяжкіх танкаў – 6 танкаў. На наступны дзень дывізія не вяла баявых дзеянняў, але трапляла пад удары нямецкай бамбардзіровачнай авіяцыі. 10 ліпеня 13-я дывізія апынулася ў нямецкім акружэнні [6, арк. 5–6].

Паводле "Справаздачы аб баявых дзеяннях часцей 17-й танкавай дывізіі з 4.7.41 г. да 19.7.41 г.", галоўнай задачай для дывізіі з'яўляўся захоп Лепеля [7, Арк. 27–32]. На працягу ўсяго дня 7 ліпеня 33-і і 34-ы танкавыя палкі дывізіі праводзілі запраўку

матэрыяльнай часці палівам, але сутыкненняў з праціўнікам не мелі. На раніцу 8 ліпеня праціўнік панёс страты ў раёне Вялікіх Ліпавічаў, дзе ўдалося захваціць 24 гарматы розных калібраў, 3 танкі, 4 трактары і 3 аўтамашыны. Аднак у 18 гадзін дывізія была атакаваная праціўнікам сілаю да 60 танкаў і 600 матацыклістаў, пасля чаго 33-і танкавы полк апынуўся ў акружэнні. Апроч таго, як падкрэсліваецца ў справаздачы, з 18.00 да 21.00 авіяцыя праціўніка бесперапынна наносіла ўдары па падраздзяленнях дывізіі ў раёнах Цэрэбені, Малыя і Вялікія Ліпавічы. Танкі, якія б маглі аказаць дапамогу палку, не маглі выканаць пастаўленую задачу па прычыне таго, што нямецкая авіяцыя літаральна палявала за кожнай савецкай баявой машынай. 34-ы танкавы полк страціў у выніку баёў 8–10 ліпеня 1941 г. 84 адзінкі баявой тэхнікі і 72 чалавекі, у тым ліку 41 чалавек малодшага і старшага начскладу. Так, адсутнасць своечасовых і дакладных даных ад разведкі прывялі да таго, што 8 ліпеня 34-ы танкавы полк загубіў большую частку сваіх танкаў, паколькі яны апынуліся ў балоце і былі знішчаны артылерыйскі агнём праціўніка. У дакуменце таксама адзначаецца, што ў выніку баёў у раёне Сянно, Ліпавічы, Ляды, Софнеўка і Потава праціўніку былі нанесены вялізныя страты: дывізія знішчыла 40 танкаў, 10 бронемашын, 89 грузавых аўтамашын, разграміла два штабы і цэлы шэраг іншых відаў узбраенняў. Асобна зазначым, што паводле справаздачы за перыяд з 7.7.41 г. па 5.8.41 г. часці 17-й танкавай дывізіі правялі толькі 4 (!) танкавыя атакі, і адзін раз былі атакаваны праціўнікам у колькасці 60 танкаў [7, арк. 32].

Зварот да нямецкіх дакументаў дазваляе ўбачыць з процілеглага боку асобныя баявыя падзеі. Звернемся да справаздачы 17-й нямецкай танкавай дывізіі, якая ўдзельнічала ў баях пад Сянно ў ходзе свайго маршу на Коханава. Нагадаем чытачу, што перад баямі пад Сянно дывізія з агульнай колькасці 239 танкаў мела толькі 80 баявых машын, якія складалі рухомы агнявы кулак баявой групы пад камандаваннем палкоўніка Ліхта. З дакумента вынікае, што за часам 6-дзённага (з 5 па 10 ліпеня) баявога рэйду праз Сянно ў напрамку Коханава (паміж Талачынам і Оршай. – С.Н.) на полі бою дывізіяй былі знішчаны звыш 250 танкаў 5-га савецкага танкавага корпуса, з якіх з удзелам баявога атрада дывізіі крыху больш за 100 машын, тады як большая частка пры дапамозе нямецкай авіяцыі [8, Bl. 6]. Значная частка танкавых страт была панесена ў раёне Толпіна, дзе дзейнічаў 39-ты танкавы полк 17-й ТД. У выніку баёў на працягу толькі аднаго дня 8 ліпеня ім былі знішчаны 68 савецкіх танкаў, з якіх 51 танк быў ліквідаваны ў выніку вядзення агню адным процітанкавым батальёнам [8, Bl. 6].

Важным падаецца нам і такі факт вядзення баявых дзеянняў як савецкімі, так і нямецкімі баявымі часцямі. Так, напрыклад, 7 ліпеня ў раёне Дубравы–Гняздзілавічы, дзе паміж Бешанковічамі і Астроўна вяла наступленне 14-й савецкая танкавая дывізія, 7-я мотапяхотная брыгада 7-й нямецкай танкавай дывізіі на працягу аднаго дня знішчыла 103 танкі, у тым ліку 2 танкі КВ і 4 танкі Т-34, тады як самі немцы пры гэтым страцілі 2 танкі, 1 цяжкую процітанкавую і 2 лёгкіх штурмавых гарматы, адну процітанкавую гармату калібрам 5,0 см (50 мм), 2 зенітныя гарматы калібрам 8,8 см (88 мм) і 2 аўтамабілі [9, Bl. 294]. Паводле данясення 39-га нямецкага армейскага корпуса, 7-я дывізія на працягу баёў пад Віцебскам з 6 па 12 ліпеня знішчыла 198 танкаў, 15 гармат, 14 процітанкавых гармат, 608 аўтамабіляў, 4 самалёты і ўзяла ў палон 620 палонных. Большая частка гэтых трафеяў былі ўзяты на паўднёвым захадзе ад Віцебска, каля Сянно і Дубровы. На долю 12-й танкавай дывізіі, якая значна пазней уступіла ў баявыя дзеянні пад Сянно, прыпадае 146 танкаў, большая частка з якіх былі знішчаны ў тым раёне. Усяго 39-м нямецкім армейскім корпусам на Віцебшчыне, у раёне Улы і каля Віцебска, быў знішчаны 371 танк, з якіх абсалютная большасць у ходзе баёў пад Сянно. Трэба мець на ўвазе, што баявыя дзеянні з удзелам 7-га і 5-га Мк працягваліся і пасля завяршэння баёў пад Сянно. Так, напрыклад, 14-я танкавая дывізія 7-га механізаванага корпуса страціла з 13 па 17 ліпеня ў раёне Лёзна яшчэ 89 танкаў [10, Bl. 464–465].

На аснове аналізу дзённікаў баявых дзеянняў 7-й, 12-й, 20-й танкавых і 20-й матарызаванай нямецкіх дывізій 3-й танкавай групы (з пачатку ліпеня 4-й танкавай арміі. – С.Н.), а таксама 17-й танкавай дывізіі 2-й танкавай групы атрымліваецца, што ў ходзе баявых дзеянняў у раёне Дубравы, Бешанковічаў, Сянно, а таксама Улы і Віцебска, а у таксама Лёзна да сярэдзіны ліпеня 1941 г. былі знішчаны 694 савецкія танкі, меншая палова якіх была страчана 13-й і 17-й савецкімі танкавымі дывізіямі 5-га механізаванага корпуса ў раёне Сянно [10, Bl. 464–465].

Страты асабовага складу 7-й і 12-й нямецкіх ТД з 30.6 па 13.7.41 г. склалі 2967 чалавек, з якіх забытымі 759, параненымі – 2108, зніклымі без вестак – 100 афіцэраў, унтэрафіцэраў і радавых [11, Bl. 149]. З нямецкіх дакументаў вынікае, што ў ходзе баявых дзеянняў на Віцебшчыне агульныя страты нямецкіх афіцэраў склалі амаль трэць ад агульных страт, панесеных баявымі часцямі з пачатку баявых дзеянняў на савецкай тэрыторыі. Суадносіны унтэрафіцэраў і радавых, страчаных на Віцебшчыне, у тым ліку ў час баявых дзеянняў пад Сянно і Лепелем, складалі крыху менш за чвэрць ад агульных страт. Паводле дакументаў 5-га савецкага механізаванага корпуса, у выніку баёў з 8 па 11 ліпеня агульныя страты ў жывой сіле з корпусе складалі 646 чалавек, у тым ліку 138 забітымі і 357 прапаўшымі без вестак [12, арк. 111]. Дакладных даных аб фактычных стратах, панесеных 3-й нямецкай танкавай групай у баявой тэхніцы, на гэты момант аўтарам не выяўлена. Вядома толькі тое, што ў 2-й танкавай групе па стану на 7.7.41 г. баяздольнымі ў танкавых парках нямецкіх дывізій лічылася: у 3-й і 18-й танкавых дывізіях баяздольнымі былі 35% машын; у 4-й і 17-й (якая ўдзельнічала ў баях пад Сянно. – С.Н.) – 60%; у 10-й танкавай дывізіі – 80% машын былі баяздольнымі. Фактычна страчанай за гэты час лічылася кожная 10-я машына [13, Bl. 149].

Аб аператыўна-тактычных выніках Лепельскай аперацыі, праведзенай у пачатку ліпеня 1941 г., выказваюцца самыя розныя ацэнкі. У першую чаргу, гэта звязана з беззваротнай стратай значнай колькасці баяздольнага парку савецкіх танкаў. Прычын гэтага было шмат. У тым ліку і такіх, пра якія выказваўся ў час допыту камандзір 14-га гаўбічнага палка 14-й танкавай дывізіі Я.І. Джугашвілі (17 ліпеня ў раёне Лёзна патрапіў у палон на ўчастку наступлення 5-га пяхотнага палка 12-й нямецкай танкавай дывізіі 3-й танкавай групы) [14, Bl. 1–3]. На яго думку, высокай ацэнкі заслугоўвае нямецкая танкавая тэхніка і тактыка яе выкарыстання на полі бою. У адносінах савецкіх танкавых часцей палонны савецкі афіцэр-артылерыст адзначаў, што Чырвоная Армія ўзяла на ўзбраенне вопыт нямецкіх танкавых падраздзяленняў з часоў вайны ў Францыі. Укамплектаванне танкавых часцей і выкарыстанне тактычнага вопыту нямецкіх танкавых баявых падраздзяленняў было цалкам запазычана звонку. Няўдачы з выкарыстаннем савецкіх танкаў звязаны не толькі з недахопам тэхнікі ці ўзбраенняў, колькі з-за няздольнасці камандзіраў і адсутнасці ў іх вопыту вядзення манеўранага бою. Тады як нямецкія танкавыя часці “ходзяць як гадзіннік”.

Прычыны, па якіх камандзірам не стае вопыту, Джугашвілі Я.І. бачыў у становішчы вышэйшага афіцэрскага корпусу Чырвонай Арміі: гэта стала горкай расплатай за знішчэнне вядучага каманднага складу ў ходзе рэпрэсій, праведзеных супраць маршала М.М. Тухачэўскага і іншых камандзіраў. У выніку такіх дзеянняў, як адзначаў на допыце выпускнік маскоўскай школы артылерыйскай падрыхтоўкі савецкіх афіцэраў, на ўзроўні ні брыгады, ні дывізіі, ні корпуса часам не маглі своечасова прыняць правільнага аператыўнага рашэння. На думку афіцэра, пра гэта сведчыць і наступальная аперацыя, праведзеная савецкім камандаваннем пад Віцебскам. Часам штабы цалкам гублялі сувязь са сваімі часцямі і паміж сабой. У такай сітуацыі сярод салдат узнікала паніка, калі без камандзіра самі салдаты не былі здольнымі арганізаваць адэкватнай абароны. У гэтай сітуацыі са зброяй у руках камандзіры і палітычныя камісары стрымлівалі тых, хто пакідаў пазіцыі. Як камандзір гаўбічнай

батарэі сам Джугашвілі адзначаў, што артылерысты вымушаны былі весці агонь па праціўніку без палявых карт [14, Bl. 1–3].

У гэтым плане важнымі нам падаюцца і іншыя факты, без уліку якіх на цяперашні час практычна нельга казаць аб стварэнні суцэльнай панарамы танкавых баталій на Віцебшчыне летам 1941 г. Звернемся да малавядомага архіўнага дакумента, якім з'яўляюцца вынікі інспектавання, па даручэнні камандуючага Заходнім фронтам С.К. Цімашэнкі праведзенага амаль па гарачых слядах членам Ваеннага Савета фронту першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкам. Падрыхтаваная ў жніўні месяцы на імя І.В. Сталіна, дакладная запіска ўтрымлівае шмат важных ацэнак, да таго, што адбылося ў ходзе правядзення контрудару на лепельскім напрамку. У дакуменце даецца характарыстыка прычын паражэння Заходняга фронту, звязаных са схільнасцю многіх военачальнікаў і камандзіраў да дзеянняў "лабавымі ўдарамі", "коннай лавай", "навалам", вядомых з арсеналу грамадзянскай вайны. Панамарэнка дае адказ і на пытанне аб тым, да чаго прывяла падобная тактыка ў 7-м механізаваным корпусе, якія меў 526 танкаў, у тым ліку новых канструкцый. Так, "з 9 па 20 ліпеня корпус прайшоў шлях з баямі [ў раёне] Рудня – Лёзна – Бешанковічы і назад у Лёзна. У гэтым рэйдзе корпус страціў усе танкі па прычыне таго, што ў першы дзень корпус распачаў без разведкі лабавую атаку на вузел абароны праціўнікі, у выніку страціў адразу 100 танкаў. Далей, зноў-такі ў выніку адсутнасці разведкі, корпус патрапіў пад перакрыжаваны агонь двух замаскіраваных танкавых калон праціўніка і таксама страціў шмат танкаў. Затым корпус адышоў у балота. Шмат танкаў завязлі, а астатнія былі страчаны па дарогах. Так злачынна быў загублены адзін з моцных карпусоў" [15, с. 42; 18, с. 51–65].

Такім чынам, Лепельская аперацыя, праведзеная па загаду камандавання Заходняга фронту сіламі двух МК у пачатку ліпеня 1941 года, насамрэч вызначалася фактам шырокага выкарыстання танкавых злучэнняў як з савецкага, так і нямецкага бакоў. Аднак называць тыя падзеі танкавай бітвай пад Сянно нельга па прычыне цэлага шэрагу фактаў, якія вынікаюць з навуковага аналізу дакументальнага матэрыялу.

Па-першае, паводле дакументаў аператыўнага аддзела штаба Заходняга фронту баявыя дзеянні 5-га і 7-га механізаваных карпусоў 20-й арміі былі названы "Лепельскай аперацыяй", крайнімі часовымі рамкамі якой з'яўляюцца даты 6–11 ліпеня 1941 года: калі два савецкіх танкавых корпусы пачалі баявыя дзеянні і калі апошнія былі фактычна завершаны для асноўнай часткі падраздзяленняў чатырох танкавых і адной матарызаванай дывізіі. З дакументаў вынікае, што крайняй датай для часцей 5-га механізаванага корпуса стала дата 11 ліпеня 1941 г. [12, арк. 111].

Па-другое, у дакументах нам не ўдалося выявіць факта адначасовага сутыкнення з двух бакоў буйных мас танкаў, агульная колькасць якіх перавышала б нават 300 адзінак, не кажучы пра лічбы ў амаль 3 тыс. баявых машын. Так, напрыклад, у ходзе баёў на лініі Дуброва – Гняздзілавічы з нямецкага боку былі адначасова задзейнічаны толькі 2 батальёны 25-га нямецкага танкавага палка ў складзе менш 100 танкаў, ў той час як з савецкага боку гэта лічба была ўдвая большая. Вывучэнне аператыўных дакументаў танкавых злучэнняў, якія з двух бакоў удзельнічалі ў баях пад Сянно, паказвае баявыя сутыкненні з удзелам аднаго – двух танкавых палкоў агульнай колькасцю ад 150 да 200 баявых адзінак [12, арк. 111].

Па-трэцяе, Лепельская аперацыя з удзелам двух механізаваных корпусаў фактычна распалася на 2 самастойных контрудары, якія, паводле плана, распрацаванага штабам 20-й арміі, наносіліся па розных напрамках, адпаведна: 7-ы МК у складзе 14-й і 18-й танкавых дывізій наступаў з раёна Віцебска на Бешанковічы–Лепель; 5-ы МК у складзе 13-й і 17-й танкавых і 109-й мотастралковай дывізій наносіў удар з раёна Оршы на Сянно–Лепель. Фактычна яны былі праведзены ў такой жа паслядоўнасці, але з

адтэрміноўкай у 2 дні. Канчатковай мэтай контрудараў з'яўляўся выхад у раён Лепеля дзеля нанясення ўдару ў фланг і тыл полацкай групоўцы праціўніка. Паводле аператыўнай зводкі Заходняга фронту ад 5 ліпеня 1941 г., войскі фронту наносілі ўдар па праціўніку маючы толькі адзін агульны напрамак – Лепель [5, с. 276].

Па-чацвёртае, у двух савецкіх танкавых злучэннях страты складалі 3/4 танкавага парку 5-га і 7-га МК. Пра страты асабовага складу сведчыць наступны дакументальны запіс з выніковай справаздачы 5-га МК: пасля завяршэння Лепельскай аперацыі ў корпусе было дастаткова асабовага складу для забеспячэння боегатоўнасці часцей [12, арк. 111].

Па-пятае, сярод галоўных фактараў амаль поўнага разгрому двух механізаваных карпусоў трэба мець на ўвазе іх аб'ектыўны і суб'ектыўны характар паходжання. Даволі дакладную карціну аб прычынах разгрому дае справаздача 13-й танкавай дывізіі, дзе гаворыцца пра тое, што ў ходзе баю ў раёне Толпіна два танкавых і адзін мотастралковы палкі выконвалі загад аб неадкладным уступленні ў бой, але пры гэтым былі вымушаны ўвесці ў бой свае баявыя часці без артылерыйскай падрыхтоўкі, без узаемадзеяння паміж сабой, без належнай разведкі мясцовасці, без выкарыстання пяхоты, і пры ўсім не ў поўным складзе, з парушэннем кіравання і не ў поўнай баявой гатоўнасці [17, арк. 3].

Па-шостае, нягледзячы на тактычныя няўдачы 5-га і 7-га МК, загад аб іх адыходзе з лепельскага напрамку на зыходныя пазіцыі, стаў вынікам не разгрому ў раёне Сянно і Лепеля, а ў сувязі са стратай Заходнім фронтам Віцебска 9 ліпеня 1941 г. Страты ў баявой тэхніцы, панесеныя 2 савецкімі карпусамі ў ходзе Лепельскай аперацыі, былі даволі адчувальнымі, але не сведчылі аб катастрофе [12, арк. 111], якая адбылася ў раёне Беластока–Мінска ў пачатку вайны. У той жа час як маштабныя баявыя дзеянні, прадстаўленыя ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі ў раёне Сянно "адной з буйнейшых танкавых бітваў пачатковага перыяду вайны", засталіся непрыкметнымі для камандуючага групай армій "Цэнтр", які 8 ліпеня знаходзіўся на камандным пункце 3-й танкавай групы ў Лепелі [18, с. 73].

І ў рэшце рэшт, выкарыстанне параўнаўчага метаду для даследавання гісторыі танкавых баталій на Віцебшчыне ў пачатку ліпеня 1941 г. сведчыць пра тое, што толькі на аснове айчынных і замежных дакументальных крыніц магчыма аб'ектыўная рэканструкцыя тых важных гістарычных падзей. Пры інтэрпрэтацыі вынікаў фактычных баявых дзеянняў важна мець на ўвазе наступны дакументальны факт: у 5-м механізаваных корпусе толькі 30% танкаў былі страчаны на полі бою ў ходзе сустрэчных танкавых баёў ці дзейнасці процітанкавай артылерыі праціўніка [12, арк. 112].

Такім чынам, аўтарская спроба навуковай рэканструкцыі баявых дзеянняў на аснове выкарыстання новых дакументальных крыніц пераконвае ў тым, што адной з актуальных задач на цяперашні час нам бачыцца правядзенне беларускімі гісторыкамі спецыяльнага даследавання аб Лепельскай аперацыі ў пачатку ліпеня 1941 года, прычым даследавання, у аснову якога будзе пакладзены прынцып супастаўлення дакументальных крыніц айчыннага і замежнага паходжання, іх крытычнага аналізу з мэтай правядзення аб'ектыўнага вывучэння тых гераічных і трагічных падзей пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Таму ўсё больш відавочнай становіцца такая аксіёма: перспектыву будзе мець тое даследаванне, у якім знойдзе месца двухбаковы разгляд баявых дзеянняў, максімальна поўнае прыцягненне дакументальных матэрыялаў, узважанае супастаўлення фактаў з савецкіх і нямецкіх архіўных крыніц, а таксамі іх крытычнага аналізу. Толькі такі падыход дапаможа беларускім гісторыкам даць адказы на пакуль малавядомыя пытанні, якія застаюцца адкрытымі ў гісторыі правядзення 5-м і 7-м механізаванымі карпусамі двух самастойных контрудараў у ходзе Лепельскай аперацыі 1941 г. Вынікае, што на

цяперашні час даследчыкам нельга аслабляць увагі да гэтай важнай гістарычнай праблемы.


1. Исаев, А.В. Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг / А.В. Исаев. – М.: Яуза, Эксмо, 2010. – 480 с.
2. Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (далей – ЦАМА РФ). Журнал боевых действий 5 МК: Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. – Ф. 208. – Воп. 2511. – Спр. 80.
3. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). RH 21-3/732: Panzer AOK 3. Ia Nr. 520/42 geheim: Gefechtsberichte Russland 1941/42.
4. Бутков, В.В. Контрудар 5-го механизированного корпуса на лепельском направлении (6–11 июля 1941 года) / В.В. Бутков // Военно-исторический журнал. – 1971. – № 9. – С. 59–65.
5. Боевое донесение № 8 командующего 20-й армией о результатах боевых действий 5-го и 7-го механизированных корпусов, 8 июля 1941 г. // 1941: т. 2: Документы и материалы к 70-летию Великой Отечественной войны. Выпуск первый в двух томах. Вып. 1 / сост.: Ю.А. Никифоров [и др.]. – СПб.: ФГБУ «Президентская библиотека имени Б.Н. Ельцина», 2011. – 579 с.
6. ЦАМА РФ. Подробное описание первого боя 13-й танковой дивизии в районе Толпино 8.7.41. – Ф. 208. – Воп. 2511. – Спр. 80.
7. Отчет о действиях частей 17-й танковой дивизии с 4.7.41 по 19.7.41. – ЦАМО РФ. – Ф. 208. – Воп. 2511. – Спр. 80.
8. BA-MA. RH 24-47/5: Anlage Nr. 248 zum Kriegstagebuch Nr. 2 des XXXXVII. Pz. Korps: Bericht über Marsch und Kampf der 17. Pz. Division von Borissow über Senno nach Kochanovo v. 11.7.41.
9. BA-MA. RH 21-3/433: Abschlußbericht über die Panzerkämpfe am 7.7.41 der 7. Panzer–Division, v. 8.7.41.
10. BA-MA. RH 21-3/433: Generalkommando XXXIX. A.K. Bericht über Gefangene, vernichtetes Gerät und Beute seit Beginn der Kamphandlungen v. 8.8.41.
11. BA-MA. RH 21-3/46: Panzergruppe 3. Gesamtaufstellung der bisher gemeldeten Verluste, Stand vom 13.7.41.
12. ЦАМА РФ. Лепельская операция с 6 по 11.7.41 г. – Ф. 208. – Воп. 2511. – Спр. 80.
13. BA-MA. RH 21-2/927: Meldung der Pz. Gr. 2 an AOK über einsatzbereite Panzer vom 7.7.41.
14. BA-MA. RH 26-26/7a: Vernehmung des gefangenen russischen Oberleutnant Jacob Josifowitsch Dschugaschwili vom 14. Haub. Art. Regiment.
15. Платонов, Р.П. Белоруссия, 1941-й: известное и неизвестное: По документам Национального архива Республики Беларусь / Р.П. Платонов. – Мн.: БелНИИДАД, 2000. – 209 с.
16. Платонов, Р.П. О причинах поражения войск Западного фронта в первые месяцы войны (По материалам Национального архива Республики Беларусь) / Р.П. Платонов // Беларусь, 22 июня 1941 года: Говорят архивы…: Материалы к заседанию «круглого стола», посвященного 60-летию начала Великой Отечественной войны (июнь 2001 г.) / отв. ред.-сост. Р.П. Платонов, В.В. Федосов. – Мн.: БелНИИДАД, 2000. – С. 51–65.
17. ЦАМА РФ. Отчет о боевых действиях 13-й танковой дивизии 5 МК за период с 4 по 19.7.41. – Ф. 208. – Воп. 2511. – Спр. 80.
18. Бок Ф. фон. «Я стоял у ворот Москвы» / Ф. фон Бок. – М.: Вече, 2009. – 432 с.



**Скурко П.Д.**


## ДЗЁННІКІ БРАНІСЛАВА ШПАКОЎСКАГА: ШТОДЗЁННАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ ПАЧ. 1940-х гг.

Дзённікі Браніслава Шпакоўскага (30.11.1921–21.03.1945), жыхара мястэчка Самахвалавічы (Мінскі раён), – унікальная і вельмі каштоўная крыніца па гісторыі 1940–1942 гг. на Беларусі. Малады чалавек падрабязна занатоўваў падзеі асабістага і грамадскага жыцця, дзякуючы чаму можна прасачыць успрыняцце гістарычных падзей іх непасрэднымі ўдзельнікамі і сведкамі (самім Браніславам, яго сям'ёй, сябрамі). Падчас вайны аўтар дзённікаў хаваў іх у коміне ў тайніку, які быў знойдзены ў 1970 г., пасля чаго дзённік быў перададзены сваякамі музею ДУА "Самахвалавіцкая сярэдняя школа", дзе ён і захоўваецца [8, с. 4]. Узгадка пра Б. Шпакоўскага прысутнічае ў кнізе "Памяць" Мінскага раёна, але звесткі, пададзеныя ў ёй, састарэлі [5, с. 452]. Дзённік (і біяграфія яго аўтара) быў часткова апублікаваны ў 2010 г. у газеце "Звязда" В. Мядзведзевай [6; 7], акцэнт у публікацыі быў зроблены на позніх запісах патрыятычнага зместу.

Тры дзённікі: за 1940, 1941, 1942 гг. – з'яўляюцца дакументам, які пралівае святло на перадваенную і ваенную паўсядзённасць беларускага мястэчка. Сам аўтар дзённікаў не перажыў вайну: прыняў рашэнне сыходзіць у партызаны, але не паспеўшы здзейсніць задуманае, быў арыштаваны ў сакавіку 1943 г. як партызанскі сувязны і трапіў у канцлагер "Равенсбрук" у горадзе Барт, дзе памёр ад запалення лёгкіх [8, с. 4]. Дзённік Б. Шпакоўскага ў нейкім сэнсе параўнальны з дзённікамі беларуса з Калінкавічаў Кастуся Ярмілава [4, с. 266–269], а таксама Ганны Франк з Нідэрландаў, Тані Савічавай з Ленінграда – усё гэта непасрэдныя сведчанні "пасіўных" удзельнікаў вайны, не змененыя і не рэдагаваныя пазней. Яны істотна адрозніваюцца ад успамінаў, пакінутых "дзецьмі вайны" ў эміграцыі або ў пасляваеннай БССР. Дзённік Шпакоўскага вылучаецца тым, што закранае не толькі ваенны час, але і папярэдні год.

У першым яго дзённіку прасочваецца паўсядзённасць маладога местачкоўца ў 1940 г., што складалася з вучобы (школа ўспрымалася юнакамі як адпраўная пляцоўка для будучых дасягненняў), грамадскіх спраў (сходаў, рэдагавання школьнай газеты), дапамогі бацькам, адпачынку. Адной з асноўных тэм дзённіка з'яўляюцца міжасабовыя стасункі, адносіны з дзяўчынамі. "О чем может быть больше мыслей у 17–18-летнего юноши! Только это у него и на уме" [1, арк. 10 адв.–11].

Падрабязна апісаныя формы адпачынку моладзі: узімку каталіся на лыжах, у цёплы час ладзілі "бяседы", прагулкі, танцы "в совхозе" ("хотя я, а также некоторые мои товарищи не танцуем, но все же посмотреть на других интересно") [1, арк. 20 адв.]. Моладзь хадзіла ў кіно "в совхоз"; чытала кнігі (асабліва шмат сталі чытаць у пачатку вайны, не маючы іншых заняткаў); слухала радыё ("придя домой со школы, всё время отдаю исключительно для слушанья радио. По целым часам не отхожу от приемника. Забываю иногда, что надо учить уроки… Приходят слушать ко мне радио иногда Костя с Леником"). Чытанне ратавала ад нуды і ў першыя месяцы вайны, аднак карыстацца радыё ўжо не выпадала: "Хотел кое как смастерить радио…, так вышел указ, согласно которого лица слушающие радио будут подвергатся расстрелу" [2, арк. 34].

Значная ўвага ў дзённіку нададзена апісанням святаў. У 1940 г. святы пачыналіся з грамадскіх мерапрыемстваў у школе, саўгасе, клубе, падрыхтоўка да якіх вялася школьнікамі працяглы час. На 23 лютага – "годовщина советской армии" – вучні школы ставілі п'есу, рабілі святочны вечар. 8 сакавіка святкавалі больш нефармальна, Бронік заўважаў: "Женщины празднуют здорово свой праздник. Везде беседы, музыка, танцы. Хотя мы и мужчины, но также решили маленько подкутить. С ребятами сложились и немножко дризнули. Некоторые едва шли" [1, арк. 13]. Значнае свята – 1 мая, падрыхтоўка праграмы пачынаецца за месяц; школьнікі малююць "лозунги в школу, с/совет, артели" [1, арк. 27], што дазваляе ім перад святамі "подхалтурить монету" [1, арк. 49]. Святкаванне пачынаецца напярэдадні з урачыстага вечара ў клубе: "доклад, потом художественная часть, а потом и общие танцы". 1 мая адбываецца нефармальнае святкаванне – "маёўка": "взяли водки, вина и ушли в сад справлять маевку. Вернулись от туда только вечером. Сильно болела голова. Не пришлось никуда итти гулять". Працяг свята – на наступны дзень: "везде веселье, смех, музыка, беседы" [1, арк. 27–28]. Яшчэ адным істотным святам для моладзі 1930–1940-х гг. быў дзень 7 лістапада – "когда можно будет пару дней забыть на учёбу и хорошенько погулять с друзьями" (святкаванне працягвалася 2 дні, да таго ж прыпадала на час канікул) [1, арк. 47]. Яно пачыналася 6 лістапада ўвечары з урачыстага даклада, працягвалася "мастацкай часткай" (песні, танцы, спектакль), а затым – "масавыя танцы". 7 лістапада свята працягвалася ў клубе мастацкай самадзейнасцю малодшых школьнікаў і кінапаказам. Дзень сканчаўся агульным вучнёўскім святкаваннем у чыёйсьці хаце. "А затем все вместе пошли в совхоз гулять. Но не повезло: пришлось расходится… по домам, ибо было здесь слишком много парней "под мухой" и танцы не ладились" [1, арк. 47]. Што цікава, новыя ўлады ў 1941 г. не ўсе святы змянілі: прыбралі камуністычныя,

дадалі рэлігійныя (Раство, Вялікдзень, Троіцу), аднак 1 мая засталося: “Нямецкія ўлады гэты міжнародны дзень рашылі ўсё ж адзначыць, хоць без урачыстасці”, – піша Бронік. Падобныя звесткі падае яго равеснік К.Ярмілаў з Калінкавіч: “1 Мая немцы также празднуют, только, не в честь между народной солидарности, а, как они говорят, в честь наступления лета, развития природы” [4, с. 268].

Ваеннай паўсядзённасці прысвечаныя два дзённікі: за 1941 і 1942 гг. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны супаў з важнымі для Браніслава падзеямі: сканчэннем школы і паступленнем у ваеннае вучылішча. Пра наступленне вайны Браніслаў даведаўся ў цягніку у час вяртання з Ленінградскага вучылішча інструментальнай разведкі зенітнай артылерыі, куды паступіў і атрымаў дваццаць дзён канікул: “Складываем план нашей гульни дома. Едем в вагоне, смеемся… Вдруг настроение пало. Услыхали неприятную весть на станции Пушкино: говорят что Германия объявила войну Советскому Союзу. Сразу не верилось, но позже убедились, что это так… До самого Минска не пришлось доехать. Наш поезд начал обстреливать неприятельский самолет. Пришлось сойти в лес, а потом идти пешком домой” [2, арк. 32]. Кожныя некалькі дзён вайны ён робіць у дзённіку запіс, і можна прасачыць, як змяняецца яго стаўленне да савецкай улады, да ўлады немцаў. 28 чэрвеня нямецкія войскі ўступілі ў Самахвалавічы: “Только теперь я убедился, что Германия действительно сильная страна, что здесь действительно все механизировано. Нет ни одного германского солдата, чтобы шел пешком – все едут. И не случайно, что Красная Армия оказалась не способной дать бой немцам”. Тут жа Браніслаў даволі абыякава заўважае: “Пришел конец советской власти, которая существовала немного больше 20 лет” [2, арк. 32–32 адв.]. Асноўная праблема, якая хвалюе Броніка і яго сям’ю ў складзенай сітуацыі – безуладдзе: “Вся местная власть удрала. Творятся кругом беспорядки” [2, арк. 32 адв.]. 5 ліпеня хлопец з палёгкай зазначае: “Фронт отошел… Скоро должна наладиться кое-какая власть” [2, арк. 33]; 30 ліпеня: “Быстрее бы какая власть, быстрее бы взяться за какое дело” [2, арк. 34 адв.].

З дзённіка бачна, з чаго складалася паўсядзённасць беларускай моладзі на акупаванай тэрыторыі падчас вайны. Напачатку гэта адсутнасць працы, адно “безвластие, тишина, скука….” [2, арк. 34]. Па нядзелях дазваляліся гулянні і танцы: “С каким нетерпением ожидаю я теперь воскресного дня!” – піша Браніслаў 17 жніўня [2, арк. 40]. Абавязкам моладзі было пачарговае начное дзяжурства“ с милиционером местечка”. Паступова знаходзілася і праца: на млыне, на будоўлі моста, валцы лесу, у валасной управе; “хотел устроится учителем в нашу местную школу, но не удалось, так как теперь слишком много учителей безработных с высшим образованием”, – зазначае Бронік у кастрычніку 1941 г. [2, арк. 47]. Тады ж штодзённыя патрэбы вымушаюць Браніслава вучыць нямецкую мову, “ибо знать иностранный какой-нибудь язык очень полезно” [2, арк. 47 адв.].

13 снежня 1941 г. аўтар робіць запіс: “Из газет (раней у дзённіку ўпамінаецца “Менская газэта” – *аўт.*) сегодня узнал, что Америка вступила в войну с Японией… Весть довольно неприятная. Все шире и шире разгорается вторая всемирная война” [2, арк. 57 адв.–58]. У студзені 1942 г. пачынаюцца сумныя падзеі і ў асабістым жыцці Браніслава, а ваенная паўсядзённасць усё больш прыгнятае: “везде творятся ужасные картины… Не живешь, а гниешь…” [3, арк. 8]. У лютым 1942 г. у Самахвалавічах шырацца чуткі пра працоўную мабілізацыю моладзі, аднак Бронік пакуль не вельмі верыць чуткам і нават падсмейваецца з жанчын, якія “точно ничего еще не знают, а уже всхлипывают” [3, арк. 17]. Аднак ужо ў сакавіку чуткі становяцца сур’ёзнай навіной: “У суседніх валасцях ужо паехалі... Але-ж куды паехалі, хто ведае? Адны кажуць у Германію, другія кажуць у Афрыку біцца з англічанамі, а суседка Марыля гаворыць зусім, што вязуць у пекла” [3, арк. 25].

З красавіка 1942 г. значнае месца ў дзённіку адводзіцца апісанню працы, начальнікаў, розных працоўных здарэнняў: “Без працы цяпер жыць немагчыма, бо могуць загнаць туды, дзе камар цялят пасе” [3, арк. 44] Каб пазбавіцца небяспекі вывазу ў Германію, Браніслаў уладкаваўся на працы на торфараспрацоўку, затым перавёўся на дарожныя работы – “няма больш дурных, каб ехаць на цяжкую працу дарэмна працаваць” [3, арк. 34 адв., арк. 42–43]. Працаваць можна было не штодзень; лёгка было звольніцца, лёгка ўзнавіцца на працы. Так, звольнены Бронік падрабляў продажам агуркоў на мінскім базары, а затым зноў уладкаваўся дарожным рабочым – бо “безработных пасылаюць у Мінск на пастройку аэрадрома” [3, арк. 79].

На прыкладзе дзённіка Шпакоўскага бачна трапнае ўздзеянне нямецкай прапаганды з яе заклікам да нацыянальных пачуццяў беларусаў. З 11 сакавіка 1942 г. Браніслаў вырашыў весці дзённік па-беларуску, каб “не забыть своего родного белорусского языка… Праўда, пісаць буду такой мовай і такім правапісам, які я вывучаў у школе. Да такога правапісу і такой беларускай мовы, якая пачала існаваць толькі цяпер, за прыходам немцаў, я яшчэ не прывык і рабіў бы даволі многа памылак” [3, арк. 22].

З канца красавіка 1942 г. у дзённіку пачынаюць з’яўляцца заявы ў духу савецкай прапаганды: “Немцы так старанна брэшуць аб сваіх перамогах, аб канчатковым разгроме Чырвонай арміі. Брашыце, фашысты, але ваша пагібель немінуча” [3, арк. 32 адв.]. У гэты час на Міншчыне пачынаецца стварэнне партызанскіх брыгад, на акупаваную тэрыторыю пранікаюць савецкія газеты “За савецкую Беларусь”, “За свабодную Беларусь”, “Звязда” [9, с. 390, 436]. Напачатку нейтральна-насцярожанае стаўленне да нямецкай адміністрацыі, абыякавасць да лёсу самахвалавіцкіх яўрэяў змяняецца на варожасць у дачыненні да новых уладаў. Адначасова Бронік наракае на настроі і паводзіны мясцовай моладзі: “Вайна… Усюды распуста… П’янкі, гульня, карцёж, розныя любоўныя гісторыі… Гэтаму многія з моладзі пасвяцілі цяпер сваё жыццё. Яны ўжо не вераць больш ні ў вошта лепшае… Гэтыя людзі ўпалі ў песімізм… Зусім быць адарванаму ад гэтай моладзі немагчыма, а таму і мне прыходзіцца ў некаторых выпадках (толькі ў некаторых выпадках!) падражаць ім… І ўсё гэта з-за такой цяперашняй нуды, нэндзы і беззаняцця…” [3, арк. 81 адв.].

Прыкладна з чэрвеня 1942 г. у Браніслава і яго сяброў з’яўляецца ідэя сысці ў лес. Пра гэта сведчаць допісы пра таямнічае знікненне дзвюх дзяўчын, якія, пайшоўшы на вяселле, “прапалі безведама”, а потым выявілася, што “пайшлі ў партызаны” (“Зусім правільна паступілі. Такі доўг чэснага камсамольца”, – каментуе іх учынак Бронік [3, арк. 47]). А ўжо 25 чэрвеня ён зазначае: “І так. Рашылі: мы павінны пасвяціць жыццё за наша шчаслівае будучае, за наш народ, за нашу Радзіму… Чакаем таго моманту, калі мы зможам незаметна для нямецкіх уладаў і насельніцтва ўсе зарганізавацца і прыступіць к дзеянням” [3, арк. 50–50 адв.]. Прыняўшы рашэнне арганізаваць антыфашысцкі супраціў, самахвалавіцкія хлопцы паўсталі перад складаным выбарам: “Ніяк не можам рашыцца на тое, каб паступіць у паліцыю. Што-ж тады скажуць нашы бацькі… Што-ж тады скажа местачковае жыхарства? Усялякі падумае, што астаўся ў паліцыю толькі для сваёй нажывы…” [3, арк. 54 адв.]. У той жа час, праца ў паліцыі дала б хлопцам магчымасць атрымаць зброю, з якой можна было б сысці да партызанаў. З запісаў відаць, наколькі рознілася ўспрыманне грамадствам паліцыі і Корпусу Самааховы. З запісаў вынікае, што Бронік быў гатовы ахвяраваць гонарам і стаць паліцэйскім (але такога выпадку не прадставілася), аднак ён рашуча асудзіў стварэнне Корпусу Самааховы, магчыма, таму, што служба ў корпусе для местачковых хлапцоў падавалася адзінай альтэрнатывай адпраўцы ў Германію. Каментуючы навіны пра стварэнне Самааховы, Бронік піша: “Лепш памерці ў барацьбе з ворагам, чым быць яго рабом” [3, арк. 60–60 адв.].

Такім чынам, дзённікі сведчаць пра думкі і ідэі, што цыркулявалі ў беларускім грамадстве ў 1940–1942 гг., паказваюць штодзённыя клопаты і праблемы беларускіх местачкоўцаў гэтага часу.


1. Дневник №1 на 1940 г. Б. Шпаковского. Краязнаўчы музей ДУА "Самахвалавіцкая сярэдняя школа".
2. Дневник №2 на 1941 г. Б. Шпаковского. Краязнаўчы музей ДУА "Самахвалавіцкая сярэдняя школа".
3. Дневник №3 на 1942 г. Б. Шпаковского. Краязнаўчы музей ДУА "Самахвалавіцкая сярэдняя школа".
4. Памяць: Калінкавіцкі раён. Гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэд.-склад. Феранц В.Р. – Мінск: Ураджай, 1999. – 797 с.
5. Памяць: Мінскі раён. Гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. М.І. Курскі, Г.А. Маслыка. – Мінск: БелЭн, 1998. – 635 с.
6. Мядзведзева, В. "Едзем у вагоне, смяёмся… Раптам настрой упаў. Пачулі непрыемную вестку: кажуць, Германія абвясціла вайну Савецкаму Саюзу…" / В. Мядзведзева // Звязда. – 2010. – №118. – С. 4.
7. Мядзведзева, В. "І той, хто выжыве, успомніць мёртвых…" / В. Мядзведзева // Звязда. – 2010. – №119. – С. 4.
8. Мядзведзева, В. Помнік Броніку / В. Мядзведзева // Звязда. – 2010. – №119. – С. 4.
9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 3. / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск.: БелЭн, 1996. – 527 с.



**Куракова І.Я.**


## ДАКУМЕНТЫ ГЕРМАНСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ФІНАНСАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў АКРУЗЕ "БЕЛАСТОК" 1941–1944 гг. (НА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЯРЖАРХІВА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

Для даследчыкаў ваенна-эканамічных аспектаў гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі 1941–1944 гг., у тым ліку фінансавай палітыкі германскіх цывільных акупацыйных органаў кіравання, цікавасць уяўляюць дакументы Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці. Комплекс акупацыйных фондаў архіва ўтрымлівае вялікі факталагічны матэрыял, які датычыцца толькі гэтай часткі беларускіх зямель, уключаных у склад новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі – акругі Беласток. Гэтую тэрыторыю германскія ўлады планавалі далучыць да трэцяга рэйха і правесці яе германізацыю і анямечванне. Аднак крах "маланкавай вайны" і праблемы на фронце не спрыялі рэалізацыі гэтых намераў [1, с. 36–37].

Мэта працы: выявіць асаблівасці рэалізацыі фінансавых мерапрыемстваў на тэрыторыі акругі Беласток. Сярод комплексу акупацыйных дакументаў у фондах ДзАГрВ, матэрыялы па фінансавай палітыцы германскіх акупацыйных улад у акрузе "Беласток"займаюць даволі значнае месца. Яны прадстаўлены дакументамі ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў. Найбольшая колькасць дакументаў прадстаўлена ў наступных фондах: ф. 1 – Гродзенскі павятовы камісар, ф. 2 – Гродзенскі бургамістр, ф. 5 – Гродзенскі павятовы фінансавы аддзел, ф. 6 – Гродзенскі павятовы мытны аддзел, ф. 8 – Палявая камендатура 815 ахоўнай дывізіі 403 тылавой ваеннай акругі г. Гродна, ф. 14 – Гандлёвая фірма ў г. Гродна "Warengrosshandlung", ф. 15 – Гродзенскае гарадское ўпраўленне Грамадзянскага кіравання Беластоцкай акругі, ф. 16 – Гродзенскае аддзяленне выдавецтва "Штурмферляг". Амаль усе дакументы на нямецкай мове, зрэдку сустракаюцца на рускай, польскай ці беларускай. Нямецкая мова прысутнічае і на афіцыйных бланках, як правіла, двухмоўных – на нямецкай і рускай ці беларускай мовах. Стан захаванасці крыніц даволі добры. Дакументы пераважна друкаваныя. Практычна ўсе з'яўляюцца арыгінальнымі крыніцамі, колькасць копій невялікая.

Паводле паходжання, мэтазгодна вылучыць дакументы акружных, гарадскіх і раённых камісарыятаў. Па змесце яны дзеляцца на дакументы, якая даюць звесткі аб

структуры органаў акупацыйнага кіравання і дакументы аб фінансавай палітыцы. Сярод апошняга віду крыніц спісы прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў; ведамасці аб зарплаце; рапарты кіраўнікоў прадпрыемстваў аб выкананні вытворчых паказчыкаў; прэйскуранты цэн для розных катэгорый паслуг насельніцтву; распараджэнні аб правілах продажу; дакументы, якія акрэсліваюць сістэму падаткаабкладання і функцыянавання банкаўскіх устаноў.

Згодна відавай класіфікацыі крыніц, яны падзяляюцца на: арганізацыйна-распарадчыя дакументы (распараджэнні, прадпісанні, прыказы, указанні, дырэктывы, рашэнні, цыркуляры); матэрыялы кадравага характару (спіскі працаўнікоў арганізацый, заявы аб прыняцці на працу, біяграфіі і анкеты служачых, перапіска па кадравых пытаннях); справаздачную дакументацыю (справаздачы, даклады, рапарты); даведчна-інфармацыйная дакументацыя (перапіска устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, даведкі і г.д.); фінансавую дакументацыю (бухгалтэрыя, бюджэты, ведамасці на выдачу зарплаты). Аднак не ўсе віды і групы дакументаў прадстаўлены ў дастатковым аб'ёме. Напрыклад, існуюць прабелы ў наяўнасці матэрыялаў, якія акрэсліваюць функцыянаванне банкаўскай сістэмы на тэрыторыі акругі Беласток.

Вялікую ўвагу германскае кіраўніцтва надавала планам фінансавай палітыкі, перш за ўсё, метадам эканамічнага рабавання, якія ажыццяўляліся праз розныя механізмы. Асаблівасці і маштабы яе рэалізацыі былі прадвызначаны адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам і адпавядалі патрэбам ваеннага часу і загадзя створаным планам. Гэтыя планы прадстаўлены ў дырэктывах, якімі кіравалася нямецкая адміністрацыя на тэрыторыі Беларусі (Зялёная папка" (для зоны акупацыі з ваенным кіраўніцтвам) [2, с. 338–390] і т.зв. "Карычневая папка" (з цывільным кіраўніцтвам) [3, арк. 1–39]. Аднак на тэрыторыі акругі Беласток яны не дзейнічалі. Інструкцыі "Карычневай папкі" выключна прызначаліся для РК "Остланд" і "Украіна" [4, арк. 58]. Што датычыць дырэктыў для зоны акупацыі з ваенным кіраўніцтвам, то адна з інструкцый Герынга ад 30.09.1941 г. паведамляла, што *" Раён Беласток не падлягае "дырэктывам для кіравання гаспадаркай на новазанятых усходніх абласцях" (Зялёная папка) ад чэрвеня 1941 г."* [5, арк. 2–2 адв.]. У дакуменце сцвярджалася, што з дзяржаўна-прававога пункту гледжання і эканамічна з гэтай тэрыторыяй трэба звяртацца як з часткай імперскай вобласці. Рэалізацыяй фінансавых планаў займаліся ўстановы і органы акупацыйных улад, пры якіх ствараліся фінаддзелы і працавалі так званыя рэферэнты. Ва ўсіх зонах акупаванай Беларусі гэта былі некваліфікаваныя работнікі, часцей з мясцовых жыхароў [6, с. 118–124.]. У акрузе Беласток нацысты былі зацікаўлены ў прафесіяналізме фінансавых кадраў. Іх правы і абавязкі вызначалі інструкцыі міністра фінансаў Германіі. Фінансавыя служачыя ў акрузе Беласток павінны былі быць нямецкай нацыянальнасці ці "фольксдойчэ" і прайсці спецыяльную школу [7, арк. 229.].

Генерыравалася фінансавая палітыка ў банкаўскіх установах. Структура іх дзейнасці і функцыі служачых адлюстроўваліся ў дырэктывах для муніцыпальнага банка і ашчаднай касы г. Гродна. Калі на тэрыторыі РК "Остланд" і "Украіна" ствараліся мясцовыя галоўныя банкі, то ў акрузе Беласток філіялы падпарадкоўваліся Рэйхсбанку ў Берліне [8, арк. 14–14 адв.]. Аналіз дакументаў паказаў, што тут як і з іншых зонах акупацыі, Германія атрымлівала матэрыяльныя рэсурсы. Праз крэдытаванне і ашчадныя аперацыі, а таксама кантроль грашовых сродкаў нацысты рэалізоўвалі праграмы рабаўніцтва і эксплуатацыі фінансавых рэсурсаў захопленай краіны.

Фінансавыя дакументы гродзенскага павятовага камісара (фонд 1) утрымліваюць інфармацыю аб асаблівасцях здзяйснення крэдытна-грашовай і валютнай палітыкі. На акупаванай тэрыторыі дзейнічалі спецыяльна створаныя ваенныя грошы – рэйхсмаркі ("Reichsmark", скарочана RM) [9, арк. 34.]. Паралельна з імі існавалі савецкія рублі, а на тэрыторыі РК "Украіна" з 1942 г. і карбованцы. У межах акругі Беласток такі грашовы

парадак быў забаронены. Распараджэннем Дзяржаўнай крэдытнай касы ў Беластоцкай акрузе ад 12 снежня 1941 г. "*...банкноты Дзяржаўнае Крэдытнае Касы, а таксама рубель перастаюць быць ў Беластоцкай акрузе законнымі разрахунковымі сродкамі. Адзіным ад гэтага часу з'яўляецца толькі рэйхсмарка"* [10, арк. 12 адв.]. Выкарыстанне і імпарт імперскай (нямецкай) маркі ў акрузе Беласток для мясцовага насельніцтва былі забаронены, а вось вываз гэтых банкнот падтрымліваўся [11, арк. 3–3 адв.]. У цэлым, па дакументах гродзенскага павятовага камісара можна выявіць дастатковую колькасць асаблівасцей у галіне грашовай і валютнай палітыкі, якія былі характэрны для акругі Беласток. Гэта і забарона хаджэння савецкіх банкнот, і больш шырокая сістэма крэдытавання насельніцтва і прадпрымальнікаў, і пэўныя выключэнні для імпарта і экспарта нямецкіх грошай (у турыстычных мэтах дазваляўся вываз і ўвоз да 10 нямецкіх марак, што былі роўныя 100 RM) [12, арк. 7.] і г.д. Магчыма, гэта ўскосна адлюстроўвала прававы стан насельніцтва акругі Беласток і падкрэслівала планы Трэцяга рэйха па германізацыі акругі Беласток.

Важнай крыніцай з'яўляецца таксама перапіска оберпрэзідэнта фінансаў Усходняй Прусіі з Гродзенскім фінаддзелам. Яна ўтрымлівае спіскі буйных прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў акрузе Беласток. Выяўлена, што тут былі створаны спрыяльныя ўмовы для працы нямецкіх прадпрымальнікаў. Акцыянерных таварыстваў, капітал якіх быў звыш 300 000 RM было больш за 35 [13, арк. 2-2 адв.]. Каля 9 кампаній мелі ўласны капітал больш за мільён RM [14, арк. 1.]. На іншых тэрыторыях Беларусі такіх кампаній не сустракалася.

Даволі інфарматыўнай крыніцай, якая раскрывае сутнасць падатковай сістэмы акругі Беласток, можна лічыць дакуметы фонда 5 "Гродзенскі фінансавы аддзел". Інструкцыі аб падатках, прадпісанні прэзідэнта фінансаў Усходняй Прусіі для акругі Беласток, перапіска па падатковых пытаннях і іншыя дакументы фонда дазваляюць рэканструяваць працу падатковых органаў. Кіраўніцтвам акругі Беласток прымаліся распараджэнні, у якіх паведамлялася пра ільготы для падаткаплацельшчыкаў Усходняй Прусіі, у тым ліку беларусаў [15, арк. 92]. У адрозненне ад іншых акупаваных тэрыторый Беларусі, дзе падаткі спаганяліся па савецкім ўзоры, у акрузе Беласток дзейнічалі інструкцыі нямецкага падаткаабкладання [16, арк. 60–60 адв.].

Гандлёвы парадак ў акрузе Беласток быў падобны на той, што існаваў у іншых тэрытарыяльных адзінках і адлюстраваны ў дакументах аддзела кошту Гродненскага камісарыяту і месячных справаздачах фінаддзела. Аднак былі і свае адрозненні. Яны паказаны ў распараджэннях аб устанаўленні кошту на прадукты і працу. Напрыклад, кожны гандляр, які не вырабляў тавараў, меў права накладання 30% да закупачнага кошту, які быў устаноўлены ўладамі [17, арк. 16]. У іншых тэрытарыяльных адзінках – 25%. [18, арк. 145–147].

Такім чынам, рэалізацыяй пастаўленых фінансавых задач і планаў у акрузе Беласток займаліся банкаўскія ўстановы падначаленыя непасрэдна Рэйхсбанку ў Берліне; грашовыя разлікі адбываліся выключна рэйхсмаркамі; у галіне падаткаў акупацыйныя ўлады абапіраліся на нямецкую сістэму; гандлёвы парадак меў падабенствы па метадах яго арганізацыі з тым, што існаваў у іншых зонах дзейнасці германскіх цывільнай і ваеннай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі.


1. Казлова, С.Л. Аграрная палітыка нямецкіх акупацыйных улад на Беларусі (1941-1944): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. / С.Л. Казлова. − Мн., 2006. − 157 л.
2. Директивы по руководству экономикой во вновь оккупируемых восточных областях ("Зелёная папка") // Нюрнбергский процесс: Сб. мат. В 8 т. Т. 4. − М., 1990. – 672 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далее − НАРБ). Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe). − Ф. 652. − Воп. 1. − Спр. 2.
4. Новікаў, С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941−1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў / С.Я. Новікаў: − Мн., 2002. – 219 с.

5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей − ДАГрВ). Betrifft: Gleichstellung des Bialystok mit eingegliederten Ostgebieten. Berlin. 30.09.1941. − Ф. 1. − Воп. 1. − Спр. 300.
6. Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа “Белоруссия” (Минск, 8-10 апреля 1943 года) / авторы-сост. С.В. Жумарь, С.Е. Новиков, Р.А. Черноглазова. – Мн., − 2006. −219 с.
7. ДАГрВ. Beschäftigung von Lehrern der öffentlichen Schulen in der Reichsfinanzverwaltung, Bericht vom 14. Juli 1941. − Ф. 5. − Воп. 1. − Спр. 14.
8. ДАГрВ. − Ф. 8. − Воп. 1. − Спр. 5.
9. НАРБ. Rundschreiben Nr.5. 18.05.1942. − Ф.374. − Воп.1. − Спр.2.
10. ДАГрВ. − Ф. 1. − Воп. 1. − Спр. 376.
11. ДАГрВ. − Ф. 1. − Воп. 1. − Спр. 125.
12. ДАГрВ. − Ф. 1. − Воп. 1. − Спр. 125.
13. ДАГрВ. − Ф. 5. − Воп. 1. − Спр. 81.
14. ДАГрВ. − Ф. 5. − Воп. 1. − Спр. 81.
15. ДАГрВ. − Ф. 5. − Воп. 1. − Спр. 110.
16. ДАГрВ. − Ф. 5. − Воп. 1. − Спр. 32.
17. ДАГрВ. − Ф. 1. − Воп. 1. − Спр. 565.
18. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. − Ф. 2087. − Воп. 2. − Спр.1.

**Гребень Е.А.**

## СУДЕБНЫЕ ИСКИ КАК СТРАТЕГИЯ ВЫЖИВАНИЯ ГРАЖДАНСКОГО НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ НАЦИСТСКОЙ ОККУПАЦИИ (ПО МАТЕРИАЛАМ ВИТЕБСКОГО МИРОВОГО СУДА)

В период нацистской оккупации гражданское население использовало различные стратегии выживания, одной из которых являлось обращение в суд. Данную стратегию выживания можно проиллюстрировать на примере материалов Витебского мирового суда.

Мировой суд г. Витебска был организован 1.11.1941 г., руководствовался постановлением командующего тыловой зоной группы армий «Центр» от 19.11.1941 г. «О порядке производства в Мировых судах». Компетенции суда подлежали все имущественные споры, дела о владении, собственности, дела, связанные с наследственным правом и дела о расторжении браков, дела об опеке над малолетними и над бесхозным имуществом. Решения суда выносились на основании здравого смысла и тех советских законов, которые не противоречили нацистской идеологии. Изначально суд рассматривал мелкие уголовные дела, возникавшие в порядке частного обвинения, и обладал правом наложения взыскания в виде ареста до 14 дней или штрафа до 1000 руб. С июля 1943 г. штандортскомендатура поручила суду более сложные уголовные дела, такие как хулиганство, кражи, клевета, нанесение телесных повреждений, должностные преступления и предоставила право налагать взыскание в виде более длительных сроков заключения и штрафа до 4000 руб. Суд обслуживал 40-тысячное население города и жителей прилегающих районов (в довоенном Витебске на 170000 жителей функционировало 11 отделений народного суда и специальные суды). За два года работы суд рассмотрел 1952 гражданских дела, 174 опекунских и 327 уголовных, всего 2453 дела. Мировой суд заседал в составе председателя (профессионального юриста) и двух присяжных заседателей. В распоряжении суда имелось 107 присяжных заседателей, из которых 41 чел. имел высшее образование и 66–среднее. Заседатели должны были быть не моложе 30-ти лет и проживать в Витебске не менее 2-х лет. При суде с 7.11.1941 г. работала юридическая консультация, 4 адвоката которой оказывали консультации гражданам по вопросам гражданского, уголовного и административного права и при необходимости могли выступать на судебных процессах [1, л. 1–3].

В судебных исках отражен жилищный вопрос, исключительно остро стоявший в городе в период оккупации, поэтому исключительно часто в суд поступали иски

граждан об установлении права собственности на недвижимость. Подобный иск рассматривался на заседании суда 28.11.1941 г. Обратившиеся в суд брат и сестра, вступили в 1937 г. во владение в равных частях домом, оставшимся после смерти матери, платили земельную ренту и налог на недвижимость, но не оформили вступление во владение наследством в судебном порядке. Иск был удовлетворен [2, л. 1, 1 об.]. В декабре 1941 г. мировой суд поступило заявление гражданки, которая просила признать за ней и ее детьми право собственности на половину дома с надворными постройками оценочной стоимостью 6113 руб., которые ранее числились в собственности ее мужа (был арестован НКВД в 1937 г., и судьба его была не известна). Дом формально не имел владельца, но истица вносила за него необходимые платежи. В качестве доказательства были представлены копия свидетельства о браке, копия протокола обыска, произведенного НКВД в 1937 г., платежные документы по налогам на строения и земельной ренте. На заседании 20.12.1941 г. суд постановил, что до рассмотрения вопроса о праве собственности сначала должна быть установлена опека над ней, поскольку имеются малолетние дети бывшего владельца. Следующие заседания 15.01.1942 г. и 5.02.1942 г. закончились безрезультатно из-за не вручения повесток и неявки свидетелей со стороны истицы. В итоге 22.02.1942 г. спорная недвижимость была уничтожена в результате попадания авиабомбы, и суд, на основании заявления истицы на заседании 11.03.1942 г. постановил дело прекратить [3, л. 1–21]. В декабре 1942 г. гражданка обратилась в суд с иском о разделе дома со своим бывшим супругом, который иск признал и на раздел имущества согласился, о чем было вынесено соответствующее судебное решение. Городская управа отменила решение и вернула суда дело, мотивируя тем, что на рассмотрении отсутствовал представитель жилищной конторы, а также не были предоставлены документы, удостоверяющие право собственности ответчика на дом. На три последующих заседания стороны не явились, и исход дела не известен [4, л. 4–6, 12, 16 17, 22].

Если в довоенное время не существовала угроза отчуждения унаследованного имущества, то в условиях дефицита жилья в годы оккупации она была более чем реальна, вынуждая граждан узаконивать факт владения собственностью. В январе 1942 г. в суд поступило заявление гражданина, ходатайствовавшего о признании за права собственности на дом, купленный в 1936 г., документы на который были утрачены во время пожара. Истец ссылался на свидетельские показания трех граждан. Суд утвердил гражданина в праве собственности [5, л. 1, 17, 17 об.]. В декабре 1942 г. в суд обратились супруги, которые в 1940 г. построили дом, но не оформили на него право собственности. На основании показания свидетеля суд признал право собственности [6, л. 15, 15 об.].

Порой граждане требовали признания права собственности на не принадлежавшую им недвижимость. В ходе рассмотрения иска 25.11.1941 г. гражданина относительно права собственности на отцовский дом суд установил, что еще в 1937 г. отец истца продал половину дома, что подтверждают документы городского финансового отдела, следовательно, претензии истца на весь дом необоснованны [2, л. 20, 20 об.]. В апреле 1942 г. в суд поступило заявление гражданина, который сообщал, что в 1931 г. им был куплен дом, который с 1934 г. сдавал в аренду жителю Витебска, еврею по национальности, который был отправлен в гетто (или погиб или эвакуировался), и в настоящее время в доме поселились погорельцы (коллаборационная администрация часто решала жилищную проблему за счет домов евреев – Е.Г.). Заявитель просил признать его право собственности на дом, в подтверждение чего просил вызвать в качестве свидетелей четырех граждан, и предоставил копию нотариального договора о покупке дома в 1931 г. На первом

судебном заседании члены суда отметили факт долговременного проживания в доме другого гражданина и заподозрили, что дом мог быть ему продан, а бывший владелец решил воспользоваться ситуацией и попытаться вернуть себе дом, поэтому дело было отложено, а суд направил запрос нотариусу на предмет выяснения, имеются ли документы о продаже дома. Нотариальная контора сообщила суду, что в ее архиве документов о продаже дома арендатору не имеется, однако выяснилось, что в домовой книге есть запись об указанном истцом арендаторе-еврее как о домовладельце, поэтому на повторном заседании суда 16.06.1942 г. иск отклонило [7, л. 1, 1 об., 4, 17–19, 27–28]. Интересно также решение Витебского мирового суда от 3.09.1942 г. Истец потребовал признать право собственности на занимаемый дом. Ссылаясь на показания двух свидетелей, он утверждал, что дом был куплен им до войны, а документы, подтверждающие право собственности, были уничтожены во время пожара в июле 1941 г. Представитель жилищной конторы городской управы утверждал, что спорный дом принадлежал еврею, у которого истец его арендовал, и по решению суда от 16.02.1942 г. с него взыскана квартплата за ноябрь и декабрь 1941 г. Не обладая правом собственности, истец продал дом другому гражданину, но мировой суд 29.07.1942 г. аннулировал не законную сделку. Истец вновь подал иск о признании права собственности. Суд счел показания свидетелей голословными, иск бездоказательным и не добросовестным. Юридический подотдел городской управы утвердил решение суда [8, л. 16, 17].

В 1943 г. на протяжении нескольких месяцев разбиралась тяжба матери и дочери относительно права владения домом (принадлежал на правах общей собственности). Истица жаловалась на зятя (или сожителя дочери?), который, якобы, выгоняет ее из дому. При рассмотрении иска суд удовлетворил ходатайство о допущении к участию в процессе адвоката на стороне истицы. В этой ситуации суд предписал отделу городского хозяйства произвести осмотр дома для определения возможности его раздела, и проект раздела представить в суд. Отдел городского хозяйства представил в суд план дома, сообщив, что, ввиду малой полезной площади считает раздел дома не целесообразным. По причине неявки сторон результаты тяжбы не известны [9, л. 1, 1 об., 9–16, 18, 20, 23].

Проявлением жилищной проблемы являлись споры об арендной плате и праве аренды жилплощади. В декабре 1941 г. гражданка подала в суд заявление просьбой взыскать в ее пользу 425 руб. долга по квартирной плате, поскольку ее квартирант, проживавший в доме с довоенного времени, начиная с 1.07.1941 г. квартплату вносить отказывался. Суд удовлетворил иск частично, приговорив ответчика к выплате в пользу истицы 189 руб. долга по квартплате, посчитав, что заявленная ей сумма иска противоречит распоряжению городской управы относительно ставок арендной платы [10, л. 1–13]. В апреле 1942 г. гражданин ходатайствовал о выселении квартирантки, которая не платила квартплату с 10.07.1941 г. Уже мае месяце истец ходатайствовал о прекращении дела; очевидно, стороны самостоятельно урегулировали конфликтную ситуацию [11, л. 1, 2, 8, 14].

В ноябре 1941 г. жилищный отдел ходатайствовал перед судом о рассмотрении в ускоренном порядке дела по обвинению гражданки в самовольном вселении в квартиру, которую прежняя нанимательница перед своим выездом за денежное вознаграждение незаконно ей передала [12, л. 9]. Не типичная конфликтная ситуация рассматривалась мировым судом 1.07.1942 г. В суд обратился гражданин, который, совместно с другим витебчанином, взял в аренду у жилищного отдела дом на Сенной площади с обязательством произвести в нем капитальный ремонт стоимостью 3000 руб. В доме проживала сотрудница 4-ой жилищной конторы, которой предлагалась в замен

3-комнатная квартира, однако, ответчица не соглашалась переселяться, пока не будет снят урожай на приусадебном участке. Суд счел иск обоснованным [2, л. 14].

Иск мог касаться недвижимости, поврежденной или уничтоженной пожаром. Очевидно, что владельцы стремились сохранить за собой участок, чтобы впоследствии попытаться восстановить дома. Так, 26.11.1941 г. суд признал право собственности гражданина на остатки постройки двухэтажного дома по Нижненабережной улице, сгоревшего в результате пожара 9–10 июля 1941 г., когда шли бои за Витебск [2, л. 31]. Жилищная проблема стояла настолько остро, что предметом спора могла являться абсолютно любая постройка. В другом случае был отклонен иск двух гражданок о признании права собственности на баню, стоявшую во дворе сгоревшего дома. Поскольку до войны баня принадлежала Витебскому щетинному комбинату, бургомистр в порядке кассационного надзора изменил решение суда от 7.08.1942 г., разрешив истице проживать в бане и далее, считая ее коммунальной собственностью [8, л. 18].

Иски о недвижимости поступали столь часто, что в их рассмотрение оказывались втянутыми различные подразделения Витебской городской управы. Жилищный отдел попросил суд предоставить копии судебных решений относительно исков на жилье и делать так впредь, чтобы жилотдел высылал своего представителя на судебные заседания [8, л. 5]. Копии решения суда передавались жилищному отделу [2, л. 24, 30]. По каждому району в отдельности были составлены списки неотчуждаемого недвижимого имущества, находившегося под опекой граждан, продажа которого была запрещена без разрешения мирового суда. Информация была доведена до жилищного отдела управы, что давало возможность избегать конфликтных ситуаций в будущем [2, л. 2, 2 об., 7; 12, л. 1, 3, 6, 16, 17, 21–25]. Отдел городского хозяйства по запросу суда мог предоставлять план раздела недвижимого имущества [12, л. 4].

Помимо недвижимости предметом споров граждан становилось любое другое имущество. Осенью 1941 г. в суд поступило исковое заявление гражданки, которая утверждала, что обнаружила пропажу из квартиры вещей. Случайно обнаружив украденные туфли в починке у сапожника, истица выяснила имя похитительницы и подала иск на сумму 1320 руб. В результате произведенного полицией обыска украденные предметы были обнаружены у подозреваемой. На судебном заседании 16.12.1941 г. было принято решение прекратить рассмотрение дела по причине криминального характера, и передать его начальнику криминального отдела полиции. Криминальный отдел 13.01.1942 г. сообщил мировому суду, что виновность подозреваемой установлена, и материалы следствия переданы в фельджандармерию, а 16.01.1942 г. заместитель бургомистра сообщил суду, что виновная наказана 14-дневным арестом. В то же время, истица была в праве добиваться возмещения ущерба, поэтому 4.03.1942 г. состоялось еще одно заседание суда, который постановил вернуть ей украденные вещи [13, л. 1 об., 3, 20–22, 42–43]. Осенью 1943 г. в судебном производстве находился спор двух витебчан о признании права собственности на сапоги, которые, якобы, один из них утерял, о чем подал заявление в уголовный розыск [14, л. 1–3].

В апреле 1942 г. суд рассмотрел иск гражданки о признании права собственности на корову, которую незадолго до этого по требованию коменданта жилищного отдела пришлось сдать на бойню, где корова на глазах хозяйки была зарезана. Принадлежность коровы истице была установлена на основании показания свидетелей. Суд сообщил бургомистра об ошибочном изъятии коровы и рекомендовал предоставить ей другую корову, принимая во внимание также тот факт, что муж истицы был репрессирован НКВД [15, л. 1]. В то же время не все иски оканчивались

подобным образом. В документах мирового суда содержатся списки граждан, чьи иски о признании права собственности на коров были отклонены (хотя таких истцов было значительное количество–Е.Г.) [2, л. 13; 15, л. 25; 8, л. 6].

В июле 1943 г. супруга прежнего бургомистра Витебска Брандта подала в мировой суд прошение о признании ее права на часть за ней и ее детьми право собственности на 1/3 урожая ржи, посеянной на арендованном у городской управы наделе земли ее супругом, отцом и братом в равных долях. На земельный надел претендовал чугунолитейный завод, представителя которого истица просила вызвать в суд, и ходатайствовала об освобождении от уплаты судебных пошлин. В суд были представлены: арендный договор между указанными в прошении гражданами и отделом городского хозяйства городской управы, а также аналогичный договор между гражданином и чугунолитейным заводом [16, л. 1, 5, 5 об., 7, 8, 11–14, 18–21].

Предметом судебного разбирательства становились также дела об опеке над имуществом. В декабре 1941 г. в суд поступило заявление гражданина, просившего назначить его опекуном над имуществом племянницы, уехавшей из Витебска до начала оккупации, и судьба которой в настоящее время была не известна. Имущество состояло из двух домов и движимого имущества. В домах вскоре поселились граждане, которые препятствовали заявителю в доступе к имуществу, поэтому он просил суд обязать городскую полицию предоставить копию движимого имущества и назначить его опекуном имущества. Суд затребовал от полиции документы об имуществе, на что полиция сообщила, что какие-либо документы отсутствуют, за исключением акта на изъятие бесхозного велосипеда. Претензии истца 9.01.1942 г. судом были признаны обоснованными, и он был назначен опекуном имущества племянницы, получив соответствующее свидетельство. Тем не менее, 4.02.1942 г. гражданин вновь подал заявление в суд, жалуясь на жилищное управление, которое попыталось взимать квартплату с жильцов домов, как и ранее, на что мировой суд уведомил уполномоченного 8-й районной жилищной конторы, что гражданин, как опекун, до возвращения законной владелицы вправе получать арендную плату и несет все расходы на содержание домов, отчитываясь в этом перед судом [17, л. 1, 4, 6, 8, 8 об., 13–15]. В одном из аналогичных случаев жилищный отдел сообщил мировому суду, что передача обозначенных в исковом заявлении гражданина вещей ему на временное сохранение не целесообразна, поскольку часть этих вещей явно не принадлежала выбывшему родственнику истца (на вещах имелись инвентарные номера театра, больницы и других государственных учреждений) и, очевидно, вещи были награблены, как и другие предметы, которые могли принадлежать покинувшим город беженцам [2, л. 26].

В ходе имущественных споров мировой судья издавал постановление о наложении ареста на спорное имущество и предписывал судебному исполнителю произвести его опись и составить соответствующий акт в двух экземплярах, один из которых передавался в суд, а другой вручался гражданину, в чьем пользовании находилось спорное имущество, который становилось ответственным за его хранение. Отчуждение имущества до вердикта суда запрещалось [1, л. 11, 13, 28, 42].

В суде рассматривались дела об алиментах и семейные конфликты. Обратившаяся 5.12.1941 г. в суд гражданка, требовавшая возобновления выплаты ей алиментов за малолетнюю дочь 1935 г.р. Ответчик по данному иску, на основании решения народного суда, до 1941 г. выплачивал алименты, с началом оккупации перестал платить, украв, по мнению истицы, исполнительный лист из правления колхоза. Председатель общины Васюты Селютской волости Витебского района (бывший колхоза «Победа») содействия гражданке не оказал, после чего она апеллировала к суду, ссылаясь, в подтверждение своей правоты, на свидетельские показания и свидетельство о рождении дочери, в котором ответчик числился отцом

